Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

16 СТУДЗЕНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 8 (26121)

Кошт 490 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

МАЯ СЯМ'Я: АД ДАПАМОГІ ДА ЖЫЛЛЯ

Памеры штомесячных дзіцячых дапамог і аднаразовых дапамог пры нараджэнні, магчымасць атрымання дапамог на дзіця ва ўзросце больш за 3 гады і бясплатнага харчавання на немаўлят, падатковыя вылікі шматдзетным сем'ям і сем'ям з дзецьмі-інвалідамі, працоўныя гарантыі сем'ям, дапамога ў пагашэнні як ільготных, так і нельготных крэдытаў на жыллё, а таксама іншыя пытанні — усё гэта стане тэмай чарговай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяны Васільеўны ШЭМЕТАВЕЦ і галоўнага спецыяліста ўпраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры Марыяны Мікалаеўны ЕЎТУШЭНКАВАЙ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Наша «прамая лінія» адбудзецца з 11 да 12 гадзін 17 студзеня па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары (8 017) 287 17 57.

Савет Бяспекі прыняў канчатковае палітычнае рашэнне аб будаўніцтве ў Беларусі АЭС

Канчатковае палітычнае рашэнне аб будаўніцтве ў Беларусі ўласнай атамнай электрастанцыі было прынята 15 студзеня на пасяджэнні Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, якое праходзіла пад старшынствам кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі.

Прэзідэнт падкрэсліў, што развіццё атамнай энергетыкі нараўне з мадэрнізацыяй дзеючай энергасістэмы, выкарыстаннем аднаўляльных крыніц энергіі, скарачэннем энергаёмістасці ВУП і дыверсіфікацыяй крыніц паступлення вуглевадароднай сыравіны з'яўляецца важнейшым фактарам забеспячэння энергетычнай бяспекі краіны, рэальнай магчымасцю процістаяць дыктату манапалістаў і мінімізаваць урон пры ўзнікненні крытычнай сітуацыі.

«Будаўніцтва АЭС — гэта рэальная перспектыва, стратэгічная задача, і адмаўляцца ад яе Беларусь не мае намеру», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Гэта рашэнне мае гістарычны характар, паколькі ад яго залежыць эканамічная, энергетычная і палітычная незалежнасць будучых пакаленняў беларусаў. «Сёння мы закладваем аснову функцыянавання беларускай дзяржавы ва ўмовах, калі на Зямлі абвастраецца глабальная праблема вычарпання запасаў вуглевадароднай сыравіны. Я лічу, будучыя пакаленні ацэняць наша рашэнне», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяпер у рэспубліцы рэалізуецца комплекс падрыхтоўчых работ па будаўніцтву АЭС. «Выкананыя даследаванні пацвердзілі, па-першае, эканамічную мэтазгоднасць будаўніцтва АЭС, па-другое, наяўнасць у рэспубліцы падыходзячых тэрыторый для размяшчэння атамнай электрастанцыі, патрэбе, адсутнасць тэхнічных перашкод для ўключэння станцыі ў энергасістэму рэспублікі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, падрыхтоўка да будаўніцтва АЭС у Беларусі пакуль што ідзе марудна. «Да гэтага часу няма пэўнасці па многіх важнейшых аспектах: месцы будаўніцтва, праекту, генеральнаму падрадчыку. Не праглядаецца дакладнасць, паслядоўнасць, зладжанасць у рабоце дзяржаўных органаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Разам з тым, паводле ацэнкі Аляксандра Лукашэнкі, ёсць і пэўныя пазітыўныя напрацоўкі. У прыватнасці, беларускія спецыялісты азнаёміліся з вопытам будаўніцтва такіх аб'ектаў у свеце, устанавілі кантакты з МАГАТЭ і асноўнымі сусветнымі кампаніямі, якія займаюцца ўзвядзеннем атамных станцый. Сумесна з МАГАТЭ падрыхтаваны праект рамачнай праграмы тэхнічнага супрацоўніцтва. У мэтах фарміравання інфраструктуры для развіцця ядзернай энергетыкі прыняты Указ «Аб некаторых мерах па будаўніцтву атамнай электрастанцыі». Фарміруецца Дэпартамент па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы як асноўны наглядны орган у сферы атамнай энергетыкі. Створана Дырэкцыя будаўніцтва АЭС, вызначаны адказныя выканаўцы за праектаванне і навуковае суправаджэнне падрыхтоўкі і будаўніцтва станцыі.

«Наша задача — выйсці на адзіна правільны варыянт, пры якім Беларусі ўдасца звесці да мінімуму звязаныя з гэтым рызыкі, каб у поўнай меры скарыстацца ўсімі перавагамі ўласнай АЭС», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Сёння ўвесь свет арыентаваны на будаўніцтва АЭС у сувязі з павелічэннем цэнаў на вуглевадародную сыравіну. У краінах, якія мяжуюць з Беларуссю, плануецца ў бліжэйшыя гады пабудаваць больш за дзесятак атамных рэактараў. Выгады ад валодання ўласнай атамнай энергетыкай відавочныя. Аднак «некаторыя гарачыя галовы з ліку апанентаў улады настойліва спрабуюць арганізаваць нейкую так званую антыядзерную кампанію сярод насельніцтва», адзначыў Прэзідэнт. «Ствараецца ўражанне, што некаторыя нашы апазіцыянеры і вучоныя жывуць у вакууме, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У нас, як заўсёды, «беларускасць» бяжыць папярадзе розуму. Мы пачынаем, паглядаючы з-за вугла, разважаць аб неабходнасці будаўніцтва АЭС. Увесь свет вызначыўся, а мы разважаем. А потым будзем узмоцнена даганяць. Але тады гэта будзе каштаваць у два разы даражэй».

На пасяджэнні першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка праінфармаваў аб тым, што спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук і Мінэнерга прааналізаваны сусветны вопыт развіцця атамнай энергетыкі і асноўныя тыпы ядзерных рэактараў, схемы выбару праектаў АЭС і тэрміны іх рэалізацыі ў краінах, якія развіваюць атамную энергетыку, тэхнічныя магчымасці вядучых кампаній і прапануемыя імі на сусветным рынку сучасныя праекты АЭС.

Беларускія спецыялісты выказваюцца за будаўніцтва больш дасканалых рэактараў трэцяга пакалення, якія маюць павышаную бяспеку. Па праектах рэактараў водаводзянога тыпу абноўленага пакалення 3 будуюцца АЭС у Балгарыі, Фінляндыі, Францыі, Кітаі, Індыі, Іране, Японіі.

У свеце асноўнымі кампаніямі-пастаўшчыкамі абсталявання АЭС з рэактарамі тыпу ВВЭР трэцяга пакалення з'яўляюцца амерыкана-англійска-японская кампанія Westinghouse-Toshiba, франка-германская група AREVA, расійскае ЗАТ «Атамбудэкспарт». Каму з іх будзе аддадзена перавага — пытанне, на якое яшчэ трэба будзе даць адказ.

Прадугледжваецца, што месца размяшчэння пляцоўкі для будаўніцтва АЭС будзе выбрана вясной 2008 года. Гэта будзе тэрыторыя плошчай каля 100 кв.км. Затым у межах гэтай тэрыторыі будзе вызначана пляцоўка (10—12 кв.км), дзе будзе знаходзіцца станцыя. Канкрэтнае месца размяшчэння самой АЭС будзе вызначана да канца 2008 года. Пакуль жа разглядаецца некалькі патэнцыяльных пляцовак для будаўніцтва АЭС, у тым ліку Кукшынаўская і Краснапалянская.

На думку экспертаў, уключэнне ў энергабаланс ядзернага паліва і будаўніцтва АЭС істотна паўплываюць на ўмацаванне энергетычнай бяспекі і энергетычнай незалежнасці Беларусі за кошт дыверсіфікацыі відаў паліва, дадуць магчымасць павысіць эканамічную эфектыўнасць вытворчасці электраэнергіі. Эканамічная эфектыўнасць уводу АЭС тлумачыцца тым, што кошт арганічнага паліва амаль у 4 разы вышэйшы за кошт ядзернага паліва.

Як лічаць спецыялісты, аптымальным варыянтам лічыцца адначасовае будаўніцтва некалькіх энергаблокаў АЭС з паэтапным пераходам з аднаго блока на другі. Міністэрствам энергетыкі Беларусі пры кансультацыйнай падтрымцы замежных спецыялістаў распрацаваны ўзбуйнены графік работ па будаўніцтву АЭС, якім прадугледжана адначасовае ўзвядзенне двух блокаў з уводам першага блока ў 2018 годзе са змяшчэннем пуску другога блока на 1—2 гады, што дасць магчымасць вывесці станцыю на поўную магутнасць да 2020 года. Такім чынам, доля АЭС у вытворчасці электраэнергіі да 2020 года можа скласці каля 30 працэнтаў.

Асноўнай сыравінай для вытворчасці паліва для ядзернай энергетыкі з'яўляецца ўранавая руда. Агульны аб'ём разведаных запасаў урану ў свеце вельмі значны і забяспечвае перспектыўныя патрэбнасці атамнай энергетыкі як мінімум на 85 гадоў наперад. Асноўнымі вытворцамі ўрану з'яўляюцца Канада, Аўстралія, Казахстан, Расія, Нігерыя.

Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Міхаіл Мясніковіч прывёў думку экспертаў Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) аб тым, што з улікам росту цэнаў на нафту і газ атамныя электрастанцыі з'яўляюцца для еўрапейскіх краін аптымальным варыянтам.

Міністр па надзвычайных сітуацыях Энвер Барыеў адзначыў, што прынятыя ў Беларусі меры даюць магчымасць забяспечыць на ўсіх узроўнях належную бяспеку будаўніцтва і эксплуатацыі АЭС.

Міністр фінансаў Мікалай Корбут паведаміў, што прыблізны кошт праекта можа скласці каля $4 млрд. Крыніцамі фінансавання рэалізацыі праекта з'яўляюцца бюджэтныя сродкі, знешнія пазыкі, фонд нацыянальнага развіцця і інавацыйны фонд Міністэрства энергетыкі.

Міністр замежных спраў Сяргей Мартынаў праінфармаваў удзельнікаў пасяджэння аб тым, што «ніякіх знешніх перашкод для стварэння беларускай АЭС няма». Ён таксама расказаў аб супрацоўніцтве Беларусі і МАГАТЭ ў пытанні будаўніцтва станцыі.

Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Віктар Шэйман выказаў крытычныя заўвагі адносна недастаткова высокіх тэмпаў вырашэння пытанняў, звязаных з падрыхтоўкай будаўніцтва АЭС. «Пачаць будаўніцтва станцыі неабходна хутчэй — гэта дыктуюць час і нашы нацыянальныя інтарэсы», — падкрэсліў ён.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч закрануў пытанні развіцця інфраструктуры ў раёне размяшчэння будучай беларускай АЭС. На яго думку, населены пункт, дзе будуць жыць будаўнікі, спецыялісты, абслуговы персанал, павінен быць ультрасучасным і ўяўляць сабой «горад не XXI, а ўжо XXII стагоддзя».

Вышэйшыя службовыя асобы і іншыя ўдзельнікі пасяджэння, у тым ліку якія адказваюць за пытанні бяспекі, адзначна выказаліся за неабходнасць развіцця ў Беларусі ўласнай атамнай энергетыкі. Пры гэтым было адзначана, што пасля паспяховага завяршэння будаўніцтва першых двух энергаблокаў бясспрэчна паўстане задача ўзвядзення трэцяга і чацвёртага.

Па выніках абмеркавання Савет Бяспекі прыняў канчатковае палітычнае рашэнне аб будаўніцтве ў рэспубліцы атамнай электрастанцыі. Праект адпаведнай пастановы Савета Бяспекі будзе ў бліжэйшы час дапрацаваны, узгоднены з зацікаўленымі структурамі і да канца студзеня ўнесены Прэзідэнту на падпісанне, што стане важным юрыдычным крокам, стымулюючым далейшы рух наперад у рэалізацыі гэтага праекта.

«Гэта энергетычнае прадпрыемства мае для нас вялікае значэнне, усе звязаныя з ім пытанні важныя, паколькі яны закранаюць бяспеку насельніцтва, прычым не толькі нашай краіны. Але такіх энергетычных прадпрыемстваў пабудавана на планеце ўжо некалькі соцень, таму ў будаўніцтве беларускай АЭС няма нічога надзвычайнага — у свеце вопыт стварэння такіх аб'ектаў ужо ёсць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка зноў звярнуў увагу на неабходнасць паскорыць вырашэнне ўсіх пытанняў, звязаных з будаўніцтвам АЭС. «Ураду трэба вельмі сур'ёзна пачынаць працаваць у гэтым пытанні. Галоўнае ў тым, што зацягванне тэрмінаў азначае павелічэнне кошту праекта. Трэба пераходзіць ад разваг да практычнай работы і арганізаваць усё так, каб пачаць будаўніцтва АЭС ужо ў гэтым годзе. Тэрміны будаўніцтва павінны быць максімальна сцісłыя, але рэальна выканальныя», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

За якасцю работ па ўзвядзенні атамнай станцыі будзе ўстаноўлены вельмі жорсткі кантроль: будаўніцтва павінна весціся на самым высокім узроўні.

Ураду належыць неадкладна пачаць распрацоўку комплекснага плана асноўных мерапрыемстваў па будаўніцтве АЭС.

«Інтарэс да беларускай АЭС праяўляюць многія. Прапаноў па фінансаванні было дастаткова — ад краін Блізкага Усходу да еўрапейскіх. Урад і Нацыянальны банк выберуць лепшы варыянт, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — У гэтым годзе таксама трэба пачынаць падрыхтоўку нашых кадраў. Неабходна, каб на кожным этапе будаўніцтва былі нашы людзі і набіраліся вопыту. Пасля завяршэння аб'екта мы павінны ўмець усё рабіць самі, каб у далейшым беларускія спецыялісты змаглі прапаноўваць свае паслугі па падрыхтоўцы кадраў для іншых краін».

Кіраўнік дзяржавы таксама заўважыў, што ў грамадстве ўжо ёсць усведамленне неабходнасці будаўніцтва ўласнай АЭС: «Народ разумее, што альтэрнатывы будаўніцтву атамнай станцыі ў Беларусі сёння няма».

Рашэнне па падрадчыку на будаўніцтва АЭС будзе прымацца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

На заканчэнне Прэзідэнт заклікаў урад яшчэ раз звярнуць увагу на дзейнасць прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і знайсці магчымасці для зніжэння энергазатрат у іх дзейнасці, так, як таго патрабуе Дырэктыва № 3. Рэзервы па скарачэнні энергаёмістасці нашай эканомікі яшчэ вялікія, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Кіраўнік Быхаўскай школы мастацтваў Вольга ГЛУШЧАНКА і адна з лепшых навучэнак па класе фартэпіяна Яўгенія МУРАШЧАНКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Раяль цалуе тонкая рука...»

Музычны інструмент сусветнавядомай нямецкай фірмы «Цымерман» — мара любога піяніста, любой музычнай школы і тым больш канцэртнага калектыву. Белы раяль гэтай фірмы назаўсёды «прапісаўся» цяпер і ў дзіцячай школе мастацтваў горада Быхава, дырэктарам і педагогам па класе фартэпіяна якой з'яўляецца Вольга Глушчанка. «Гэта вельмі дарагі для нас падарунак, — кажа Вольга Мікалаеўна, — бо ён — ад Прэзідэнта Беларусі». Па выніках працы, за творчыя дасягненні і стварэнне выдатных умоў для развіцця юных дараванняў Вользе Глушчанка прысвоена ганаровае званне «Чалавек года-2007» Магілёўскай вобласці.

Ва ўрадзе

ПРЫДАРОЖНЫ СЭРВІС ЧАКАЮЦЬ ЗМЕНЫ

Нягледзячы на тое, што па якасці беларускія дарогі значна лепшыя, чым у асобных суседніх дзяржавах, у рэспубліцы прымаюцца захады для таго, каб узровень дарог станавіўся яшчэ вышэйшым. Прычым у краіне абуладкоўваюцца і развіваюцца не толькі магістральныя транзітныя трасы, але і дарогі ўнутрырэспубліканскага значэння, мясцовыя дарогі. Учора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, абмяркоўваўся ход выканання ў 2006—2007 гадах праграмы «Дарогі Беларусі» на 2006—2015 гады і развіццё прыдарожнага сэрвісу.

Як далажыў міністр транспарту і камунікацый Уладзімір Сасноўскі, за два мінулыя гады прынятыя міністэрствам і аблвыканкамамі меры дазволілі забяспечыць на належным узроўні ўтрыманне аўтамабільных дарог агульнага карыстання на ўсёй працягласці — 82,9 тысячы кіламетраў. Пазалетась на рэалізацыю праграмы «Дарогі Беларусі» было выдзелена 1,5 трыльёна рублёў, або 90 працэнтаў ад патрэб, у мінулым — 1,6 трыльёна, ці 70 працэнтаў, а сёлета мяркуецца выдзеліць 1,8 трыльёна — 64 працэнты ад патрэб праграмы. На гэтыя грошы неабходна будзе забяспечыць утрыманне дарог на ўсёй працягласці, акрамя таго, выканаць бягучы рамонт больш за 3,2 тысячы кіламетраў дарог агульнага карыстання, 1,4 тысячы кіламетраў рэспубліканскіх і 1,8 тысячы кіламетраў мясцовых дарог.

Разам з тым прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі ў ходзе пасяджэння выказаў незадаволенасць тым, як у краіне вядзецца рэалізацыя праграмы. У прыватнасці, у кіраўніка ўрада шмат прэтэнзій да развіцця прыдарожнага сэрвісу. «Мінтранс замест канкрэтнай працы па развіцці аб'ектаў заняў назіральную пазіцыю і не спрыяе развіццю бізнэсу ў сферы паслуг прыдарожнага сэрвісу», — працытаваў прэм'ер яшчэ леташнюю ацэнку, якую даў тады Камітэт дзяржкантролю. Звяртаючыся да міністра, Сяргей Сідорскі зазначыў: «Ваша задача — стварыць такое асяроддзе, каб у гэту сферу бізнэсу актыўна ішлі інвестары, каб у міністэрстве стаяла чарга ахвотнікаў са сваімі прапановамі — знешнія інвестары, унутраныя — усе, хто хоча тут працаваць. У сваю чаргу Уладзімір Сасноўскі прапанаваў распаўсюдзіць ільготы, прадугледжаныя Дэкрэтам Прэзідэнта ад 20 снежня 2007 года № 9 «Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў», на ўладальнікаў аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, якія размешчаны па-за населеным пунктам. Кіраўнік урада зазначыў, што ён гатовы разгледзець гэту прапанову, аднак канкрэтная гутарка па дадзеным пытанні можа весціся толькі пры наяўнасці адпаведных нарматыўных дакументаў, якіх, на жаль, міністэрствам пакуль не прапанавана. А таму Сяргей Сідорскі запатрабаваў ад кіраўніка міністэрства на працягу двух дзён унесці прапановы, якія дазволяць палепшыць сітуацыю з рэалізацыяй праграмы «Дарогі Беларусі».

Дарэчы, падчас абмеркавання праграмы Уладзімір Сасноўскі агучыў ініцыятыву Мінтранса, згодна з якой у Беларусі прапануецца распаўсюдзіць вопыт некаторых еўрапейскіх краін, дзе ў кошт бензіну або дызельнага паліва ўключаецца падатак за карыстанне дарогамі: з 1 літра там ідзе ад 25 да 60 цэнтаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

ЗАГУЛЯЎ ГАСПАДАР, ЗАГУЛЯЎ...

З'явіўся ў Баранавічах гэты сімпатычны бронзавы конік і людзі з усмешкай пазіраюць на яго. Стаіць ён перад гасцініцай у цэнтры горада і глядзіць на дзверы, за якімі бар, казіно, кавярня. Відаць, загуляў гаспадар, загуляў.

Вельмі прыемна, што такія скульптуры пачалі ставіць і на перыферыі. Мы паступова пераходзім ад бяздушных манументаў да вось такіх, няхай сабе і вельмі натуралістычных, але кранаючых за жывое твораў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АЎТАМАТЫЗАВАНАЯ СІСТЭМА ПРОДАЖУ БІЛЕТАЎ — НА 20 ВАКЗАЛАХ

У Беларусі ў 2008 годзе плануецца ўкараніць аўтаматызаваную сістэму цэнтралізаванага продажу білетаў на 20 аўтавакзалах і аўтастанцыях.

Як паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе Міністэрства транспарту і камунікацый, у рамках укаранення аўтаматызаванай сістэмы цэнтралізаванага продажу білетаў на праезд у пасажырскім транспарце рэалізавана магчымасць продажу білетаў і выдачы справаздач касірам як за наяўны разлік, так і па банкаўскай пластыкавай картцы. Таксама існуе магчымасць продажу білетаў без удзелу касіра з выкарыстаннем інфармацыйна-плацежных тэрміналаў, якія будуць устанаўлівацца на аўтавакзалах, у банкаўскіх установах, паштовых аддзяленнях.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

РЭВІЗІЯ ВЕДАЎ. СПРОБА НУМАР ДВА...

20 студзеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце стартуе другі раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Патэнцыяльныя абітурыенты змогуць праверыць свае веды па 11 прадметах. Тэсціраванне будзе праводзіцца па нядзелях, каб не перашкаджаць навучальнаму працэсу ў школах. А праз два тыдні (але ўжо за дадатковую плату) можна будзе атрымаць кансультацыю з поўным разборам варыянтаў тэста і аналізам дапушчаных памылак.

20 студзеня ўсе ахвотнікі змогуць прайсці тэсціраванне па дзвюх дысцыплінах: «Сусветная гісторыя навейшага часу» і «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». 27 студзеня — па замежных мовах і геаграфіі. 3 лютага — па беларускай і рускай мовах. На 10 лютага запланавана правядзенне рэпетыцыйнага тэсціравання па матэматыцы і біялогіі. А завершыцца тэсціраванне 17 лютага — у гэты дзень можна будзе напісаць тэставыя работы па гісторыі Беларусі, фізіцы і хіміі.

Рэпетыцыйнае тэсціраванне арганізуецца інстытутам неперарыўнай адукацыі БДУ сумесна з Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Рэгістрацыя ўдзельнікаў ажыццяўляецца ў Цэнтры тэсціравання БДУ па адрасе: вул. Кастрычніцкая, 4, пакой 206. Кошт удзелу ў тэсціраванні застаўся ранейшы і складае 16 100 рублёў за кожную дысцыпліну.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ІНСПЕКТАР «ПАГАРЭЎ» НА ДЗВЯРАХ

Праверка правілаў выканання тэхнікі бяспекі на працягу многіх гадоў была для вядучага дзяржаўнага інспектара Пінскай міжраённай інспекцыі працы крыніцаў непрацоўных даходаў .

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Генеральнай пракуратуры, гэтая службовая асоба прызнана вінаватай у хабарніцтве. У прыватнасці, як высветліла следства, на працягу амаль 7 гадоў інспектар неаднаразова атрымліваў ад прадпрымальнікаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў хабар у іншаземнай валюце, а таксама ў выглядзе дызпаліва, ацяпляльнага абсталявання і іншых рэчаў. А «пагарэў» на дробязі. Яго затрымалі ў момант атрымання ў якасці хабару трох міжпакаёвых дзвярэй агульным коштам 715 тысяч рублёў. Суд прыгаварыў хабарніка да шасці з паловай гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

РАЗБОЙНІКІ З ПАЛЯЎНІЧЫМ РУЖЖОМ

Рэдкае па сваёй дзёрзкасці злачынства, паведамляюць у аддзеле інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, было ўчынена вечарам у сталіцы.

Каля шасці гадзін вечара двое невядомых крымінальнікаў, узброеныя паляўнічым ружжом, побач з жылым домам па Партызанскім праспекце напалі на 47-гадовага беспрацоўнага. Прастрэліўшы сваёй ахвяры левую галёнку, бандыты зрабілі яшчэ два стрэлы па колах яго аўтамабіля «Форд-Транзіт». Што датычыцца здабычы адмарожкаў, то яна была вельмі сціплай: рабаўнікі забралі ў пацярпелага скураную куртку, пашпарт і ключы ад кватэры. Пацярпелы змешчаны ў бальніцу, а злачынцы зараз адшукваюцца праваахоўнікамі.

Ігар ГРЫШЫН.

ДРЫВАСЕКАЎ «ЗАСЯКУЦЬ» З ВЕРТАЛЁТАЎ

Беларускія памежнікі ўзмацняюць кантроль на мяжы з Украінай.

Паводле слоў начальніка прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Аляксандра Цішчанкі, неабходнасць больш пільнай аховы рубяжоў нашай Радзімы абумоўлена актывізацыяй кантрабандыстаў як з аднаго, так і з другога боку мяжы. У прыватнасці, цяпер распачынаюць сезон незаконнай нарыхтоўкі драўніны ў беларускіх лясах украінскія дрывасекі. Да таго ж, паводле аператыўных звестак, у палескіх балотах паблізу мяжы размешчаны нелегальныя «склады» з журавінамі. На ўкраінскі ўчастак будуць перакінуты некалькі дадатковых верталётаў.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ПРАВЕРКІ НА МАРШРУТАХ

Маршрутныя таксі ў бліжэйшы час стануць у цэнтры павышанай увагі супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі.

Хоць, як падкрэслілі ва ўпраўленні ДАІ МУС краіны, «маршруткі» і раней не выпадалі з-пад кантролю Дзяржаўтаінспекцыі. За кожным такім прадпрыемствам замацаваны персанальны «даішнік», які праводзіць прафілактычную працу сярод кіроўцаў. Кожны тыдзень ДАІ арганізуе рэйды па кантролі за рухам і тэхнічным станам аўтобусаў, якія ажыццяўляюць перавозкі пасажыраў. У мінулым годзе падраздзяленні Дзяржаўтаінспекцыі забаранілі эксплуатацыю 1706 няспраўных «маршрутак». Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты 5416 кіроўцаў і 987 службовых асобаў. Па прадстаўленні ДАІ Міністэрства транспарту і камунікацый анулявала адмысловыя ліцэнзіі ў 16 перавозчыкаў.

Тым не менш, ідэальны парадак яшчэ не наведзены. Летась па віне кіроўцаў «маршрутак» адбылося 34 аварыі, у выніку якіх 3 чалавекі загінулі і 37 — атрымалі раненні. Менавіта таму з 21 па 31 студзеня Дзяржаўтаінспекцыя правядзе шэраг дадатковых мерапрыемстваў па забеспячэнні бяспекі пры перавозцы пасажыраў у маршрутных таксі.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

У КАЛОДЗЕЖЫ ПАТАНУЎ 16-ГАДОВЫ ПАДЛЕТАК

У Ляхавіцкім раёне Брэсцкай вобласці ў калодзежы патануў 16-гадовы падлетак.

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў РАУС Ляхавіцкага раёна, трагедыя адбылася ў вёсцы Зарытава ў ноч з 14 на 15 студзеня. Паводле інфармацыі, школьнік у тую ноч займаўся калядаваннем. Яго крыкі пачулі аднавяскоўцы, падлетку спрабавалі дапамагчы, аднак зрабіць нічога не змаглі. Цела з калодзежа паднялі выратавальнікі, якія прыбылі на месца здарэння. Паводле папярэдніх даных, у калодзеж школьнік зваліўся па неасцярожнасці.

У МАГІЛЁВЕ ЗНОЎ АБСТРАЛЯЛІ ТРАЛЕЙБУС

Як паведамляе TUT.BY, у Магілёве хуліганы абстралялі тралейбус з пнеўматычнага пісталета.

Двое нецвярозых 23-гадовых хлопцаў «весяліліся» пасля рыбалкі. Яны тройчы стрэлілі ў вокны тралейбуса, на шчасце, ніхто не пацярпеў, бо пасажыраў у салоне не было. Па факце хуліганства заведзена крымінальная справа. Хлопцам пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі. Дарэчы, пра падобны выпадак — стральбу з пнеўматычнай вінтоўкі ў Магілёве — «Звязда» пісала і ў пазамінулым годзе. Тады таксама абышлося без ахвяраў.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08008>

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.01.2008 г. (для б/н разлікаў)	
1 долар ЗША	2 150,00
1 еўра	3 191,14
1 латвійскі лат	4 568,15
1 літоўскі літ	923,70
1 чэшская крона	123,13
1 польскі злоты	892,49
1 расійскі рубель	88,53
1 украінская грыўня	425,46

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў	
Цэнтрабанк РФ	
USD	24,2858
10 UAH	47,6659
1000 BYR	11,2597
EUR	36,11130
Курс у гандлёвых кампаніях (на 15.01.2008 г.)	
USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ОАО «Заславльстройиндустрия» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже незавершенного законсервированного капитального строения — здание комплекса бытовых услуг, об. пл. 1 638,8 кв.м, расположенное: Минский р-н, г. Заславль, ул. Советская, д. 100а. Площадь зем. участка 0,1607 га. Начальная цена — 2 664 000 000 бел. рублей с НДС, возможна рассрочка платежа. Задаток в сумме — 50 000 000 белорусских рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней со дня проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 19.02.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 18.02.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ МОЖА ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ АДНОСІНЫ З УКРАІНАЙ, КАЛІ ТАЯ ЎСТУПІЦЬ У НАТА

Расія «будзе вымушана перагледзець» адносіны з Кіевам, калі Украіна ўступіць у НАТА, заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол РФ ва Украіне Віктар Чарнамырдзін у інтэрв'ю часопісу «Украіна».

Паводле слоў Чарнамырдзіна, «куды Украіна хоча ўступіць, з кім хоча сябраваць, каго хоча любіць — гэта яе ўнутраная справа». «Калі ласка, уступайце, калі лічыце, што так трэба, мы проста тлумачым: уступаеце ў НАТА — мы будзем вымушаны перагледзець нашы адносіны», — заявіў пасол. Маскве давядзецца пайсці на надзвычайныя крокі, «паколькі Украіна — найбольшы наш сусед». На пытанне, у чым можа выяўляцца такі перагляд адносінаў, Чарнамырдзін заявіў: «Ва ўсім! НАТА — гэта ваенны блок. Я ва Украіне чую размовы: «НАТА — гэта клуб». Цікавы клуб... З ядзерным узбраеннем».

У СУТЫКНЕННІ З ІЗРАІЛЬЦЯНАМІ ЗАГІНУЎ СЫН ЛІДАРА ХАМАС

Сярод палесцінцаў, забітых 14 студзеня падчас аперацыі ізраільскіх узброеных сілаў у сектары Газа, быў сын лідара арганізацыі ХАМАС Махмуда Захара.

24-гадовы Хусам — другі сын адзінага заснавальніка групоўкі ХАМАС, хто застаўся жывы, забіты ізраільцянамі. Усяго 14 студзеня загінула 17 палесцінцаў. Як паведамілі журналістам медыкі, сярод іх ёсць і мірныя жыхары, у тым ліку, 65-гадовы мужчына. Сярод 45 параненых апынуўся васьмігадовы хлопчык.

НА ФЕСТЫВАЛІ ВІНА ВА УКРАІНЕ ГАНДЛЯВАЛІ «СЛЯЗЬМІ ЯНУКОВІЧА» І «ЮЛЬЧЫНАЙ РАДАСЦЮ»

На фестывалі «Чырвонае віно» ў горадзе Мукачэва Закарпацкай вобласці Украіны прададзена 400 літраў віна пад назвамі «Цырокая каалі цыя», «Юльчына радасць» і «Шуфрыч у кубку».

Акрамя віна, бойка вёўся гандаль самагонкай «Слёзы Януковіча». Усе напоі з палітычнымі назвамі прадаваліся па цане 4,5 грыўны (менш за долар) за 200 грамаў. Цікава, што XIII абласны фестываль-конкурс «Чырвонае віно-2008» наведалі, у прыватнасці, прэзідэнт Украіны Віктар Ющчанка і яго венгерскі калега Ласла Шаём.

АДКРЫЎШЫ АМЕРЫКУ, КАЛУМБ ЗАВЁЗ У ЕЎРОПУ СІФІЛІС

Згодна з высновамі найноўшага даследавання, сіфіліс, які перадаецца палавым шляхам, развіўся ў абедзвюх Амерыках, а ў Еўропу яго прывезлі маракі з экспедыцыі Хрыстафора Калумба. Інфармацыя атрымана дзякуючы параўнанню ДНК 26 штамаў узбуджальніка сіфілісу і падобных захворванняў.

ЦІМУР І ЯГО КАМАНДА

Віцебскай вобласці спаўняецца 70 гадоў. У Віцебску з'явіліся аднайменная вуліца і сквер. Падзея знакавая.

Калі ў родным краі папросіш простых людзей адразу назваць прозвішча сваіх землякоў — сучаснікаў, якімі рэгіён (і не толькі) можа ганарыцца, такіх, што «на слыху», безумоўна, мо, адразу прыклады і не прывядуць. Цікавых, працавітых людзей у Віцебскай вобласці, якія маглі б нават стаць прататыпамі герояў кінафільмаў, шмат. І, упэўнены, адзін з іх — Дэміко Шатаевіч Надзірашвілі — кіраўнік ЗАТ «Альгоўскае», што ўваходзіць у спіс 60 самых моцных беларускіх сельскагаспадарчых арганізацый. Акрамя ўсяго іншага, «Альгоўскае» забяспечвае абласны цэнтр агароднінай. У фірмовых магазінах у Віцебску чарга за «альгоўскім» мясам.

— Так ужо склалася гістарычна, што былы калгас «Чырвоная Армія» быў вельмі добрай гаспадаркай пачынаючы яшчэ з 1930-х гадоў, з часу яго стварэння, — расказвае кіраўнік. — Асобны росквіт быў, калі яго ўзначальваў Міхаіл Ісакавіч Кац — з 1958 па 1987 год. За добрасумленную працу яму прысвоілі высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Дарэчы, летась у аграгарадку Альгова — цэнтры гаспадаркі — адкрылі памятны знак, прысвечаны легендарнаму старшыні Кацу. А Дэміко Шатаевіч у гаспадарцы з 1973-га. Працаваў ветэрынарным урачом, начальнікам жывёлагадоўчага цэха. Дырэктарам выбралі 14 гадоў таму. Афіцыёзу ў адносінах не любіць. Калі ў свой час пазнаёміліся, прасіў называць проста Цімур: «Ну, калі ўжо жадаеце, Цімур Шатаевіч».



Фота БЕЛТА.

Галоўнае для яго — праца, таму звычайна не афішуе факты сваёй біяграфіі: «Напішыце лепш пра нашых працавітых людзей! Летась на «Дажынкі» мы адразу адправілі некалькі нашых прадстаўнікоў. Упершыню пераадолелі 10-тысячны рубеж у намалоце збожжа. Амаль усе камбайнеры — «тысячнікі».

І колькі разоў Цімур і яго каманда былі прыкладам таго, што толькі ад прафесіяналізму залежыць поспех у працы на зямлі. Памятаецца, чарговы разгул стыхіі на Віцебшчыне змяніў планы земляробаў. І, каб даведацца пра вопыт «барацьбы за ўраджай» у такіх нечаканых умовах, мы з калегам сустрэліся з Дэміко Шатаевічам. Ён спакойна расказаў пра тое, што робіцца ў таварыстве ў гэтыя няпростыя дні: «Па-гаспадарску трэба справы весці і тады нават стыхія ажыццяўленню тваіх планаў не перашкодзіць».

На сёння ў калектыве каля 500 чалавек. Штат папоўніўся дзякуючы далучэнню дзвюх слабых гаспадарак. Падначаленыя канстатуюць, што дырэктар — чалавек справядлівы, але ж з гультаямі ў яго размова нядоўгая: «Хто хоча, можа знайсці сабе годнае месца ў калектыве». Дарэчы, ужо даўно тут паводле конкурсу адбіраюць спецыялістаў, якіх прыцягвае высокая зарплата і перспектывы службовай кар'еры.

І дзіўна, што пры гэтым нават «хімікам» у працаўладкаванні не адмаўлялі. Адзін міліцэйскі начальнік адзначыў: «Калі мы звярталіся да Цімура Надзірашвілі з просьбай працаўладкаваць тых, хто адбывае пакаранне ў калоніі адкрытага тыпу, не адмаўляў ніколі. І тэхніку даверыць, і заробак добры пры сумленнай рабоце гарантаваны. Другі б адмовіўся, бо, зразумела, рызыка з такімі работнікамі ёсць...»

А яшчэ Цімур Шатаевіч не адмаўляе ў падтрымцы цікавых праектаў. У прыватнасці, з'яўляецца адным з ганаровых мецэнатаў мастацка-эстэтычнага салона, што дзейнічае пры Віцебскай абласной бібліятэцы. Салон аб'ядноўвае інтэлігенцыю: адчыняюцца выставы, арганізуюцца творчыя сустрэчы, у тым ліку і з майстрамі мастацтваў іншых рэгіёнаў, нават з-за мяжы.

Праз год альгоўцы адсвяткуюць 80-гадовы юбілей гаспадаркі. Так што, выходзіць, яна старэйшая за вобласць. Папаўняюцца экспанаты музея працоўнай славы, якую цяпер робяць Цімур Надзірашвілі і яго каманда.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

РЭГІСТРАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ — БЕЗ УЛІКУ НОРМЫ

Аб гэтым паведаміў **начальнік управління па грамадзянству і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама Мікалай ШЭЎЧЫК**, каментуючы палажэнні Указа № 413 «Аб удасканаленні сістэмы ўліку грамадзян па месцы жыхарства і месцы знаходжання».

«Калі раней, да ўступлення ў сілу ўказа № 413, паўналетнія дзеці хацелі прапісацца ў бацькоў, ім для гэтага патрабаваліся свабодныя квадратныя метры. З 1 студзеня 2008 года дзеці змогуць зарэгістравацца па месцы жыхарства бацькоў без уліку нормы агульнай плошчы», — растлумачыў субяседнік.

Ён нагадаў, што для пастаяннай рэгістрацыі ў Мінску, згодна з указам, неабходна 20 кв.м агульнай плошчы (у рэгіёнах — 15 кв.м).

Мікалай Шэўчык адзначыў, што для сталіцы спіс тых, хто мае права зарэгістравацца па месцы жыхарства ў блізкіх сваякоў без уліку нормы агульнай плошчы, адрозніваецца ад аналагічнага спіса ў рэгіёнах. Так, калі ў абласных цэнтрах без уліку нормы агульнай плошчы можа зарэгістравацца бабуля ва ўнука або брат у сястры, то ў Мінску яны маюць права зарэгістравацца ў сваякоў толькі пры ўмове наяўнасці ў тых 20 свабодных квадратных метраў агульнай плошчы. Без нормы агульнай плошчы могуць зарэгістраваць у Мінску дзеці сваіх бацькоў, бацькі непаўналетніх дзяцей і так далей. «Калі дачка-мінчанка жадае перавезці ў сталіцу сваю маці з іншага рэгіёна, то маці будзе зарэгістравана ў горадзе без нормы агульнай плошчы», — растлумачыў Мікалай Шэўчык.

Яшчэ адно нованаўвядзенне — магчымасць рэгістрацыі па месцы знаходжання са студзеня 2008 года на дачах і ў садовых доміках. Зрабіць гэта можна пры ўмове, што на садовым участку ёсць дом. Пры гэтым у грамадзяніна павінен быць тэхнічны пашпарт і рэгістрацыйнае пасведчанне на жылое памяшканне. З новага года можна будзе зарэгістравацца і ў дамах, якія падлягаюць зносу або капітальнаму рамонту з адсяленнем.

Як набыць зямельныя ўчасткі паводле новых правілаў

Прамая лінія «Звязды»

На пытанні чытачоў «Звязды» адказвае намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Рэспублікі Беларусь Андрэй ГАЕЎ

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 9—15 студзеня.)

☎ — Мне як жыхару сталіцы зараз можна будзе набыць зямельны ўчастак у любым пункце краіны толькі праз аўкцыён. Зямля пад Мінскам і, напрыклад, у вёсцы каля Лепеля будзе мець розны кошт. Як плануецца вызначаць першапачатковы стартавы кошт зямельных участкаў?

Ігар КОКТЫШ, *г. Мінск.*

— У любым выпадку, незалежна ад таго, які аўкцыён будзе праводзіцца — ці гэта будзе продаж зямельных участкаў у прыватную ўласнасць, або на права заключэння дагавораў арэнды, ці аўкцыён для юрыдычных асобаў з умовамі на права праектавання і будаўніцтва ў сталіцы і абласных цэнтрах, асноваў стартавай цаны будзе кадастравы кошт участка. Калі ўчастак прадаецца ў прыватную ўласнасць, то першапачаткова цана яго — кадастравы кошт зямельнага ўчастка. Пры перадачы зямельнага ўчастка ў арэнду па выніках аўкцыёна памер платы будзе вызначацца на падставе яго кадастравага кошту, але з прымяненнем каэфіцыентаў, вызначаных пастановай урада № 1736 у залежнасці ад тэрмінаў арэнды.

☎ — Жыву ў сталіцы і стаю на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Ці магу я зараз атрымаць зямельны ўчастак у сельскай мясцовасці па льготным кошце?

Вольга Сцяпанаўна, *г. Мінск.*

— Такі зямельны ўчастак для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома вы, як жыхарка Мінска, можаце атрымаць толькі праз аўкцыён.

— Аднак да пачатку 2008 года гэта можна было зрабіць?

— Так. Цяпер толькі праз аўкцыёны.

☎ — Хто можа кваліфікавана даць кансультацыю наконт таго, якая зямля па якасці і складзе знаходзіцца ў той ці іншай кропцы нашага раёна? Цікавіць інфармацыя аб тым, што лепш садзіць на ўчастку, як лепш выкарыстоўваць зямлю?

Іван ПАТРЭБКА, *Лагойскі раён.*

— У вашым раёне ёсць землеўпарадкавальная служба, якая ведае ўсю інфармацыю аб зямлі свайго рэгіёна. Па землях вобласці можна атрымаць інфармацыю ў спецыялістаў абласной землеўпарадкавальнай службы. Мінская абласная служба знаходзіцца па адрасе: вул. Чкалава, 5, г. Мінск.

☎ — Згодна з Указам № 667, зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання шматкватэрных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў будуць прадастаўляцца толькі ў пастаяннае і (або) часовае карыстанне, а не ў арэнду. Няўжо зараз долевае будаўніцтва шматкватэрных дамоў і іншае камерцыйнае будаўніцтва будзе набываць права арэнды зямельнага ўчастка для будаўніцтва жылля выключна праз аўкцыёны?

Сяргей Аляксандравіч, юрыст фінансавай кампаніі, *г. Мінск.*

— Усё залежыць толькі ад характарыстык дома, які будзе будавацца. Калі дом падпадае пад апісанне дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў, то незалежна ад формы ўласнасці забудоўшчыка ўчасткі будуць прадастаўляцца ім толькі ў пастаяннае ці часовае карыстанне. У іншым выпадку, калі будучы дом магчыма будзе аднесці да катэгорыі жылля павышанай камфортнасці, то тады нават дзяржаўныя будаўнічыя структуры будуць вымушаны набываць права арэнды на зямельны ўчастак пад будаўніцтва такіх дамоў толькі на аўкцыёнах.

Сяргей КУРКАЧ.

Кватэрнае пытанне

Указам прадугледжана

Мая сваячка 25 гадоў працуе на заводзе ў Мінску, жыве з мужам і траімі дзецьмі на 38 кв. м, з 1993 года стаіць у чарзе на жыллё. А ў яе ж павінны быць ільготы? Якія?

Т.С. ЯКУШ, *Ганцавіцкі раён.*

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 года № 185 (з улікам наступных змяненняў і дапаўненняў) на шматдзетныя сем'і, якія знаходзяцца на кватэрным уліку, распаўсюджаны больш ільготныя «сельскія» ўмовы крэдытавання пры будаўніцтве (рэканструкцыі) і набыцці жылых памяшканняў.

У прыватнасці, для шматдзетных сем'яў указ прадугледжвае пазачарговае ўключэнне ў спісы на льготнае крэдытаванне, сумеснае выкарыстанне льготнага крэдыту і аднаразовай бязвыплатнай субсідыі, а таксама дапамогу дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па крэдытах.

Велічыня льготнага крэдыту для іх вызначаецца па нарміруемай агульнай плошчы жылога памяшкання, што будуецца, і паказчыку кошту будаўніцтва 1 квадратнага метра агульнай плошчы жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў для адпаведнага тыпу жылых будынкаў, які зацвярджаецца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, у памеры да 95 працэнтаў кошту будаўніцтва нарматыву льготна крэдытуемай плошчы жылога памяшкання. Максімальны тэрмін, на які прадастаўляюцца льготныя крэдыты, устаноўлены да 40 гадоў. Плата за карыстанне гэтымі крэдытамі на працягу тэрміну іх пагашэння вызначана ў памеры 3 працэнтаў гадавых.

Шматдзетным сем'ям (незалежна ад узросту мужа і жонкі) прадастаўляецца фінансавая дапамога ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах у памерах:

пры наяўнасці трох непаўналетніх дзяцей або нараджэнні трэцяга дзіцяці — 50 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах;

пры наяўнасці чацвярых непаўналетніх дзяцей або нараджэнні чацвёртага дзіцяці — 70 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах;

пры наяўнасці пяцярых і больш непаўналетніх дзяцей або нараджэнні пятага дзіцяці і наступных дзяцей — 100 працэнтаў ад сумы запазычанасці па выдадзеных крэдытах.

Для разгляду пытання аб прадастаўленні льгот на будаўніцтва жылля неабходна звяртацца ў выканаўчы і распарадчы орган па месцы жыхарства.

Віктар САВІЦКІ.

95-ГАДОВАГА СТАРОГА ВЫРАТАВАЛІ З АГНЮ

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны, інвалід I групы па зроку, апынуўся ў вогненнай пастцы: пенсіянер не мог самастойна пакінуць дом, у якім разгараўся пажар.

Як паведаміў «Звяздзе» прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, пажар на верандзе дома ў вёсцы Беразіна Жыткавіцкага раёна, дзе жыў ветэран, убачылі двое маладых людзей позна ўвечары. Яны ж паклікалі і сваякоў пенсіянера, двое з якіх, не чакаючы прыезду выратавалнікаў, кінуліся да дома старога. Разбіўшы акно, яны адшукалі ў дыме ветэрана: тут на поўную моц «верашчаў» пажарны апавяшчальнік, аднак сляпы пенсіянер не мог зарыентавацца і выйсці вонкі.

Ігар ГРЫШЫН.

СТРАСЦЯЎ БОЛЬШ, ЧЫМ НА «ПАРЫЖ — ДАКАР»

У Браслаўскім раёне падчас начнога тура першага этапа адкрытага чэмпіянату Беларусі па аўтаралі, што праходзіў ноччу 12 студзеня, з-за сур'ёзнай аварыі прыпынілі гонку. Адна з легкавых машын перакулілася некалькі разоў. У выніку гэтага ралійнага ДТЗ штурман машыны атрымаў страсенне мазгоў.

А пазней, ужо днём, зляцеў з дарогі грузавік «МАН», на якім расіяне прыехалі пахварэць за сваіх землякоў і які мог выкарыстоўвацца ў якасці эвакуатара. Цікава, што экіпаж гэтага аўто збіраўся браць удзел у знакамітых гонках «Парыж — Дакар». У кабіне таксама знаходзілася ўрач мясцовай бальніцы, якая не атрымала раненняў. Усяго ў ралі бралі ўдзел 23 экіпажы з Беларусі, Расіі, краін Прыбалтыкі... Сярод іх быў і адзін жаночы. Перамаглі ў выніку нашы землякі. Між іншым, астатнія этапы аўтамабільнага турніру пройдуць сёлета менавіта на Віцебшчыне. Страсцяў яшчэ хопіць!

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Да 70-годдзя Гомельскай вобласці

«ЛЕПШАГА ЦВІКА, ЧЫМ РЭЧЫЦКІ, У ЕЎРОПЕ НЕ ЗНОЙДЗЕШ!»

Начальнік бюро інфармацыі і рэкламы Рэчыцкага метызнага завода Уладзімір Жалезка расказаў мне пра адзін цікавы выпадак. На міжнароднай выстаўцы ў Чэхіі да яго падышоў прадстаўнік адной італьянскай фірмы і нібы выказаў вось такі папрок: чаму вашы цвікі даражэйшыя па цане за азіяцкія, якія не горшыя па якасці? Прычыны гэтага Уладзімір Рыгоравіч доўга тлумачыць не стаў, а ўзяў у рукі хвалёны азіяцкі цвік і тут жа сагнуў яго ў дугу і выкінуў. А потым прапанаваў правесці іншаземцу падобны эксперымент з рэчыцкім цвіком, і колькі той ні напружваў свае мускулы, у яго нічога не атрымалася. І тады Жалезка сказаў італьянцу: лепшага цвіка, чым рэчыцкі, у Еўропе не знойдзеш. І нездарма 80 працэнтаў нямецкага, аўстрыйскага і італьянскага рынку цвікоў займае беларуская прадукцыя.

— Гэты прыклад, — уступае ў гутарку **дырэктар завода Адам ВАШКОЎ**, — сведчыць аб тым, як развівалася наша прадпрыемства, якому летась споўнілася 95 гадоў.

У цяжкі перыяд пасля перабудовы на завод прыйшоў новы дырэктар Адам Вашкоў, які, маючы багаты вопыт кіраўніцкай работы, не спужаўся праблем. Пасля заканчэння ў Мінску політэхнічнага тэхнікума, а затым Беларускага політэхнічнага інстытута, працуючы на розных пасадах у Рэчыцы, ён засведчыў сябе ўмелым арганізатарам і граматным эканамістам. Нездарма ж абласное кіраўніцтва даверыла яму, 27-гадоваму, узначаліць завод па вытворчасці драўняна-стружачных пліт і не памылілася: прадпрыемства стала высокаэфектыўным, з заходнімі тэхналогіямі, якія калектыў украніў з дапамогай нямецкіх і бельгійскіх спецыялістаў. Прычым спачатку апошнія вучылі завадчан, а потым самі вучыліся ў іх увязваць еўрапейскія тэхналогіі з савецкімі, каб вытворчы працэс атрымаўся высокаэфектыўным.

Пасля заканчэння інстытута паліталогіі і сацыяльнага кіравання ў біяграфіі Вашкова з'явіліся і такія старонкі, як работа на пасадах другога і першага сакратара Рэчыцкага гаркама партыі, на іншых кіруючых пасадах. Ён ведаў, з чаго трэба пачынаць на метызным заводзе. Новы дырэктар змог дамовіцца з кіраўнікамі філіялаў банкаў вобласці аб рэструктураванні запазычанасцяў па крэдытах, не спаганяць працэнты за пратэрмінаваныя плацяжы і г.д. Акрамя таго, ён вырашыў пазбавіцца ад паставак металу як асноўнай сыравіны з-за мяжы, бо кошт яго разам з транспартнымі расходамі занадта дарагі, і звярнуўся да генеральнага дырэктара Беларускага металургічнага завода Мікалая Андрыянава (гэта было ўжо крыху пазней) па дапамогу, знайшоўшы ў яго паразуменне. Неўзабаве на БМЗ была арганізавана вытворчасць спецыяльнага металу для дроту, крапежных вырабаў і цвікоў. Тым самым у метызнага завода ў выніку такіх партнёрскіх адносінаў адпала неабходнасць браць на яго вялікія валютныя крэдыты. Забягаючы наперад, трэба сказаць, што ўжо летась прадпрыемства было на сто працэнтаў забяспечана беларускай сыравінай. І адбылося гэта дзякуючы таму, што Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 2006 года было створана аб'яднанне «Беларускі металургічны завод», куды, акрамя БМЗ, увайшлі заводы: Рэчыцкі метызны, Магілёўскі металургічны і Аршанскі швейных машын.

— Працаваць пад эгідай прадпрыемства з сусветным імем, — гаворыць Адам Сямёнавіч, — значыць, адчуваць сябе ўпэўнена ва ўсіх сферах дзейнасці. Такім параўнальна невялікім заводам, як наш, складана мець свае прадстаўніцтвы за мяжой, і калі мы карыстаемся тавараправоднай сеткай БМЗ, сапраўднага гіганта металапрамысловасці, аўтарытэт якога на ўнутраным і знешнім рынках бясспрэчны, гэта ўжо іншая справа. Сёння нам з задавальненнем выдзяляюць крэдыты банкі розных краін, прычым працэнты па іх ніжэйшыя, чым у беларускіх банкаў.

Зараз у калектыве дзве тысячы чалавек, вырабляе ён звыш 1400 найменняў прадукцыі. Як гаворыцца, «цвіком» праграмы з'яўляюцца цвікі самага рознага прызначэння. Уявіце, што іх — 120 відаў: будаўнічыя, машынныя, спецыяльныя (квадратныя, шыферныя, фармовачныя, яршоныя, тарныя, рыфлёныя, палетныя і г.д.). На любы густ яны, адным словам, якасныя, даўгавечныя. Лепшых у Еўропе няма.

Рэчычане адпраўляюць у еўрапейскія краіны столькі прадукцыі, колькі ўсе шаснаццаць падобных заводаў Расіі, і ў тры разы больш, чым восем украінскіх!

— Атрымліваецца, — кажу Адаму Сямёнавічу, — што ў вас і канкурэнтаў сапраўдных няма.

— Гэта далёка не так, — адказвае ён. — Канкурэнтаў — процьма. І ў Еўропе, і ў Азіі. Барацьба за рынкі збыту ідзе даволі сур'ёзная.

Кіраўніцтва завода пільна сочыць за сваімі канкурэнтамі, пастаянна ўдзельнічае ў міжнародных выстаўках, праводзіць агрэсіўную маркетынгавую палітыку. Напрыклад, апошнім часам, калі ў нашай краіне пачаўся будаўнічы бум, а ў аддзелачных работах сталі прымяняцца новыя матэрыялы (сайдынгі, гіпсакардон і г.д.), а разам з імі і крапежныя вырабы тыпу самарэзаў і да т.п., якія пастаўлялі ў Беларусь нашы канкурэнты, мы не маглі застацца ўбаку і распрацавалі спецыяльны інвестыцыйны праект на вырабе гэтай прадукцыі і далейшым тэхнічным пераўзбраенні. На гэта швейцарскі банк CREDITSUISSE пад гарантыю Беларускага металургічнага завода адкрыў нашаму прадпрыемству ў пяць мільёнаў еўра крэдытную лінію. Быў аб'яўлены тэндар на пастаўку тэхналагічнага абсталявання, і яго выйграла адна тайваньская фірма. Ужо сёлета мы пачнём выпускаць у месяц дзвесце тон самарэзаў.

Застаецца толькі дадаць, што ў Рэчыцкага метызнага завода, які ўзначальвае ўраджэнец Тураўшчыны Адам Сямёнавіч Вашкоў, узнагароджаны за добрасумленную працу медалём «За працоўныя заслугі» і ордэнам Свяціцеля Кірыла Тураўскага другой ступені за падтрымку праваслаўнай царквы — светлыя гарызонты.

Неабходны каментарый

Мы невыпадкова змяшчаем гэты матэрыял аб справах калектыву Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Рэчыцкі метызны завод» у дзень 70-гадовага юбілею Гомельскай вобласці, якой, як вядома, прысуджаны Ганаровы дзяржаўны сцяг за асаблівыя дасягненні ў гаспадарчым развіцці. Бо ў яго гісторыі нібы яскрава паўтараецца гісторыя роднага краю — Гомельшчыны, Беларусі.

Як адзначае **старшыня абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Серафімовіч ЯКАБСОН**, Гомельшчына прайшла нялёгкія, але слаўныя этапы вялікага шляху і, пачынаючы з сярэдзіны дзевяностых гадоў, яе эканамічнае развіццё характарызуецца стабільным дынамічным ростам, які суправаджаецца станоўчымі зменамі ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэгіёна. Так, з 1995 года аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі павялічыўся ў 2,8, спажывецкіх тавараў — у 2,4 раза, прадукцыі сельскай гаспадаркі — на 37,9 працэнта. Аб'ём рознічнага тавараабароту за гэты перыяд вырас у 5,4 раза, а платных паслуг — у 2,5.

Пазітыўныя змены адбыліся і ў знешнеэканамічнай дзейнасці. Рост экспарту ў 2006 годзе да ўзроўню 1995-га склаў 5,3 раза пры росце імпарту толькі ў 2,5 раза. А ўзяць інвестыцыі ў асноўны капітал: аб'ёмы іх за апошнія дванаццаць гадоў павялічыліся за кошт усіх крыніц фінансавання ў 3,5 раза і пры гэтым у 2006 годзе ўведзена ў эксплуатацыю жылля амаль у два разы болей, чым у 2005 годзе.

Летась знешнегандлёвымі партнёрамі Гомельскай вобласці былі прадстаўнікі каля ста краін, і яе тавары пастаўляліся на рынкі 72 краін. Пералік падобных поспехаў можна працягваць і далей.

Матэрыял падрыхтаваў Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НА КОНІКАХ, ЛЕСАМ

У вёсцы Бухлічы Столінскага раёна памежнікі наведаліся да мясцовага жыхара і ў яго гаражы знайшлі кантрабанды на 35 млн рублёў. Запчасткі да матацыклаў і бензапілаў перавозілі праз беларуска-ўкраінскую мяжу на калёсах лесам.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Падрабязнасці

Накіроўваючыся за мяжу, не забудзьцеся праверыць...

Сваяк суседзяў вырашыў правесці калядныя канікулы за мяжой, пакатацца на горных лыжах. Купіў нятанную турыстычную пуцёўку, адкрыў візу, сабраў чамадан і накіраваўся ў дарогу. Якое ж было здзіўленне яго сямейнікаў, калі праз колькі гадзін ён з'явіўся на парозе дома. Чалавека развярнулі прама на пагранпераходзе «Варшаўскі мост», яго прозвішча аказалася ў камп'ютарнай базе даных, дакладней кажучы, у спісе тых асобаў, якім забаронены выезд з краіны. Прычыну забароны на пагранпераходзе паведаміць не маглі, бо яны такой інфармацыяй не валодаюць. Далей няўдачліваму турысту трэба будзе звярнуцца ў органы па грамадзянстве і міграцыі і высветліць прычыну, па якой ён стаў невыязным. Але гэта будзе далей, на гэта спатрэбіцца час. А чалавек ужо страціў немалыя грошы, дадайце атрыманы стрэс...

Як вядома, з новага года ў нас адменена дзеянне штампа «Выезд ва ўсе краіны свету». Не трэба запаўняць анкеты, стаяць у чэргах, плаціць грошы. Зараз наша законапаслухмянасць правяраецца аўтаматычна з дапамогай адзінай аўтаматызаванай сістэмы пагранічнага кантролю, што вельмі выгадна для пераважнай большасці людзей. А з тых грамадзян, якія ўхіляюцца ад уплаты аліментаў, не разлічыліся з падаткамі, у якіх ёсць іншыя даўгі перад законам, складзены спіс. Каб даведацца, ці не трапіла ў яго тая ці іншая асоба, дастаткова зайсці ў раённы аддзел па грамадзянстве і міграцыі з пашпартам і пакінуць там пісьмовы або вусны запыт. Адказ можна атрымаць праз месяц. Такія тэрміны ўстаноўлены афіцыйна, і зрабіць гэту працэдуру больш хуткай пакуль няма тэхнічнай магчымасці. Але лепей усё ж да паездкі рыхтавацца загадзя.

У краіне ўжо ў першыя дні новага года цераз мяжу не прапушчана больш за 20 чалавек. На пагранпераходзе «Варшаўскі мост», паводле слоў супрацоўніка Брэсцкай пагрангрупы Дзмітрыя Дзявятава, «разварот» атрымалі сем грамадзян.

Таму ўсё ж нялішнім будзе накіраваць адпаведны запыт і атрымаць на яго адказ перад паездкай, нават калі вы не адносіцеся да катэгорыі неплацельшчыкаў аліментаў і не мелі ніякіх канфліктаў з законам. Спецыялісты папярэджваюць, што бываюць супадзенні ў прозвішчах, імёнах і імёнах па бацьку, якія могуць прывесці да агрэхаў. На высвятленне любой недарэчнасці спатрэбіцца час. А калі куплены білет, афармлена віза і сабраныя рэчы ў дарогу, лепей мець пачуццё ўпэўненасці, а не нерваванца перад акенцам пагранкантролю.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Мінскі абласны Савет дэпутатаў выказвае глыбокае спачуванне старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Матусевічу Міхаілу Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Мінскі абласны выканаўчы камітэт выказвае глыбокае спачуванне старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Матусевічу Міхаілу Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Матусевічу Міхаілу Васільевічу ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю МАЦІ.

Па чутках і на справе

НЕ ПАДПАЛ, А КАРОТКАЕ ЗАМЫКАННЕ

Пасля пажару у Гродзенскім кафедральным касцёле святога Францыска Ксаверыя (Фарным) прайшло ўжо паўтара года. І вось цяпер нарэшце можна сказаць аб прычыне гэтай бяды.

Чуткі, якімі яна адразу ж пачала абрастаць (і пра нейкую падазроную жанчыну, якая знаходзілася ў храме перад самым здарэннем, і пра непатушаную свечку, і пра быццам бы падвыпіўшых работнікаў касцёла) не пацвердзіліся.

Паводле інфармацыі начальніка Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Анатоля Бабія, аддзелам унутраных спраў Ленінскага райвыканкама г. Гродна вынесена рашэнне аб спыненні крымінальнай справы па факце пажару ў Фарным касцёле ў сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

За паўтара года, адзначыў Анатоль Бабій, было праведзена шмат даследаванняў і экспертыз. У выніку версія падпалу цалкам выключана. Месяц таму экспертна-крыміналістычны цэнтр МУС Беларусі вынес канчатковае заключэнне. Прычына пажару ў Фарным касцёле — кароткае замыканне электраправодкі, пярвічныя прыкметы якога выяўлены ў раёне падсветкі на алтары, дзе выкарыстоўваліся галагенавыя лямпачкі. Мантаж электраправодкі выконваўся рабочымі з Польшчы. Пры гэтым, як высветлілася, у храме адсутнічалі схемы і якая-небудзь праектная дакументацыя на абноўленае электразабеспячэнне. Электраправодка манціравалася ў тры этапы. Гродзенская фірма рабіла замеры на супраціўленне і ўсё было ў норме. Але непрафесіянальна праклдзеная электраправодка, паслужыўшы нейкі час, усё ж прывяла да пажару.

Анатоль Бабій паведаміў, што супрацоўнікамі МНС надаецца вялікая ўвага праверцы стану электраправодкі ў культавых установах вобласці, гутаркам на гэту тэму са свяшчэннаслужыцелямі. Пасля выдачы адпаведных прадпісанняў дробныя парушэнні ўстараняюцца, але шмат дзе застаецца нявырашанай галоўная праблема, якая звязана з грашовымі сродкамі на ўстаноўку ў храмах аўтаномнай пажарнай сігналізацыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Уважаемые акционеры
ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло»
30 января 2008 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло», расположенного по адресу: 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18.
Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18 (актовый зал общества). Начало собрания — 16.00.
Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло» за 2007 год.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков.
3. О приобретении обществом акций собственного выпуска и их последующей продаже ОАО «Амкодор».
С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18 ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 25 января 2008 г. у юрисконсульта общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.
Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении лицами, явившимися для участия в собрании, документов, удостоверяющих их личность и подтверждающих их полномочия (паспорт и доверенность).
Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 14.30 до 15.45.
Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 25 января 2008 года.
Наблюдательный совет ОАО «Экспериментальный завод им. Н. Гастелло».

Спорт-тайм

Пачынаем ва Украіне, заканчваем у Англіі

У панядзелак у Загрэбе (Харватыя) адбылася сустрэча прадстаўнікоў камандаў, якія ўключаны ў групу F адборачнага турніру ЧС-2010. Дэлегацыям федэрацый Харватыі, Англіі, Украіны, Беларусі, Казахстана і Андоры ўдалося дасягнуць згоды і зацвердзіць каляндар матчаў. Ён выглядае наступным чынам:

2008 год
20 жніўня
Казахстан — Андора
6 верасня
Харватыя — Казахстан
Украіна — БЕЛАРУСЬ
Андора — Англія
10 верасня
Харватыя — Англія
Андора — БЕЛАРУСЬ
Казахстан — Украіна
11 кастрычніка
Украіна — Харватыя
Англія — Казахстан
15 кастрычніка
Харватыя — Андора
БЕЛАРУСЬ — Англія
2009 год
1 красавіка
Англія — Украіна
Андора — Харватыя
Казахстан — БЕЛАРУСЬ
6 чэрвеня
Харватыя — Украіна
Казахстан — Англія
БЕЛАРУСЬ — Андора
10 чэрвеня
Украіна — Казахстан
Англія — Андора
19 жніўня
БЕЛАРУСЬ — Харватыя
5 верасня
Украіна — Андора
Харватыя — БЕЛАРУСЬ
9 верасня
Англія — Харватыя
БЕЛАРУСЬ — Украіна
Андора — Казахстан
10 кастрычніка
Украіна — Англія
БЕЛАРУСЬ — Казахстан
14 кастрычніка
Казахстан — Харватыя
Андора — Украіна
Англія — БЕЛАРУСЬ

53 еўрапейскія краіны разбіты на 9 груп: у васьмі з іх па шэсць камандаў, у адной — пяць. Напрамую пуцёўкі на чэмпіянат свету атрымаюць пераможцы груп, а восем камандаў з лепшымі вынікамі сярод тых, хто зойме другія месцы, вызначаць яшчэ чатырох шчаслівчыкаў у матчах плей-оф.

Вяртанне «белай маланкі»

Алімпійская чэмпіёнка Афін у бегу на сто метраў Юлія Несцярэнка вярнулася ў спорт пасля гадавога перапынку, які быў выкліканы траўмай. Лёгкаатлетка выступіла на адкрытым чэмпіянаце Беларусі: 300 метраў яна прабегла за 41,33 секунды.

Ліга чэмпіёнаў па хакеі

У наступным сезоне стартуе Ліга чэмпіёнаў па хакеі з шайбай. У турніры будуць спаборнічаць 12 камандаў: па дзве з Чэхіі, Фінляндыі, Расіі, Швецыі, па адной з Германіі, Швейцарыі і Славакіі. Яшчэ аднаго ўдзельніка патрэбна вызначыць. Магчыма, ім стане чэмпіён Беларусі.

Здалі паўнамоцтвы

У мінулым годзе юныя беларускія футбалісты сталі пераможцамі міжнародных спаборніцтваў у Мінску і Санкт-Пецярбургу, а сёлета нашы каманды аддалі трафеі расіянам. На IV юнацкім турніры на прызы Беларускай федэрацыі футбола і Мінгарвыканкама (узрост ігракоў да 17 гадоў) гаспадары прайгралі ў фінале нашым усходнім суседзям — 0:2. У галоўным жа матчы XX міжнароднага юніёрскага турніру памяці першага віцэ-прэзідэнта ФІФА Валянціна Гранаткіна (узр

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

16 студзеня 2008 г. № 2 (105)

БЮДЖЕТ ОБЛАСТИ СОХРАНИТ СОЦИАЛЬНУЮ НАПРАВЛЕННОСТЬ

Обсуждению итогов работы народного хозяйства Минской области за 2007 год и прогнозов социально-экономического развития на 2008-й была посвящена X сессия Минского областного Совета депутатов XXV созыва, состоявшаяся в начале этой недели. Сессия прошла в расширенном составе. Кроме председателей районных Советов, в ней приняли участие некоторые депутаты Палаты представителей и члены Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь.

Учитывая важность рассматриваемых вопросов, а также необходимость обсуждения их и на заседании Миноблисполкома, исполнительная и представительная ветви власти Минщины в целях экономии времени и повышения продуктивности своей работы объединили усилия и провели сессию депутатов совместно с заседанием облисполкома. Кроме депутатов, в зале присутствовали члены Миноблисполкома во главе с председателем Леонидом Крупцом, руководители структурных подразделений, областных организаций, председатели районных исполнительных комитетов, их заместители и начальники финансовых отделов.

По словам председателя Минского областного Совета депутатов Светланы Герасимович, вопросы, вынесенные на повестку дня, предварительно были обсуждены в трудовых коллективах на местах, в комиссиях районных Советов. Рассмотрение их в таком широком представительстве обеих ветвей власти дало возможность детально проанализировать, что было сделано за прошедший год, обозначить положительные тенденции, а также выявить резервы, которым надо будет уделить особое внимание в году нынешнем, чтобы выполнить поручения Президента.

Что касается прогнозных показателей за 2007 год, большинство их Минская область выполнила. Исключение составили показатели производства товаров народного потребления, продукции сельского хозяйства, импорта товаров и услуг и инвестиций в основной капитал. Как объяснила журналистам председатель комитета экономики Миноблисполкома, депутат Минского областного Совета депутатов Жанна Бирич, показатель по товарам народного потребления не выполнен из-за сокращения производства сахароперерабатывающих предприятий концерна «Белгоспищепром», удельный вес которых в общем объеме производства потребительских товаров в области превышает 13 процентов. Причиной невыполнения планового показателя по производству сельскохозяйственной продукции стало снижение количества частных подворий и поголовья скота у населения.

По итогам двух лет текущей пятилетки Минская область выполнила большинство доведенных показателей, кроме производства продукции сельского хозяйства и импорта товаров. Жанна Эдуардовна отметила, что на 2008 год области доведены довольно жесткие показатели по всем сферам народного хозяйства и надо будет задействовать все резервы для их выполнения.

Председатель Миноблисполкама Леонид Крупец обратил внимание присутствующих на невыполнение ряда показателей отдельными районами. Три района не вышли на уровень прошлого года. Минский район мог сработать и лучше, отметил Леонид Крупец. То же касается Несвижского и Слуцкого районов, где местные власти дружно кивают в сторону сахароперерабатывающих предприятий, хотя в этих районах сегодня самый большой процент убыточных предприятий. 14 районов не выполнили показатель по предприятиям, подчиненным местным Советам. «Нужно раскручиваться, искать новые формы и методы работы, — подчеркнул Леонид Крупец. — Если доведен прогнозный показатель (а он, поверьте, с потолка не взят), значит, его надо выполнить. Вы должны на местах делать глубокий анализ и рассчитывать на перспективу».

Говоря о бюджете области на 2008 год, начальник финансового управления Миноблисполкома, депутат Минского областного Совета Александр Ермак отметил, что кардинальных отличий его от бюджета предыдущего года нет. Основные подходы и база сохранились. При этом учтены некоторые изменения в налоговом законодательстве (отмена уплаты налога с пользователя автомобильных дорог, некоторых местных налогов и сборов).

Сохранена социальная направленность бюджета, т.е. свыше 60 процентов (1 трлн 627 млрд рублей) будет расходовано на социальную сферу. Предусмотрены ассигнования на оказание адресной социальной помощи (3,1 млрд рублей). Общий объем бюджета составил 2 трлн 964 млрд рублей.

Инга МИНДАЛЕВА.

МАЛЫЯ ГАРАДЫ

ЯКІМ БУДЗЕ «ЗАЎТРА» РУДЗЕНСКА?

У Дзяржаўную комплексную праграму развіцця малых, сярэдніх гарадоў і пасёлкаў уключана 187 населеных пунктаў, якім неабходна дадатковая падтрымка. Сярод іх — гарадскі пасёлак Рудзенск Пухавіцкага раёна. Нашы журналісты вырашылі на свае вочы пабачыць, чым сёння жыве Рудзенск, з якімі праблемамі сутыкаецца, як іх вырашае, чаго чакае ад рэалізацыі праграмы.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Старшыня пасялковага Савета Вольга РАГАТКА (справа) і сакратар Валянціна ЯНЧЭЎСКАЯ.

На тэрыторыі Рудзенскага пасялковага Савета пражывае 4200 чалавек, плюс — каля тысячы дачнікаў з 42 мясцовых садовых таварыстваў. Кожны трэці жыхар Рудзенска — малады чалавек ва ўзросце ад 16 да 30 гадоў. Даволі доўга пасёлак меў сумную крымінальную рэпутацыю, аднак апошнім часам сітуацыя пачала змяняцца ў лепшы бок.

— Яшчэ два гады таму на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх у нас стаяла 16 чалавек, сёння — толькі адзін, яшчэ пяцёра ў групе рызыкі, — расказвае старшыня Рудзенскага пасялковага Савета дэпутатаў Вольга Рагатка. — Гэта заслуга не аднаго пэўнага чалавека ці арганізацыі, а вынік нашай агульнай штодзённай працы. Большасць правапарушэнняў у Рудзенску прыпадала на долю не мясцовых жыхароў, а прыезджых — з Асіповіцкага раёна, з Бабруйска і г.д. Чыгуначны вакзал у нас размяшчаецца ў цэнтры пасёлка. Былі і крадзяжы, і бойкі, і напады на людзей. Зараз кантроль за грамадскімі месцамі, у тым ліку і за прывакзальнай плошчай, значна ўзмацніўся. У нас практыкуюцца бацькоўска-настаўніцкія рэйды, дэпутацкія дзяжурствы, я ўжо не кажу пра работу органаў аховы правапарадку. Многае змянілася з прыходам новага дырэктара гарадскога ДК Наталлі Ралько. З'явіліся тэматычныя клубы, гуркі, калектывы самага рознага профілю (вакальнага, харэаграфічнага, тэатральнага, літаратурнага і інш.) Моладзі ёсць куды пайсці, чым сябе заняць. І не толькі моладзі.

Геаграфічна тэрыторыя пасавета падзяляецца на два цэнтры — Рудзенск, вакол якога «групуюцца» прыгарадныя вёскі, і вёску Цітва. Там месціцца базавая школа і сельскі Дом культуры, куды сцякаецца на дыскатэкі моладзь бліжэйшых населеных пунктаў. Рудзенскія хлопцы і дзяўчаты бавяць час на дыскатэках у гарадскім ДК.

Хоспіс замест бальніцы

Пакуль мы размаўлялі з Вольгай Васільеўнай, у пасялковы выканкам патэлефанавала мясцовая пенсіянерка, занепакоеная закрыццём 2-й рудзенскай раённай бальніцы, размешчанай на ўскрайку пасёлка. Жанчына хвалявалася: дзе ж цяпер людзі будуць атрымліваць медыцынскія паслугі?

— Пухавіцкі раён — адзін з лідараў у вобласці па колькасці анкалагічных захворванняў, — патлумачыла Вольга Васільеўна. — Гэта абумовіла неабходнасць стварэння тут хоспісаў для догляду анкахворых. Адзін з такіх хоспісаў будзе размяшчацца ў будынку 2-й раённай рудзенскай бальніцы. Саму бальніцу закрыюць, а яе 40 ложкаў і медыцынскае абсталяванне размяркуюць паміж дзвюма суседнімі бальніцамі — у гарадскім пасёлку Свіслач (што за 10 км ад Рудзенска) і ў пасёлку гарадскога тыпу Праўдзінск (які за 14 км). Аўтобусы ходзяць у нас рэгулярна, ніякіх праблем дабрацца ў Свіслач ці ў Праўдзінск няма. Акрамя таго, хворых у бальніцу звычайна прывозіць машына хуткай дапамогі, і няма розніцы, у якую (Праўдзінскую ці Свіслацкую) іх пакладуць. Інтарэсы жыхароў Рудзенска не пацерпяць. Іншая справа, што бальніца была ў Рудзенску колькі людзі сябе памятаюць, і ім цяжка зараз страціць яе.

У Рудзенску працягвае працаваць паліклініка. Праўда, год таму вузкіх спецыялістаў (неўрапатолага, хірурга, аталарынголага) перавялі на працу ў пасёлак Дружны, што за 4 км ад Рудзенска. А тут засталіся 2 тэрапеўты, 2 стаматолагі, педыятр. Працуе кабінет фізіятэрапіі і дзённы стацыянар.

— Першую медыцынскую дапамогу жыхары Рудзенска атрымліваюць «на месцы», а на прыём да вузкіх спецыялістаў едуць у Дружны, — працягвае старшыня. — Як я ўжо казала, з транспартам праблем няма. А адкрыццё хоспіса дасць нашаму пасёлку яшчэ адзін плюс — дадатковыя працоўныя месцы.

«Прафесійная» беспрацоўная

Большасць жыхароў Рудзенска — былыя ці сённяшнія работнікі ААТ «Рудзенск», якое спецыялізуецца на святлотэхніцы. Прадпрыемства працуе з прыбыткам, частка яго прадукцыі ідзе на экспарт. Другое месца па колькасці занятых займае ЦЭЦ-5, што за 5 км ад пасёлка. За ёй ідзе мясцовы хлебазавод, дзе летась паставілі новую печку і адкрылі лінію белага хлеба.

Наступнымі ў спісе працадаўцаў стаяць прыватныя прадпрыемствы. У тым ліку два, што спецыялізуюцца на пластыкавых вырабах рытуальнага характару (вянкі, кошыкі, штучныя кветкі). На абодвух задзейнічана каля сотні наёмных работнікаў. Ёсць яшчэ дрэваапрацоўчае прадпрыемства, якое забяспечвае дзвярыма і вокнамі ўвесь раён (няма адбою ад заказаў). Там працуе каля 20 чалавек. Варта ўзгадаць сярэднеадукацыйную школу, дзе выкладае 60 настаўнікаў, і школу-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дзе налічваецца каля 40 чалавек персаналу.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АТРЫМАЦЬ ДАВЕДКУ НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ХАТЫ

Адказнасць за вырашэнне агульнадзяржаўных і мясцовых задач ляжыць не толькі на выканаўчай галіне ўлады. Шмат зрабіць для паляпшэння жыцця і дабрабыту людзей могуць Саветы дэпутатаў. Так лічыць старшыня Асіповіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр Пузік. Жыхары раёна абіраюць яго ў райсавет не першы год. За гады праўлення Аляксандр Віктаравіч здолеў не толькі глыбока прасякнуцца іх праблемамі, але і наладзіць узаемаадказныя адносіны з райвыканкамам, кіраўніцтвам прадпрыемстваў і арганізацый. Кожная з галін мясцовай улады мае сваё поле дзейнасці.

— Ініцыятыва ў напаўненні і выкарыстанні мясцовага бюджэту, вядома, належыць райвыканкаму. Але ў яго фарміраванні і разме ркаванні важкае слова застаецца за народнымі абраннікамі, — кажа Аляксандр Віктаравіч. — Выключна раённы Савет зацвярджае яго, уносіць папраўкі і дапаўненні, прымае справаздачу аб выкананні. Ужо да пачатку новага года кожны мясцовы Савет мае ўяўленне, колькі і на якія мэты зможа патраціць. Прычым у аснове размеркавання ляжыць справядлівы прынцып: большы па колькасці жыхароў Савет і атрымлівае больш. У гэтым прынцыповае адрозненне ад схемы, калі мясцовая ўлада пярвічнага ўзроўню ідзе з «працягнутай рукой» у райвыканкам па сродкі для вырашэння любой надзённай праблемы. Зацвярджэнне дэпутатамі пасяловых і сельскіх Саветаў мерапрыемстваў па добраўпарадкаванні населеных пунктаў пад выдзеленыя сродкі, а таксама падтрыманне ініцыятывы прадпрыемстваў і ўстаноў у гэтым пытанні павышае статус кожнага дэпутата і ўсяго Савета цалкам.

— Час ідзе, а праблемы застаюцца?

— Так, і нічога дзіўнага ў гэтым няма. Проста з цягам часу змяніўся сам змест праблем. Зараз існуюць зацверджаныя сацыяльныя стандарты. Яны, у асноўным, тычацца якасці жыцця і выконваюцца. Але многія паўсядзённыя пытанні цяжка зафіксаваць на паперы. Для іх вырашэння жыхарам даводзіцца звяртацца ў мясцовыя органы ўлады. Па тыя ж даведкі ці з розната роду запытамі. Якраз тут у жыхароў могуць узнікнуць складанасці, магчымы мясцовы бюракратызм. Мы задумаліся над гэтым. Значная частка нашых вёсак аддалена ад цэнтра, мае ўсяго па дзесятку жыхароў, пенсійнага ўзросту. Нават пры добрых чыгуначных і аўтобусных зносінах з цэнтрамі сельсаветаў і райцэнтрам ім цяжка часам пакінуць дом, каб тэрмінова нешта вырашыць. Таму мы пайшлі па шляху набліжэння ўлады да чалавека. Яшчэ ў 2002 годзе правялі рэарганізацыю трох сельсаветаў і за кошт гэтага здолелі забяспечыць нашы сельсаветы патрыманымі аўтамашынамі. Зараз працуем над іх заменай на новыя. На сёння большасць сельсаветаў мае новыя «Жыгулі». Вялікую падтрымку ў гэтым мы маем з боку старшыні Магілёўскага аблсавета Уладзіміра Панцюхова. Мяркую, з яго дапамогай у гэтым годзе ўсе Саветы раёна будуць забяспечаны новым службовым аўтатранспартам, што дасць магчымасць работнікам сельвыканкамаў і іншым спецыялістам рэгулярна наведваць кожную вёску і вырашаць бягучыя пытанні жыхароў на месцы.

— Атрымаць даведку не выходзячы з хаты — гэта сапраўды прагрэс. Відавочна, і ўлада будзе ведаць, на якім слупе гарыць лямпачка?

— Так. Дарэчы, вулічнае асвятленне знаходзіцца ў непасрэднай кампетэнцыі мясцовага Савета і выканкама. Мы трымаем пад кантролем расход электраэнергіі на асвятленне населеных пунктаў. Вядома, што ў краіне напружанасць з энерганосьбітамі і іх трэба эканоміць. Але справа не толькі ў гэтым. Я ўжо казаў, што значная частка нашых вёсак малалюдная. Па якіх стандартах іх асвятляць, калі на працягу паўкіламетра ўсяго тры жылыя хаты? Таму мы параіліся з насельніцтвам і прапанавалі замест пастаяннага ўключэння асвятлення ў населеных пунктах на цэлую ноч (ад фота-рэле) уключаць яго толькі ў неабходным месцы на неабходны тэрмін: некалькі гадзіны пасля заходу сонца і на гэтакі ж тэрмін — зранку. У большасці населеных пунктаў прапанова знайшла разуменне і падтрымку. Незадаволенымі засталіся тыя, хто не з'яўляецца пастаяннымі жыхарамі і прыязджае ў вёску перыядычна, як на лецішча. Эканамічны эфект ад прапановы атрымаўся адчувальным: калі ў 2006 годзе на мэты асвятлення раёнам было спажыта 881,6 тыс. квт/гадзін электраэнергіі, то за мінулы год — амаль на 270 тыс. квт/гадзін менш.

Эканоміяй электраэнергіі мы будзем займацца і далей. Сочым за навінкамі. Калі іх прымяненне будзе эканамічна абгрунтавана — прыменім. Зэканомленыя грошы мы выкарысталі на добраўпарадкаванне населеных пунктаў.

— На навядзенне парадку на зямлі?

— Можна сказаць і так. Гэта вялікая праблема. На жаль, наша вёска старэе, а больш маладыя жыхары не адчуваюць сябе такімі ж гаспадарамі зямлі. Гэта праяўляецца не толькі ў нежаданні многіх весці прысядзібную гаспадарку, трымаць хатнюю жывёлу, але і ў стаўленні да асяродку пражывання. Твар многіх населеных пунктаў пакутуе ад закінутых бацькоўскіх і дзедаўскіх сядзіб, што параслі быльнягом. У раёне была праведзена інвентарызацыя зямлі. Амаль тысячы домаўладальнікаў выдалі прадпісанні, ліквідавалі звыш паўтысячы несанкцыяваных звалак. Агульная колькасць пустых і старых дамоў у раёне склала 655 адзінак. Пошукам значнай часткі іх нашчадкаў займаюцца сельвыканкамы. Знясі такую будыніну — а раптам з'явіцца яе ўладальнік? Заканадаўча вызначаны парадак перадачы ці ліквідацыі пустуючых дамоў. Скажам, каб быць ашчаднымі, прымаем рашэнне аб ліквідацыі і выкарыстанні будыніны на дровы. Але якія ж дровы з трухі? А дом жа перад гэтым трэба разабраць, бярвенні папілаваць. Калі падлічыць усё, то не прыбытак ад ашчаднасці, а прамыя страты. Куды прасцей вывесці такую «хату» ў небяспечнае месца ці падагнаць пажарную машыну ды спаліць. Вось і ўзнікае пытанне аб выдзяленні сродкаў на ліквідацыю пустых дамоў.

Цалкам падтрымліваючы Указ Прэзідэнта № 21 ад 12 студзеня мінулага года, павінен зазначыць, што выкананне яго ў частцы арт. 8.2 ідзе марудна. Нагадаю, што згодна з гэтым артыкулам мы павінны перадаць спецыялізаваным арганізацыям дарогі сельскіх населеных пунктаў. Але як іх перадаваць, калі ніякай тэхнічнай дакументацыі на гэтыя дарогі няма? Дарожнікі, між тым, не могуць іх прыняць без адпаведнай дакументацыі. Каб выканаць яе, сельскім выканкамам таксама патрэбны дадатковыя сродкі з мясцовага бюджэту.

— Відавочна, грошы патрэбны на ўсё. Але разам з тым і самі Саветы павінны быць больш наступальнымі ў пошуку сродкаў на мясцовыя патрэбы.

— Мы да гэтага імкнёмся. Пры будаўніцтве ці рамонце з мэтай эканоміі выкарыстоўваем мясцовыя будматэрыялы, адшукваем рэзервы пры выкананні работ. Значная частка нашага раёна пакрыта лесам. Таму за кошт збору дзікарослай лясной прадукцыі мы ўжо атрымліваем дадатковы прыбытак. У гэтым годзе дзякуючы падаткам нарыхтоўшчыкаў у мясцовыя бюджэты плануем атрымаць звыш 30 мільёнаў рублёў.

— А як жа аграэкатурызм? Вельмі ўжо модны накірунак.

— Займаемся. Але ж тут прымусам не возьмеш. Павінен з'явіцца энтузіяст, чалавек з прыватнай ініцыятывай, і не адзін, каб зрушыць гэту справу. Трэба адцурацца ад меркавання, што дастаткова пабудаваць добры дом і лазню, як у іх адразу нахлынуць свае ці іншаземныя наведвальнікі. Аграэкатурызм — гэта комплекс праблем, і тут важная не столькі канчатковая кропка на карце, колькі комплекс турыстычных паслуг, у тым ліку і ахова турыстаў (у прыватнасці, медыцынская). Мы ставім задачу, каб кожны з дванаццаці Саветаў паспрыяў стварэнню хоць бы адной сядзібы для аграэкатурыстаў, і будзем дабівацца гэтага.

— Аляксандр Віктаравіч, наша краіна багатая на археалагічныя помнікі, мемарыяльныя мясціны. Яны б таксама маглі адыграць сваю ролю ў прыцягненні турыстаў, калі б былі адпаведным чынам абсталяваны. Укладанні ў іх не дадуць імгненнай аддачы, але і без гэтага марыць аб сапраўдным развіцці турызму (у тым ліку і аграэкатурызму) беспадстаўна.

— Заўвага справядлівая. Але не будзем забываць, што перад раённым Саветам і райвыканкамам перш за ўсё стаіць задача забеспячэння дабрабыту жыхароў раёна. У вашай жа прапанове — прастора для грамадскай ініцыятывы. Многія прывыклі, што ўлада павінна ўсё. А самі грамадзяне? Мясцовая ўлада падтрымае любую слушную прапанову на гэты конт. Мы не маем права ўкладваць бюджэтныя сродкі ў камерцыйныя праекты і прадпрыемствы. Але спрыяць іх памнажэнню і росквіту мы можам і будзем.

Гутарыў Віктар ХУРСІК.

РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ

ПЕРАВЫХАВАННЕ БАЦЬКОЎ: ДАСЯГНУЦЬ НЕДАСЯГАЛЬНАГА?

Зараз на ўліку ў органах унутраных спраў знаходзяцца звыш 12 тысяч «цяжкіх» дарослых, якімі займаюцца раённыя ўлады, органы ўнутраных спраў і цэнтры занятасці. Мінулы год паказаў, што агульнымі намаганнямі ўдалося ўладкаваць на работу 65—75 працэнтаў гора-бацькоў.

Паводле слоў **намесніка начальніка ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь Андрэя САЛАДОЎНІКАВА,** рашэнне аб тым, што канкрэтны чалавек абавязваецца вяртаць дзяржаве грошы, затрачаныя на ўтрыманне дзяцей у сацыяльным прытулку, дзіцячым доме ці школе-інтэрнаце, выносіць суд. Пасля гэтага абавязаная асоба павінна на працягу сутак стаць на ўлік у цэнтры занятасці, атрымаць накіраванне на работу.

— Ужо на гэтым этапе некаторыя бацькі знікаюць з поля зроку, ай чым нам і паведамляюць супрацоўнікі цэнтра занятасці, — тлумачыць Андрэй Саладоўнікаў. — Мы ажыццяўляем у такіх выпадках прымусовы прывод. Наогул на ўчастковых ускладаецца дадатковая нагрузка: яны суправаджаюць абавязаных у цэнтр занятасці, на праходжанне медкамісіі, на месца работы, аказваюць дапамогу ў аднаўленні пашпартоў і г.д. Усё ж такі размова ідзе пра людзей, якія на працягу многіх гадоў злоўжываюць алкаголем, не працуюць, часам пазбаўленыя бацькоўскіх правоў, маюць судзімасці. Вельмі прыемна, калі на месцах адэкватна расцэньваюць сітуацыю і не спадзяюцца толькі на міліцыю. Напрыклад, у Салігорску распараджэннем старшыні райвыканкама ўстаноўлены графік, згодна з якім гарадскія прадпрыемствы па чарзе вылучаюць транспарт для рабочай групы — работнікаў органаў унутраных спраў і прадстаўніка цэнтра занятасці, каб тыя двойчы на тыдні аб'язджалі ўхіленцаў і дастаўлялі іх на месца прызначэння...

Можна зразумець нежаданне наймальнікаў браць на працу тых, хто вылучаецца нізкай кваліфікацыяй ці наогул яе адсутнасцю і да таго ж пастаянна парушае рабочы графік. Нягледзячы на тое, што закон не пакідае наймальнікам права выбару, каля 50 кіраўнікоў прадпрыемстваў былі прыцягнуты летась да адміністрацыйнай адказнасці за адмаўленне ад «паслуг» абавязаных асобаў.

Са злоснымі прагульшчыкамі дапамагаюць змагацца і лячэбна-працоўныя прафілакторыі, дзе пабывалі ўжо каля 500 чалавек. Такія ўстановы «вырываюць» выпівох са звыклага асяроддзя, прадастаўляюць ім хоць бы мінімальную медыцынскую дапамогу і ахопліваюць работай. Заробленых грошай — дзесьці да 150 тысяч рублёў — хапае і на аплату ўласнага знаходжання ў ЛПП (каля 60—70 тысяч у месяц) і часткова на дзіцячыя кампенсацыі. Праблема, праўда, у тым, што падобная тактыка — не панацэя (знаходжанне ў ЛПП не можа быць працяглым), да таго ж, у прафілакторыях назіраецца апошнім часам востры недахоп месцаў. Напрыклад, на канец мінулага года там знаходзілася на 700 чалавек больш, чым маглі дазволіць сабе ўстановы. Але пытанне вырашаецца: Брэсцкі і Віцебскі аблвыканкамы разглядаюць магчымасць адкрыцця лячэбна-працоўных прафілакторыяў у сваіх рэгіёнах.

З ліку працаўладкаваных сістэматычна ўхіляецца ад выхаду на работу практычна кожны трэці. Крымінальная адказнасць надыходзіць, паводле дэкрэта, пасля 10 дзён прагулаў на працягу 3 месяцаў. Праўда, адпаведныя змяненні па гэтым пытанні хоць і ўнесены ўжо ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, але дэпутатамі яшчэ не прыняты.

— Артыкул 174 Крымінальнага кодэкса спачатку прадугледжваў адказнасць бацькоў, якія ўхіляюцца ад выплаты аліментаў. А са жніўня 2005-га стала магчымым узбуджэнне крымінальных спраў у дачыненні да асобаў, якія ўхіляюцца ад вяртання расходаў на ўтрыманне дзяцей у дзяржаўных установах, — тлумачыць Андрэй Саладоўнікаў. — За год дзеяння гэтага дапаўнення мы ўбачылі, што падобныя расходы амаль не вяртаюцца. Было вырашана аператыўна выправіць сітуацыю ў заканадаўчым плане. Адсюль і форма — дэкрэт, які быў хутка прыняты. Праўда, дэкрэт акрэслівае адзін тэрмін прыцягнення да крымінальнай адказнасці, а Крымінальны кодэкс — іншы. Паводле апошняга, узбуджэнне крымінальнай справы магчымае ў дачыненні да тых асобаў, якія ўхіляюцца ад работы і вяртання грашовых сродкаў на працягу 3 месяцаў. Летась было расследавана 899 такіх спраў. Асуджаныя былі прыцягнуты да папраўчых работ ва ўстановах адкрытага тыпу. Калі нехта і там ухіляецца ад работы, можна ўзбуджаць крымінальную справу па арт. 415 Крымінальнага кодэкса. У такім выпадку магчыма рэальнае пазбаўленне волі ў папраўчай калоніі...

* * *

З 20 чалавек, якія дайшлі да цэнтра занятасці ў Шаркаўшчынскім раёне Віцебскай вобласці, работу атрымалі 12. У асноўным, яны прыйшлі ў сельскагаспадарчыя вытворчыя кааператывы і жыллёва-камунальную гаспадарку, паколькі з прамысловасці ў раёне — толькі гароднінасушыльны завод. Адсюль і сярэдні заробак у рэгіёне — 336 тысяч рублёў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Мінуў акурат год з моманту ўступлення ў сілу Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у няўдалых сем'ях». Ключавое слова ў дакуменце — «абарона», а значыць, прадухіленне далейшага росту колькасці сацыяльных сірот, чые бацькі цалкам ігнаруюць свае абавязкі. Магчымасць вярнуць апошнім чалавечае аблічча, паўплываць на ўсведамленне імі адказнасці перад уласнымі дзецьмі, грамадствам у цэлым бачыцца, паводле дакумента, у заахвочванні «няўдалых асобаў» да працы, паколькі добраахвотнае працаўладкаванне большасці з вышэйпамянёных не па душы. Дый часам і не па сілах — з-за рэгулярнага злоўжывання алкаголем. Спагнаць з абавязаных бацькоў грошы, вярнуць бюджэту сродкі, патрачаныя на ўтрыманне дзяцей у дзяржаўных установах — сацыяльных прытулках, дамах дзіцяці, школах-інтэрнатах — усяго толькі спосаб уздзеяння. А мэта, можна сказаць, такая: усе бацькі павінны ўсвядоміць — кожны, каму не захочацца займацца выхаваннем уласных дзяцей па закліку сэрца, будзе рабіць гэта... вымушана.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЯКІМ БУДЗЕ «ЗАЎТРА» РУДЗЕНСКА?

Дырэктар Рудзенскага Дома культуры Наталля РАЛЬКО і бібліятэкар Людміла ЛУХВЕРЧЫК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Калі гаварыць пра ўзровень беспрацоўя, у Рудзенску ён невысокі: на ўліку стаіць усяго 9 чалавек. Як правіла, гэта асобы, хворыя на алкагалізм, і гультаі, якія проста не маюць жадання працаваць.

— У нас ёсць жанчына, якая адмаўляецца ад любой работы, якую б ёй ні прапаноўвалі, — расказвае Вольга Васільеўна. — Ёй толькі 50 гадоў, яна не інвалід, не пенсіянерка, але месца прыбіральшчыцы на хлебазаводзе ці ў школе, паводле яе слоў, не падыходзіць ёй з-за дрэннага здароўя. У жанчыны чацвёра дзяцей, але ўсе яны ўжо дарослыя. Сын у стане алкагольнага ап'янення курыў у ложку і падпаліў матчыну кватэру. Гэта было два гады таму. Пасялковы выканкам выдаткаваў ім 200 тыс. рублёў матэрыяльнай дапамогі, знайшоў часовае падменнае жыллё... Цяпер сын у турме. Старэйшая дачка замужам за прадпрымальнікам, другая жыве з сужыцелем. Сама маці не працуе. Грошай на рамонт у яе няма, і яна бясконца абрывае тэлефон у выканкаме — «адрамантуйце кватэру!» Чырвоны Крыж прадаставіў ёй гуманітарную дапамогу — адзенне, але яна нічога не ўзяла. Навошта, калі яна апранаецца лепш, чым многія?

Што датычыцца няўдалых сем'яў, адкуль дзяцей забралі ў інтэрнаты, — мы знаходзім бацькам працоўныя месцы. Грошы на ўтрыманне сваіх дзяцей дзяржава яны выплачваюць... На самай справе, той, хто хоча працаваць, знойдзе сабе працоўнае месца, і не адно: ці ў самім Рудзенску, ці ў Мінску — адсюль 40 хвілін на электрычцы.

Жыллёвае пытанне

Чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў у Рудзенскім пасялковым выканкаме складаецца са 145 чалавек. Людзі чакаюць, калі вызваліцца што-небудзь з фонду выканкама (гэта прыкладна 1 кватэра ў год). Сёлета ў чарзе намеціцца сур'ёзны прарыў — у цэнтры Рудзенска з'явяцца два шматпавярховыя дамы на 32 кватэры кожны. Ужо створаны жыллёва-будаўнічы кааператыў, адведзены ўчасткі зямлі, работы распачнуцца вясной.

— Чаргі на атрыманне ўчастка ў пад індывідуальнае будаўніцтва ў нас увогуле няма, — тлумачыць Вольга Васільеўна. — Напрыклад, у вёсцы Рог усе ўчасткі ўжо размеркаваныя. Прапануем зямлю ў вёсцы Варшаўка, але там няма газапровада. У Анітове балоцістая глеба, затое ёсць вада, электрычнасць і магчымасць падвесці ў хату газ. Шмат ахвотнікаў пабудавацца непасрэдна ў Рудзенску, аднак згодна з генпланам (ад 1987 года) усе землі, адведзеныя пад будаўніцтва індывідуальнага жылля, ужо размеркаваныя. Пасялковы выканкам сёлета збіраецца заказаць новы генплан, з улікам сённяшніх патрэб.

Не горш, чым у сталіцы

Адным з найбольш адметных месцаў Рудзенска, яго гонарам і бясспрэчным упрыгажэннем з'яўляецца рынак, хоць само слова не зусім дакладна характарызуе азначаны аб'ект цывілізаванага гандлю. Гэта, хутчэй, комплекс павільёнаў-боксаў, дзе ёсць усё: прадукты харчавання на любы густ, адзенне, цацкі, сродкі гігіены, будаўнічыя матэрыялы, фота-,тэле-, радыёапаратура, аўтазапчасткі, жывыя кветкі.

— У нас такі рынак, што не трэба і ў Мінск ехаць, — запэўніла Вольга Васільеўна. — Рынак працуе з 8.30 да 18.00 без выхадных. Грошы на будаўніцтва павільёнаў і добраўпарадкаванне тэрыторыі знайшоў мясцовы індывідуальны прадпрымальнік.

У пассажыр 7 стацыянарных магазінаў райпа. Тры вёскі (Востраў, Доўгі, Бор) пастаянна абслугоўваюцца аўталаўкамі, якія па дарозе заязджаюць і ў іншыя населеныя пункты. Напрыклад, у Варонічах ёсць свой магазін, аднак асартымент там сціплы, таму аўталаўка прывозіць многія тавары пад заказ. У вёсцы Бор усяго 4 двары, у Доўгім — 18. Стацыянарны магазін там быў бы нерэнтабельным. У Востраве каля 70 двароў, шмат моладзі, аднак яго размяшчэнне (за 1,5 км ад Рудзенска і за 1,5 км ад Дружнага) робяць і там адкрыццё свайго магазіна нерацыянальным. Моладзь атаварваецца ў буйных пасёлках, а патрэбы пенсіянераў задавальняе аўталаўка.

Балючыя пытанні

Жыць у Рудзенску, безумоўна, можна. Аднак пасёлак нездарма ўнесены ў Дзяржаўную комплексную праграму развіцця малых і сярэдніх гарадоў. Ёсць у Рудзенска праблемы, з якімі пакуль не атрымліваецца справіцца нават пры падтрымцы раёна і вобласці. І першая ў гэтым спісе — праблема з забеспячэннем чыстай вадой прыгараднай вёскі Рудзенск-2. Там няма водаправода, толькі шахтныя калодзежы, дзе яшчэ ў 2002 годзе была выяўлена высокая колькасць нітратаў і кішэчная палачка. Піць такую ваду нельга. «Мы звярталіся ў раён, у вобласць, але да гэтай пары грошай не знайшлі, — паведаміла старшыня. — Нам трэба пракласці 200 м водапровада да бліжэйшай вежы. На праектна-каштарысную дакументацыю, матэрыялы і саму работу патрэбна 115 млн рублёў».

Яшчэ адна сур'ёзная праблема — добраўпарадкаванне прывакзальнай плошчы. Яна месціцца ў самым цэнтры пасёлка, побач знаходзіцца дагледжаны крыты рынак, а сама плошча — у нездавальняючым стане. Тут разгружаюць вагоны, тут жа паркуюцца мікрааўтобусы і легкавушкі, няма ні пешаходных пераходаў, ні тратуара, ні клумбаў. «Разам з чыгуначнікамі мы правялі сумесную нараду, абазначылі, дзе чыя тэрыторыя, акрэслілі планы работ, — працягвае Вольга Васільеўна. — На тое, каб пакласці асфальт, зрабіць тратуары, паставіць лавачкі, крыты навес на аўтобусным прыпынку, патрэбна 90 млн рублёў».

Патрабуе гаспадарчай увагі парк ля Дома культуры, дзе часта праводзяцца святочныя мерапрыемствы. Рамонт сцэны і добраўпарадкаванне тэрыторыі плануецца правесці за сродкі мясцовых прадпрымальнікаў, аднак на сам праект выканкаму трэба знайсці 15 млн рублёў. Таксама неабходны рамонт фасадаў паліклінікі, Дома быту, выканкама. У нездавальняючым стане знаходзяцца ўнутрывясковыя дарогі (акрамя транзітных). Перадаць іх на баланс спецыялізаваных арганізацый, як прапісана ва Указе № 21, не атрымліваецца (дарожнікі супраціўляюцца), таму сёння 30,3 км нічыйных дарог — галаўны боль пасялковага выканкама.

— У 2007 годзе на добраўпарадкаванне ў наш бюджэт было закладзена 12 млн рублёў, — падсумоўвае старшыня. — Гэтых грошай хапіла на тое, каб прыбраць несанкцыянаваныя звалкі, навесці парадак на могілках, зрабіць ямачны рамонт і грэйдаванне асобных вуліц, спілаваць 57 аварыйных дрэў. Праблемы ў Рудзенску ёсць, і многія з іх датычацца добраўпарадкавання. Спадзяёмся, што ўлады, а таксама рэспубліканскія сродкі, закладзеныя пад рэалізацыю комплекснай праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадоў, дапамогуць нам іх вырашыць.

Інга МІНДАЛЁВА.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
Пухавіцкі раён.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

НІХТО НЕ ЛЮБІЦЬ СКАРГІ. А СКАРЖНІКАЎ?

На чарговай планёрцы ў Аршанскім райвыканкаме, дзе прысутнічалі старшыні сельскіх Саветаў, распачалі размову пра пастаянных скаржнікаў. Маўляў, ёсць некалькі чалавек у раёне, якія «загружаюць» скаргамі службы раёна і вобласці. Вось бы іх прыцягнуць да адказнасці за тое, што пішуць лухту.

Старшыня райвыканкама Уладзімір Дзедушкін на гэтыя рэплікі выказаўся так:

— Я выслухаў «штатную» скаржніцу, якая жыве на тэрыторыі Арэхаўскага сельсавета. Нічога незвычайнага ў яе скаргах няма, патрабуе тое, што трэба: піша пра недахопы ў абслугоўванні транспартам і пра кафэ. Так што не спяшайцеся з высновамі, паглядзіце, што можна зрабіць па гэтых скаргах.

Гэту заўвагу ён адрасаваў у першую чаргу старшыням сельскіх Саветаў.

Жанчына, якая напісала з дзесятак скаргаў, пагадзілася на сустрэчу. Прыехаўшы ў Арэхаўск, пазнаёмілася з сімпатычнай асобай сярэдніх гадоў. Яна адрэкамендавалася Наталляй Якубавай. Паведаміла, што закончыла ў свой час фінансава-эканамічны каледж, працавала поварам, прадаўцом, даглядчыцай жывёлы ў калгасе. На цяперашні момант — беспрацоўная. Расказала яна і пра тое, як атрымала статус «штатнай» скаржніцы.

Першую скаргу Наталля Якубава напісала, калі над яе аднапакаёвай кватэрай у трохпавярховым доме пачаў працякаць дах. Вядома, адразу звярнулася да ўласніка дома — праўлення калгаса «Маяк камуны». Адтуль адказалі, што трэба пачакаць, пакуль здадуць вялікую партыю жывёлы на мясакамбінат. Тады выдаткуюць крыху грошай на рамонт. Жанчына цярп-ліва чакала, а з даху ўсё больш капала на галаву. Урэшце не вытрымала, пайшла са скаргай па інстанцыях, у вобласць. Адтуль прыехала камісія і разам з раённымі службамі вызначыла: сапраўды трэба тэрмінова рамантаваць дах. І яго тут жа адрамантавалі. Прычым пайшло на той рамонт паўтрубкі руберойду і паўвядра бітуму. Жанчына пісала звароты па гэтай праблеме і абівала парогі розных начальнікаў на працягу года, а зрабілі рамонт за дзве гадзіны. Гэта быў не першы поспех на шляху скаржніцы.

Чарговая скарга — па тэлевізійнай антэне — пацягнула шмат разборак на розных узроўнях, і да гэтай пары поўнасцю не вырашана. А гісторыя такая.

Больш чым з дзесятак гадоў таму старшыня мясцовага калгаса прапанаваў жыхарам калгасных дамоў у пасёлку абзавесціся адной тэлевізійнай антэнай замест мноства на даху шматпавярховага дома. Ён слушна тады заўважыў: калі кожная сям'я ставіць асобную антэну, то на даху робіць шмат дзірак, а потым скардзяцца, што дах працякае. Жыльцы згадзіліся з такой заўвагай і купілі імпартную антэну, адну на ўсіх, якая прымала шмат праграм. Праўда, каштавала яна на той час дорага: з кожнай сям'і ў растэрміноўку вылічылі звыш мільёна беларускіх рублёў.

Ішоў час. Калгас перадаў жылыя дамы (а разам з імі і антэну) на баланс раённага ЖКГ. А ў ЖКГ наблыталі з разлікамі за абслугоўванне кабельнага тэлебачання з «Тэлеком-Гарант». Тыя ў сваю чаргу скасавалі дагавор з жыльцамі на абслугоўванне. Словам, жыльцы засталіся без віны вінаватыя. У іх нават самыя прывычныя праграмы тэлебачання пайшлі з трасянінай, і дзесьці каля года не паказваў канал «Расія». Наталлю Міхайлаўну і жыльцоў іншых дамоў мікрараёна льнозавода здзівіла ў гэтай гісторыі тое, што іх інтарэсы, плацельшчыкаў і кліентаў, праігнаравалі як ЖКГ, так і «Тэлеком-Гарант». Таму і пісалі скаргі.

Трэці скаржны этап наступіў тады, калі ў Арэхаўску даведаліся, што пасёлак у 2006 годзе пераўтворыцца ў аграгарадок.

Наталля прызнае: наглядзеўшыся па тэлебачанні і наслухаўшыся па радыё аб тым, як добра будуюцца аграгарадкі, жыхары рашылі, што ў іх таксама ўсе дарогі і вуліцы будуць заасфальтаваныя, пабудуюць дзіцячыя пляцоўкі, адрамантуюць дамы. Але праходзілі месяц за месяцам, а ў пасёлку відавочных зменаў па добраўпарадкаванні не адбывалася. Тады група жанчын-актывістак запатрабавалі план добраўпарадкавання пасёлка як аграгарадка, і ў канцы года напісалі скаргу ў Адміністрацыю Прэзідэнта: маўляў, план ёсць, а мала што робіцца.

Яны зрабілі акцэнт на наступных праблемах: не ўтвараюцца новыя рабочыя месцы, патрэбна станцыя абезжалезвання ў раёне льнозавода, недастаткова асветлены вуліцы, не рамантуюцца дарогі. Гэта пісьмо падпісалі 122 чалавекі. Ім хутка далі адказ з аблвыканкама, што ў асноўным асвятленне вуліц і стан дарог у Арэхаўску адпавядаюць сацыяльным стандартам.

Пасля такога адказу Наталля Якубава ад імя ўсіх жыхароў раёна льнозавода зноў напісала скаргу ў вобласць і Адміністрацыю Прэзідэнта, хадзіла і на сустрэчу з прадстаўнікамі розных службаў раёна, каб сказаць, што стандарты кіраўнікі і жыхары мікрараёна разумеюць па-рознаму.

— Нам не трэба святло праз кожныя сто метраў, — гаварыла яна. — Павесьце ліхтары каля магазіна, дзіцячага садка, на небяспечным павароце і па дарозе ад ільнозавода, бо жанчыны ходзяць гэтай дарогай з начной змены. А калі грошай у бюджэце на адпаведнае добраўпарадкаванне Арэхаўска як аграгарадка няма, то так і скажыце. Жыхары зразумеюць. І скардзіцца не будуць.

Пасля настойлівых пісьмаў у розныя інстанцыі частка патрабаванняў была выканана службамі раёна, але далёка не ўсе. Вядома, адкрыць новыя працоўныя месцы для жанчын, пабудаваць станцыю для ачысткі вады не так проста. Але не выканана і тое, што можна зрабіць.

Апошнія скаргі Наталля Міхайлаўна агучыла, запісаўшыся на прыём да старшыні Аршанскага райвыканкама Уладзіміра Дзедушкіна. Адна з іх датычылася падвозкі дзяцей у школу і дзіцячы садок і была хутка вырашана ўладамі. Другая ж скарга пакуль застаецца актуальнай для жыхароў пасёлка. І сутнасць яе вось у чым.

Неяк вечарам Наталля з мужам вырашылі адпачыць у мясцовым кафэ (ад райспажыўсаюза). Заказалі бутэльку сухога віна і каўбаскі. Садавіны ў кафэ не было. Давялося ісці ў магазін, каб прыдбаць апельсінаў. Потым аформілі стол на свой густ. Праўда, ён быў без сурвэтак, настольнік парэпаны, відэльцы і талеркі далёкія ад стандарта кафэ, дзе ўсё з нацэнкай, як вядома. Ды ўжо вырашылі не звяртаць на гэта ўвагі. Разлілі сухое віно ў аднаразовы посуд (толькі такі тут прапанавалі). А яны не вытрымалі такой нагрузкі і перакуліліся...

Наталля звярнулася да мясцовай улады з пытаннямі: чаму такое абслугоўванне ў кафэ, на рэканструкцыю якога патрачаны дзесяткі мільёнаў рублёў?

Чаму цэны тут, як у рэстаране, а сервіроўка сталоў, даруйце, як у забягалаўках?

Сапраўды, калі прааналізаваць скаргі Наталлі Якубавай, то заўважыш, што яе патрабаванні абгрунтаваныя. «Калі я на сваім рабочым месцы выконваю тое, што ад мяне патрабуюць і за што мне плацяць заробак, то чаму ў абслуговых інстанцыях і ва ўладных структурах не робяць гэтага, а заробак атрымліваюць», — гаворыць Наталля. Спасылацца на малы заробак і адсутнасць грошай, на яе погляд, таксама нельга. Трэба шукаць шляхі, каб зрабіць тое, што запланавана, альбо планаваць па сродках.

Так што Якубава ў дадзеным выпадку, відаць, той чалавек, які актывізуе мясцовую ўладу на дзеянні ў інтарэсах мясцовых жыхароў.

Вольга ШУТАВА.

ПЕЧ НЕ ТОЛЬКІ САГРАВАЕ...

У вясковай хаце печ — галоўны атрыбут і гаспадаркі, і ўтульнасці. Але з часам печ, бывае, разбураецца ў асобных месцах і тады становіцца небяспечнай. Патрэбны тэрміновы рамонт, з якім можа справіцца толькі спецыяліст — пячнік. Цяпер такіх умельцаў усё менш становіцца па вёсках, яны ёсць, як правіла, у штатах раённых службаў бытавога абслугоўвання або камунальнай гаспадаркі.

Праўда, не ўсе вяскоўцы ведаюць, адкуль можна выклікаць дапамогу сваёй печы. Але адрасы падкажуць у сельсаветах. Рамонт печы абыйдзецца ў пэўную суму ў залежнасці ад таго, які аб'ём работы спатрэбіцца правесці. А вось адзінокім, састарэлым людзям, ветэранам вайны, інвалідам печы як і электраправодку ўжо амаль дзесяцігоддзе рамантуюць бясплатна. Грошы выдзяляюцца па спецыяльнай дзяржаўнай праграме.

І ўсё ж кожны год у статыстыцы гібелі людзей на пажарах ёсць і такі радок: да пажару прывяла няспраўнасць печы і парушэнне правілаў яе эксплуатацыі. Сёлета па гэтай прычыне ў агні загінула шэсць вясковаў хаце печ — галоўны атрыбут і гаспадаркі, і ўтульнасці. Але з часам печ, бывае, разбураецца ў асобных месцах і тады становіцца небяспечнай. Патрэбны тэрміновы рамонт, з якім можа справіцца толькі спецыяліст — пячнік. Цяпер такіх умельцаў усё менш становіцца па вёсках, яны ёсць, як правіла, у штатах раённых службаў бытавога абслугоўвання або камунальнай гаспадаркі.

Як расказала карэспандэнту «МС» сакратар Чарнаўчыцкага сельскага Савета Аляксандра Бурда, у мінулым годзе за дзяржаўны кошт адрамантаваны печы траім састарэлым грамадзянам. Аляксандра Васільеўна падкрэсліла, што менавіта з «інвентарызацыі» патрэб і праблем пажальных адзінокіх вяскоўцаў і тых, якія засталіся адны ў хаце, пачынаецца год у сельсавеце. Іх наведваюць старшыня, работнікі сельвыканкама, складаюць спісы, на падставе якіх і фарміруецца праграма на год. У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Брэсцкага раёна дапоўнілі, што за мінулы год па раёну было адрамантавана 47 печаў за дзяржаўны кошт. Гэтым займаюцца спецыялісты арганізацыі «Брэстрайбытсэрвіс», у штаце якіх цяпер ёсць і пячнікі. Дачакаўся такога спецыяліста і ветэран вайны са Знаменкі Якаў Емяльянавіч Навумік. Печ яму як след адрамантавалі, прачысцілі дымаход. Цяпер дзядуля можа грэцца, а таксама нешта прыгатаваць у печы. Усяго ў вёсках Знаменскага сельсавета печы наладзілі ў сямі гаспадароў. У Дамачаўскім — адрамантавалі чатыры печы.

У Івацэвіцкім раёне, напрыклад, на рамонт печаў летась было выдзелена 40 мільёнаў рублёў. У Целяханах пячнікі ЖКГ рамантавалі печы не толькі састарэлым, адзінокім, ветэранам вайны, але і шматдзетнай сям'і Дубешка. Як расказаў супрацоўнік райаддзела па надзвычайных сітуацыях Валерый Молаш, за год у ходзе праверак заўвагі па эксплуатацыі печаў атрымалі 8,6 тысячы гаспадароў раёна. 7,9 тысячы становішча выправілі, астатнія па-ранейшаму знаходзяцца на кантролі пажарнага нагляду і мясцовых сельсаветаў. Валерый Молаш падкрэсліў, што грошы з бюджэту на рамонт печаў і электраправодкі найперш выдзяляюцца старым адзінокім грамадзянам, пра астатніх пенсіянераў павінны не забываць клапаціцца дзеці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЛЕПШАЯ МАГІЛЁЎСКАЯ МІКРАЗОНА

У абласным цэнтры падвялі вынікі спаборніцтва сярод арганаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання за 2007 год. Пераможцамі спаборніцтва, акрамя мікразоны № 1, сталі вулічныя камітэты — № 3 Кастрычніцкага раёна (вуліца і завулкі Цютчава), № 26 Ленінскага раёна (вуліца Падгорная) і яшчэ два дамавыя камітэты. Старшыні савета мікразоны і камітэтаў атрымаюць грашовыя прэміі ў 10 базавых велічынь.

Увогуле ў Магілёве цяпер дзейнічаюць 23 мікразоны, 95 вулічных і 42 дамавыя камітэты. У іх на грамадскіх пачатках працуе амаль тысяча чалавек. Яшчэ ў горадзе больш за 5 тысяч старшых па дамах і пад'ездах.

— Галоўнае, што грамадскае самакіраванне выхоўвае ў людзей пачуццё дачынення да жыцця горада і адказнасці за тое месца, дзе яны жывуць, — расказаў старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Валерый Свістуноў.

Ілона ІВАНОВА.

СЕЛЬСАВЕТЫ, БЯРЫЦЕСЯ ЗА ПАДАТКІ!

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Андрэйчанка падчас паседжання заклікаў кіраўнікоў сельскіх і пасялковых Саветаў актыўна выкарыстоўваць новыя магчымасці для папаўнення сваіх бюджэтаў.

— Трэба, каб сельскія Саветы былі больш зацікаўленыя ў адкрыцці і развіцці вытворчасцяў на сваіх тэрыторыях, актывізацыі гандлю, — адзначыў кіраўнік абласной выканаўчай улады. — Пачынаючы з гэтага года, 30 працэнтаў падаходнага падатку застаюцца на месцах, а раней 100 працэнтаў пералічваліся ў раённыя бюджэты. І 20 працэнтаў падаткаў з продажаў, атрыманых на тэрыторыях, таксама пойдуць у бюджэты сельсаветаў...

На думку старшыні аблвыканкама, на месцах трэба праяўляць ініцыятыву: зацікавіць дзелавых людзей, дапамагчы ў стварэнні рабочых месцаў, у вырашэнні вытворчых праблем.

— Калі людзі будуць больш зарабляць, адпаведна пачнуць купляць больш тавараў, спажываць больш паслуг. У выніку больш падаткаў будзе і ў сельсаветах, — канстатаваў губернатар.

Кіраўнікам райвыканкамаў загадана палепшыць дзейнасць па закупу малака ў насельніцтва.

— І хопіць рабіць спасылкі на розныя цяжкасці ў такой рабоце! — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — На жаль, калі параўнаць адпаведныя паказчыкі па раёнах, убачыш, што некаторыя адносяцца да стабільных аўтсайдараў са значным адставаннем.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПЕРАВЫХАВАННЕ БАЦЬКОЎ: ДАСЯГНУЦЬ НЕДАСЯГАЛЬНАГА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Згодна з дэкрэтам, мы павінны прапанаваць дадзенай катэгорыі бацькоў такую работу, якая дазволіла б штомесяц вяртаць грошы, затрачаныя на ўтрыманне іх дзіцяці ў тым жа сацыяльным прытулку, — кажа **Галіна ФІЛАТАВА, намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Шаркаўшчынскага райвыканкама.** — Гаворка ідзе мінімум пра 126 тысяч на адно дзіця. Больш за тое, самім абавязаным павінна застацца 30 працэнтаў ад зароблена. Але ж нашы абавязаныя — сельскія жыхары, і там, дзе яны пражываюць, няма адпаведнай заработнай платы.

Зімой, дарэчы, на Шаркаўшчыне — у асноўным адны «мужчынскія» вакансіі, а сярод абавязаных асобаў — пераважна жанчыны. Раённыя ўлады вырашылі заахвоціць іх на грамадскія работы: сёння, напрыклад, траіх накіравалі на расчыстку фермы. Адзін бацька заявіў, што не мае патрэбы ў «паслугах» цэнтра занятасці, паколькі хоча расплаціцца з дзяржавай самастойна. Некалькі чалавек хоць і дайшлі да цэнтра занятасці, але тут жа былі зняты з уліку, паколькі выбылі за межы раёна. Ёсць сярод бацькоў такія, хто адкрыта заяўляе: садзіце мяне ў турму, я працаваць не буду. Але ёсць і станоўчыя прыклады. Адной тутэйшай маці не так даўно вярнулі дваіх дзяцей з прытулку, — цяпер яны наведваюць садок, паколькі тая працуе на паляводстве. Калі і далей будзе добра працаваць, перавядуць у даяркі.

Сярод 59 уладкаваных на работу па Дэкрэту № 18 у Пружанскім раёне Брэсцкай вобласці 40 чалавек падпарадкаваліся рашэнню суда і 19 — пастановам Камісіі па справах непаўналетніх. А звярнуліся ў цэнтр занятасці 65 чалавек.

— У нас даволі высокі працэнт уладкавання на работу абавязаных асобаў, — тлумачыць **Алена КУДРЭЙКА, намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Пружанскага райвыканкама.** — Створаны каардынацыйны савет па рабоце ў дадзеным накірунку. Сярод іншых мерапрыемстваў былі праведзены і растлумачальныя семінары для наймальнікаў. Аблвыканкам вызначыў 50 прадпрыемстваў нашага раёна для ўладкавання абавязаных асобаў, практычна на ўсе мы накіравалі гэтых людзей...

Большасць бацькоў павінны вяртаць дзяржаве сумы ў памеры да 200 тысяч рублёў штомесяц, некаторыя — да 400 тысяч і 3 чалавекі — звыш 400 тысяч. Падабрацъ работу з адпаведнымі заробкамі для тых, хто фактычна не мае ні прафесіі, ні вопыту работы, а часам і жаданя працаваць — вельмі складана і ў гэтым раёне, але спробы ажыццяўляюцца.

На пачатку мінулага года ў Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці суд вынес 103 пастановы на 105 бацькоў, а напрыканцы года — ужо 130 на 136. Тут лічаць, што вынік, які хочацца атрымаць, амаль недасягальны, і прыкладаюць неабходныя намаганні для рэалізацыі дэкрэта.

Сёння ў раёне працуе 98 чалавек, 8 зняты з уліку па прычыне смерці або знаходжання на лячэнні, 10 чалавек уладкоўваюцца і 20 — не дастаўленыя па розных прычынах. Працуюць тутэйшыя бацькі на 43 прадпрыемствах і ў гаспадарках. Зразумела, наймальнікі стогнуць, але адмовіцца ад абавязаных асобаў не могуць. Самая складаная сітуацыя — у СВК «Ціхінічы», дзе працуе 11 чалавек.

32 чалавекі ходзяць на работу нерэгулярна і не могуць кампенсаваць сваю запазычанасць, паколькі зарабляюць мізэрныя грошы. Сярэдні заробак па раёне — 515 тысяч рублёў, але гора-бацькі нават не набліжаюцца да такой сумы.

— Калі шчыра, то, безумоўна, хочацца ўсклікнуць: пра якую работу, якую сумленнасць можна гаварыць, калі людзі, якіх мы прымусова ўладкоўваем, у прынцыпе страцілі чалавечае аблічча — не займаюцца выхаваннем уласных дзяцей?! — кажа **Валянціна КРАЎЧАНКА, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Рагачоўскага райвыканкама.** — Ёсць у нас бацькі, якія нармальна працуюць, да іх няма ніякіх нараканяў, але гэта, вядома ж, выключэнне. Думаю, у кожным раёне ёсць «героі», якія хоць і выйдуць на работу, але нап'юцца там і толькі шкоды наробяць. Быў такі выпадак: уключыў выпівоха не тое, што трэба і спаліў абсталяванне...

16 дзяцей з 6 сем'яў, галоўным чынам, у маці-адзіночак, былі адабраныя па Дэкрэту № 18 на працягу мінулага года ў Воранаўскім раёне Гродзенскай вобласці. Усе бацькі ўладкаваныя на работу ў гаспадаркі, дзе атрымліваюць літаральна капейкі. У лепшым выпадку — ад 100 да 200 тысяч рублёў.

— Належную суму штомесяц не выплачвае ніхто, але яны будуць плаціць да таго часу, пакуль поўнасцю не кампенсуюць усё, што павінны, — расказвае **Жана ХАЛЕЦКАЯ, намеснік старшыні Камісіі па справах непаўналетніх Воранаўскага райвыканкама.** — Ёсць, безумоўна, выпадкі вяртання дзяцей у сям'ю, але ёсць і маці, пазбаўленая бацькоўскіх правоў у дачыненні да пяцярох дзяцей!..

У Чавускім раёне Магілёўскай вобласці вызначаны 35 арганізацый для працаўладкавання «цяжкіх» бацькоў. А такіх пакуль 42. Усе працуюць. У асноўным, у жылкамгасе, Чавускім ільнозаводзе, СВК калгас «Антонаўскі». 22 чалавекі з ліку абавязаных зарабляюць да 200 тысяч рублёў, 18 — ад 200 да 400 тысяч і двое — звыш 400 тысяч.

— У нас узбуджана дзве крымінальныя справы па арт. 174 Крымінальнага кодэкса, — тлумачыць **Алег САЛАЎЁЎ, участковы інспектар г. Чавусы.** — Асуджаныя атрымалі пакаранне ў выглядзе папраўчых работ за нявыплату грашовых сродкаў на дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні. На працягу трох месяцаў цэнтр занятасці даваў гэтым бацькам накіраванні на розныя працоўныя месцы, але тыя так і не прыступілі да выканання сваіх абавязкаў...

Разам з тым у Чавускім раёне пяць чалавек поўнасцю кампенсавалі сваю запазычанасць перад дзяржавай за знаходжанне дзяцей у сацыяльным прытулку. Адну маці аднавілі ў бацькоўскіх правах.

Для асобаў, у дачыненні да якіх выносяцца судовыя пастановы, у Старадарожскім раёне Мінскай вобласці забраніраваны 90 месцаў. На пастаянную работу ўладкаваныя 44 з 46 чалавек, якім былі выдадзены накіраванні. У некаторых тутэйшых сельскагаспадарчых кааператывах працуюць па 3—4 чалавекі, і для гаспадаркі гэта, зразумела, — ярмо. Працэнт кампенсацыі бацькоўскіх запазычанасцяў перад дзяржавай — 40,5, і наўрад ці ён можа быць большым. Скажам, адна жанчына павінна выплачваць штомесяц каля 700 тысяч рублёў, — няцяжка падлічыць, якім павінен быць яе заробак.

— Тое, што нам удаецца вярнуць хоць бы 40 працэнтаў ад патрэбнай сумы, — гэта ўжо, я лічу, нядрэнна, але ж працаваць ёсць над чым, — канстатуе **Валянціна ЧУМІЛА, намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Старадарожскага райвыканкама, загадчыца сектара занятасці.** — Усім зразумела, аб якой складанай праблеме ідзе гаворка. Якія толькі захады мы не робім у дачыненні да выпівох — распісваем у раённай газеце, вывешваем іх прозвішчы — ім усё роўна. Адной нашай маці 31 год. Двое дзяцей ужо адабраныя, яна нарадзіла трэцяе. Пагражаем адбіраннем. Яна л'е «кракадзілавыя» слёзы, просіць, каб мы не рабілі гэтага. А праз некалькі гадзін мы бачым яе п'янай, — зноў забылася на дзіця...

...Кажуць, дарогу асіліць той, хто ідзе. Напэўна, гэты выраз можна прымяніць і да тэмы Дэкрэта № 18. Наўрад ці можна пазбавіць грамадства ад алкаголікаў — людзей з адсутнасцю адукацыі, матывацыі да працы і беззаконных паводзінамі. Значыць тым, хто з'яўляецца поўнай процілегласцю гэтаму партрэту, нічога не застаецца, як працаваць, і над чужымі памылкамі таксама.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А.,
старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

САСОНКА М. П.,
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СЯЛІЦКІ В. С.,
старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў;

СІВАКОЎ В. А.,
старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І.,
старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292 21 03.

СВАЯ СПРАВА
481
БІЗНЭС, ЭКАНОМІКА, ФІНАНСЫ
Выпуск № 2 (13)
16 студзеня
2008 года

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

«Прадпрымальнікі азнаёмлены з правіламі гульні. Ніякіх змяненняў тут пакуль не прадбачыцца»

З Нясвіжа патэлефанавала жанчына — індывідуальны прадпрымальнік (прозвішча ў рэдакцыі маецца).

— У мяне ўсяго адзін гандлёвы павільён. Скажыце, як з выручкай у 4—5 мільёнаў у месяц (менавіта агульнай выручкай, а не прыбыткам, які складае не больш за 30 працэнтаў ад гэтай сумы) арганізаваць прыватнае ўнітарнае прадпрыемства? Як наняць бухгалтара, як яму плаціць і што пасля гэтага застанецца? — пыталася заяўніца. — Раней у мяне быў прадавец і ўсё было добра. Цяпер прадаўцоў нас пазбавілі і самой даводзіцца і гандляваць, і ездзіць у банк, вырашаць пытанні з санстанцыяй і інш. А яшчэ ж ёсць сям'я, дзеці. Магчыма, плануюцца нейкія змяненні ў зараз існуючы парадак, у прыватнасці, можа зноў бы дазволілі, як і раней, браць на працу хоць бы аднаго прадаўца?

Як расказала далей заяўніца, раней прадаўцом у яе працавала 20-гадовая дзяўчына, круглая сірата. Была задаволена, а зараз засталася без працы... «Яны з сяброўкай разам скончылі курсы, і тая ўладкавалася ў магазін, дзе праз некалькі месяцаў выявілі нястачу грошай. Дык маці сяброўкі мусіла прадаць карову, каб яе пакрыць. А каб мая сірата ў такую сітуацыю трапіла, хто б за яе грошы знайшоў? Вядома, колішніх прадаўцоў накіроўваюць у цэнтр занятасці, але якія ў нашым горадзе могуць быць вакансіі?..»

Паводле слоў **начальніка ўпраўлення прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама Аляксандра КАЛІНОЎСКАГА** і **начальніка аддзела рэгістрацыі, ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання Мінаблвыканкама Валянціны САЗОНАВАЙ,** ніякіх змяненняў, пра якія згадвае-пытаецца наша чытачка, у бліжэйшай перспектыве не чакаецца. «Да ведама прадпрымальнікаў даведзена ўся патрэбная інфармацыя, яны цудоўна ведаюць правілы гульні. Калі ласка, няхай ваша заяўніца звяртаецца да нас — зарэгіструем прыватнае ўнітарнае прадпрыемства», — заўважыла Валянціна Фёдараўна. «У чалавека ёсць выбар: або працаваць самастойна, або, калі не падабаецца па нейкіх прычынах, арганізаваць юрыдычную асобу, пайсці на ўзбуйненне бізнэсу, аб'яднацца з іншымі ўнітарнымі прадпрыемствамі, наняць работнікаў», — дадаў Аляксандр Аляксандравіч. Ён жа нагадаў, што па пытаннях працаўладкавання трэба найперш звяртацца ў службы занятасці. «Толькі па Мінску 17 тысяч вакансій, да прыкладу».

Як удакладніла **галоўны спецыяліст аддзела занятасці ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Нясвіжскага райвыканкама Інеса КІПЕЦЬ,** дзяўчына — колішні прадавец, які сірата, мае першачарговае права на працаўладкаванне пры звароце ў службу занятасці.

— У якасці беспрацоўнай яна мае права на атрыманне дапамогі ў дзве базавыя велічыні ў месяц. Як сірата зноў жа можа атрымаць і адрасную сацыяльную дапамогу, — патлумачыла Інеса Алегаўна.

Калі гаварыць канкрэтна пра вакансіі прадаўцоў, на сёння 11 чалавек гатова прыняць на працу раённае спажывецкае таварыства, яшчэ два могуць працаўладкавацца ў КУП «Магазін № 3». Аклад работнікаў у спажывецкім таварыстве — 300 тысяч рублёў. «Гэта больш, чым адлюстроўвалі раней індывідуальныя прадпрымальнікі па сваіх паперах. Згодна з імі, прадаўцы заробленае пераважна па 200 тысяч у месяц, максімум — 213 тысяч рублёў» — дадала Інеса Кіпець.

Акрамя таго, ахвотнікі могуць прайсці перападрыхтоўку, напрыклад, паехаць у Мінск на курсы повараў. Такія работнікі будуць абавязкова запатрабаваны ў турыстычным цэнтры «Нясвіж». У маі можна будзе пайсці на курсы аператараў кацельняў. «Гэта даволі чыстая праца, таму сярод ахвотнікаў шмат жанчын. Ды і аклад мяркуецца на ўзроўні 400 тысяч рублёў».

На заканчэнне Інеса Алегаўна адказала, што на сёння па дапамогу ў працаўладкаванні ўжо звярнулася каля 15 чалавек — тых самых колішніх прадаўцоў, якія страцілі працоўныя месцы ў сувязі са зменамі ў гандлёвых аб'ектах.

P. S. Калі матэрыял рыхтаваўся да друку, мы яшчэ раз звязаліся з нашай заяўніцай, выклалі вышэйагучаную інфармацыю. «...Як хадзілі ў мой павільён тыя, умоўна кажучы, 15—20 чалавек у месяц, так яны і будуць хадзіць надалей, прыносячы роўна столькі ж прыбытку. Ад змены літар — як канкрэтна будзе называцца маё прадпрыемства — сутнасць сітуацыі, на мой погляд, не зменіцца. І наконт вакансій для дзяўчыны-прадаўца мы ўжо высвятлялі. За падказку пра магчымую адрасную дапамогу для яе дзякуй. Але вы ўсё роўна напішыце аб нашых праблемах. Магчыма, нейкія змяненні ўсё ж з цягам часу будуць прыняты?..»

Сяргей РАСОЛЬКА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Галоўная ўмова — поўны тыдзень

З канца студзеня ў Беларусі будуць дзейнічаць новыя правілы прадстаўлення права на скарочаную працягласць працоўнага часу для работнікаў, якія занятыя ў шкодных ці небяспечных умовах.

Як паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, сам спіс вытворчасцяў, прафесій і пасадаў, работа па якіх дае права на скарачэнне працоўнага часу, застаецца без змяненняў. Разам з тым тут з'явілася новая ўмова — скарочаны рэжым будзе датычыцца толькі тых асобаў, якія занятыя ў шкодных ці небяспечных умовах поўны працоўны дзень.

Сяргей ГРЫБ.

Шапкі з сабачага футра

прапануюць неўзабаве пакупніку вытворцы на Брэстчыне. На звераферму СВК «Батчы» Кобрынскага раёна завезлі для развядзення янотападобных сабак. Да гэтага тут гадаваліся толькі пясцы. Футра янотападобных сабак, паводле слоў спецыялістаў, на рынку запатрабаванае больш, чым пясцовае. Да таго ж прыезджы звер — неперабораліві ў ежы.

Яна СВЕТАВА.

ПЯЦЬ ГАЛОНАЎ ДЛЯ КАРАЛЯ

Прыватнікі з Дзяржынска стварылі вытворчасць еўрапейскага ўзроўню

Не сакрэт, што знайсці работу ў невялікіх гарадах і пасёлках бывае складаней, чым у буйных населеных пунктах. У гэтых абставінах, мабыць, вялікую перспектыву мае развіццё прыватнага сектара, дзе магчыма забяспечыць занятасць пэўнай колькасці людзей. Прычым такія прапановы становяцца даволі запатрабаванымі на рынку працоўнай сілы з-за высокіх заробкаў і магчымасці кар'ернага росту. У гэтым, прынамсі, пераконвае вопыт аднаго з дзяржынскіх прадпрыемстваў.

Вытворчасць чыстай пітной вады мае вялікую гісторыю — першыя такія прадпрымальнікі напрыканцы XIX стагоддзя развозілі вялікія бутэлькі са сваёй прадукцыяй на драбінах. З цягам часу карысны вопыт шырока распаўсюдзіўся ва ўсім свеце, у Расіі адпаведны бізнэс актыўна развіваецца з пачатку 1990-х гадоў. У нас гэты рынак доўга заставаўся «вакантным». Між тым, быў попыт на такога роду прадукцыю, які, відавочна, заставаўся незадаволеным, што заўважылі прыватнікі і пачалі ствараць вартую прапанову. На мяжы тысячагоддзяў, у 2000-м, пітную ваду фурамі вазілі ў Беларусь і тут яе рэалізоўвалі. Разыходзілася прадукцыя даволі хутка, таму і вырашылі прадпрымальныя людзі стварыць такую вытворчасць, што называецца, «на месцы». Так е 2003 годзе ў Дзяржынску з'явілася вытворча-гандлёвае прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Свет вады».

— Дакладна вывучылі расійскі вопыт, сур'ёзна даследавалі айчынны рынак і зразумелі, што такая дзейнасць мае вялікую перспектыву, — кажа камерцыйны дырэктар прадпрыемства Віталь Козыраў. — Зразумела, была пэўная доля рызыкі, паколькі пачынаць уласную справу давялося літаральна «з нуля». Склалі грунтоўны бізнэс-план і накіраваліся ў ААТ «ААБ Беларусбанк», дзе аформілі дагавор лізінгу — такім чынам набылі першае абсталяванне.

Арандаванае памяшканне (раней яно належала фірме, якая не здолела ўтрымацца і абанкруцілася), дагавор з банкам і шэраг ідэй — такі атрымаўся «старт». За нябыт пяць гадоў «Свет вады» стаў у сваім сегменце рынку даволі вядомым брэндам, якому аддаюць перавагу дзесяткі тысяч спажыўцоў у розных кутках Беларусі. У прамым сэнсе гэтага слова яны даязджаюць да кожнага — цяпер пастаўкі наладжаны ў больш чым два дзесяткі гарадоў, прычым ахоплены і такія аддаленыя рэгіёны, як, да прыкладу, Драгічын. І што, напэўна, самае галоўнае — у Дзяржынску з'явілася новая, самая сучасная вытворчасць.

Калі манціравалі самае сучаснае абсталяванне, то запрасілі самых «прасунутых» спецыялістаў з Санкт-Пецярбурга. Дарэчы, «мозг вытворчасці» (блок адваротнага осмасу) мае кітайскую прапіску — машына вельмі надзейная і амаль утрая танней за амерыканскія аналагі. Асноўная мэта — атрымаць сапраўды чыстую ваду. На самай справе гэта вельмі складаная і адказная задача, паколькі прадукцыя павінна быць высакаякаснай, інакш можна адразу і назаўсёды згубіць рэпутацыю і страціць свае пазіцыі на рынку.

— Прыватнік у шэрагу выпадкаў «дапаўняе» дзяржаўны сектар, развіваючы тыя накірункі, дзе буйным вытворцам цяжка разгарнуцца, — лічыць Віталь Козыраў. — Так і ў нашым выпадку: трэба было пачынаць апрацоўваць практычна не асвоены рынак, даказваць людзям перавагі прадукцыі. Тут патрэбны час, гібкасць, мабільнасць, аператыўнасць.

Цяпер прадпрыемства «Свет вады» надзейна займае і развівае сваю рынкавую нішу — яно з'яўляецца вытворцам чыстай пітной вады так званай глыбокай ачысткі пад брэндам, які да многага абавязвае, — «Каралеўская». У патрэбнай канцэнтрацыі яна ўзбагачана мінеральнымі рэчывамі, з дабаўкамі ёду, фтору і селену. Дарэчы, ачыстка выконваецца па ўсіх сусветных стандартах, дзякуючы чаму захоўваецца ўвесь прыродны склад мінералаў. Ёсць і даволі цікавая «фішка» — дадаткова вада ўзбагачана іонамі серабра. Паводле заключэнняў экспертаў, такую прадукцыю можна ўжываць усім, незалежна ад узросту. Атрымліваецца, гэта сапраўды карысна, бо «Каралеўскую» пастаўляюць у шэраг дзіцячых садкоў і школ, а таксама ў санаторыі і бальніцы.

Кантроль якасці заўсёды на ўзроўні — ёсць уласная лабараторыя, якая адсочвае сітуацыю ў «рэжыме рэальнага часу». Акрамя таго, прадукцыю рэгулярна правяраюць спецыялісты Дзяржынскага раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Спажыванне пітной вады ў бутэльках — сусветны вопыт, які сапраўды варты пераймання. Як вядома, для многіх населеных пунктаў Беларусі актуальная праблема належнай якасці вады, ці не ў першую чаргу з-за павышанага ўтрымання жалеза. Будаваць станцыі ачысткі даволі затратна, таму не ўсюды магчыма забяспечыць пастаўку жыхарам сапраўды чыстай вады. Нездарма існуе нават адпаведная дзяржаўная праграма, у межах якой імкнуцца вырашыць надзённую праблему. Паколькі даўно даказана, што менавіта вада аказвае вялікі ўплыў на стан арганізма чалавека. Аб гэтым многія сёння задумваюцца.

Зразумела, можна змагацца за якасць вады з дапамогай бытавога фільтра. Аднак, як заўважыў Віталь Козыраў, у такім разе ўдаса затрымаць толькі буйныя часцінкі, а шкодныя прымесі і тую ж хлорку выдаліць не атрымаецца. За кошт сучаснага абсталявання на прадпрыемстве адразу «выключаецца» жалеза (установлена спецыяльная станцыя абезжалезвання), пасля вада праходзіць яшчэ шэсць (!) ступеняў ачысткі. Вядома, што за такую прадукцыю перад спажыўцамі не будзе соромна. Падчас выкарыстання вады вытворчасці дзяржынскага прадпрыемства не ўтвараецца накіпу. Асноўнымі яе спажыўцамі цяпер з'яўляюцца юрыдычныя асобы, прасцей кажучы, калектыўныя спажыўцы — прадпрыемствы, банкі, фірмы і г.д. На долю «офіснай» вады прыпадае каля 70 працэнтаў агульнага аб'ёму. «На дом» яе заказваюць менш, аднак гэты сегмент апошнім часам таксама актывізаваўся. Заказваюць ваду не толькі гараджане (самым вялікім рынкам з'яўляецца сталічны), але і вяскоўцы. Даволі актыўныя спажыўцы — фермерскія гаспадаркі, набываюць яе і пенсіянеры. А што, даволі выгадна атрымліваецца: 19-літровая бутэлька гарантавана чыстай і карыснай вады (каля пяці галонаў па амерыканскіх мерках) каштуе 8,5 тысячы рублёў. Прычым у гэты цэннік уваходзіць і дастаўка прама ў кватэру, незалежна ад таго, на якім паверсе яна знаходзіцца і ці працуе ліфт. У краме ж пяцілітровая бутэлька «важыць» ад 2,5 да 3,5 тысячы рублёў. Зразумела чаму варыянты, якія прапануе «Свет вады», карыстаюцца вялікай папулярнасцю і кола спажыўцоў такой прадукцыі стабільна пашыраецца.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Адпаведна растуць і аб'ёмы выпуску прадукцыі. Напрыканцы мінулага года пачалося будаўніцтва другога ўчастка ў Фаніпалі. Прычым тут створана нават больш дасканалая вытворчасць, чым у Дзяржынску (вядома, за гэтыя некалькі гадоў прагрэс не стаяў на месцы. — **М.Л.**) — з дапамогай самай сучаснай тэхнікі спецыялісты толькі ажыццяўляюць кіраванне працэсам, усе функцыі выконваюць непасрэдна машыны. Сапраўды захапляльнае відовішча, скажу я вам! Лізінг на набыццё найноўшай тэхнікі «Свет вады» афармляў, вядома, у сваіх надзейных партнёраў — у ААТ «ААБ Беларусбанк».

Цікава, што і спецыяльную бутэльку і корак для пітной вады таксама вырабляюць у Дзяржынску. Як з усмешкай заўважыў Віталь Козыраў, цэлая водная карпарацыя атрымліваецца. «Свет вады» таксама забяспечвае спажыўцоў неабходным абсталяваннем для спажывання вады (прадпрыемства з'яўляецца яго першым імпарцёрам у Беларусі), тут прапануюць самы шырокі выбар мадэляў адпаведных апаратаў — кулераў. Заказаць усё неабходнае кожны можа як па тэлефоне, так і праз Інтэрнэт.

Калектыў прадпрыемства налічвае каля 60 чалавек. Усё гэта — новыя працоўныя месцы, створаныя на працягу апошніх некалькіх гадоў. Сярэдні ўзрост работнікаў — крыху больш чым 30 гадоў, цяжкучкі кадраў увогуле няма, паколькі кожны разумее, што знайсці такое перспектыўнае месца будзе даволі цяжка. А прыватнае прадпрыемства мае вялікі прэстыж.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Дзяржынскі раён.

АБ АСНОЎНЫХ НАКІРУНКАХ УДАСКАНАЛЬВАННЯ РЭГУЛЯВАННЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў 2007 ГОДЗЕ

Урадам Рэспублікі Беларусь працягвалася работа па рэгуляванні прадпрымальніцкай сферы, у тым ліку ў рамках зацверджанага па даручэнні Кіраўніка дзяржавы сумеснага плана дзеянняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

У мэтах прыцягнення ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца, 27 лютага 2007 г. прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 108 «Аб некаторых мерах па прыцягненні ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца», згодна з якім прадугледжана прыцягненне ў абарот такой маёмасці, размешчанай на тэрыторыі сельскіх саветаў, пасёлкаў гарадскога тыпу, гарадоў раённага падпарадкавання і іншых населеных пунктаў, шляхам:

продажу на аўкцыёнах з устанаўленнем пачатковай цаны продажу, роўнай адной базавай велічыні;

перадачы ў бязвыплатнае карыстанне індывідуальных прадпрымальнікаў і недзяржаўных юрыдычных асобаў;

бязвыплатнай перадачы ва ўласнасць індывідуальных прадпрымальнікаў і недзяржаўных юрыдычных асобаў пад канкрэтныя інвестыцыйныя праекты на тэрмін рэалізацыі гэтых праектаў.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 2007 г. № 264 зацверджана Праграма дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь на 2007 год, накіраваная на стымуляванне развіцця прадпрымальніцкага сектара эканомікі праз удасканальванне нарматыўнай прававой базы, якая рэгулюе прадпрымальніцкую дзейнасць; аказанне фінансава-крэдытнай падтрымкі суб'ектам малога прадпрымальніцтва для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў; развіццё механізмаў вытворчай кааперацыі суб'ектаў малога прадпрымальніцтва з буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі, накіраваных на павышэнне канкурэнтаздольнасці малых прадпрыемстваў, іх вытворчага і інавацыйнага патэнцыялу.

Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Указ ад 9 сакавіка 2007 г. № 119 «Аб спрошчанай сістэме падаткаабкладання», у адпаведнасці з якім:

права на прымяненне спрошчанай сістэмы прадастаўляецца камерцыйным арганізацыям з сярэдняй колькасцю работнікаў да 100 чалавек (раней гранічная колькасць работнікаў складала не больш як 15 чалавек);

камерцыйныя арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў да 15 чалавек вызваляюцца ад вядзення бухгалтарскага ўліку, для іх таксама спрашчаецца статыстычная справаздачнасць.

Варта адзначыць, што ў адпаведнасці з гэтым указам паніжаныя стаўкі падатку past спрошчанай сістэме падаткаабкладання прадугледжаны толькі для арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў з месцам знаходжання (жыхарства) у сельскіх населеных пунктах, пераўтвораных у аграгарадкі, і ў асобных пасёлках гарадскога тыпу і гарадах раённага падпарадкавання з колькасцю насельніцтва да 50 тыс. чалавек.

Згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 497 «Аб асобных пытаннях прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання і аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2007 г. № 119» арганізацыі з сярэдняй колькасцю работнікаў, якая не перавышае 5 чалавек, і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія займаюцца рознічным гандлем і (або) аказваюць паслугі грамадскага харчавання, маюць права выкарыстоўваць у якасці падатковай базы валавы даход пры прымяненні спрошчанай сістэмы падаткаабкладання.

У Дзяржаўнай праграме інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 2007 г. № 136, прадугледжаны меры па развіцці малога і сярэдняга інавацыйнага прадпрымальніцтва ў рэгіёнах, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях, стварэнні суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры, прыцягненні арганізацый малога і сярэдняга прадпрымальніцтва да ўдзелу ў мэтавых навукова-тэхнічных праграмах і інавацыйных праектах.

У рамках Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007—2010 гады, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2007 г. № 265, прадугледжаны меры, накіраваныя на падтрымку суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці ў малых і сярэдніх гарадах і сельскіх населеных пунктах, якія ўключаюць:

вызваленне арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія знаходзяцца (пражываюць) у сельскіх населеных пунктах, ад выплаты асобных відаў падатку, а таксама мытных пошлін на тэхналагічнае абсталяванне, камплектуючыя і запасныя часткі да яго, якія ўвозяцца на мытную тэрыторыю Рэспублікі Беларусь;

прамы продаж маёмасных комплексаў дзяржаўных арганізацый у памеры 20 працэнтаў ад іх ацэначнага кошту, канкрэтным юрыдычным асобам пад інвестыцыйныя праекты.

Прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2007 г. № 266 «Аб унясенні дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 2006 г. № 182 і ад 5 мая 2006 г. № 296» дазволіла аказваць фінансавую падтрымку суб'ектам малога прадпрымальніцтва за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у рамках праграм дзяржаўнай падтрымкі малога прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь у выглядзе бюджэтнай пазыкі, частковай кампенсацыі расходаў па выплаце працэнтаў за карыстанне банкаўскімі крэдытамі, частковай кампенсацыі расходаў па выплаце лізінгавых плацяжоў без абавязковага ўтварэння (павелічэння) долі дзяржавы ў статутным фондзе ўказаных суб'ектаў.

Найбольш значным вынікам з'явілася спрашчэнне парадку ажыццяўлення дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі адміністрацыйных працэдур у дачыненні да юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў. Прынята пастанова Урада ад 27 жніўня 2007 г. № 1102 «Аб мерах па спрашчэнні адміністрацыйных працэдур, якія ажыццяўляюцца ў дачыненні да юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў», якая вызначыла агульныя паняцці і асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, асноўныя крытэрыі спрашчэння адміністрацыйных працэдур, а таксама пастановы Урада, якія зацвердзілі поўныя пералікі адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі, падпарадкаванымі Ураду, у канкрэтных сферах праваадносінаў.

У выніку праведзенай работы з агульнай колькасці адміністрацыйных працэдур (па выніках інвентарызацыі — 901) адменены 58, спрошчаны шляхам аб'яднання 20 працэдур, па 158 працэдурах скарочаны пералік дакументаў, якія падаюцца для іх ажыццяўлення, скарочаны тэрміны ажыццяўлення па 125.

Праведзена работа па стварэнні спрыяльных умоў для пераходу індывідуальных прадпрымальнікаў у прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы з мінімальнымі часовымі і фінансавымі затратамі. Нормамі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 чэрвеня 2007 г. № 302 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку стварэння індывідуальным прадпрымальнікам прыватнага ўнітарнага прадпрыемства і яго дзейнасці» прадугледжана:

прымяненне заяўнага прынцыпу дзяржаўнай рэгістрацыі і прынцыпу «аднаго акна»;

спрашчэнне парадку ажыццяўлення іншых адміністрацыйных працэдур у дачыненні да прыватных унітарных прадпрыемстваў, што ствараюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі;

вызваленне індывідуальных прадпрымальнікаў ад выплаты збораў, пошлін за натарыяльнае сведчанне копіі статута і іншых плацяжоў;

вызваленне прыватных унітарных прадпрыемстваў ад выплаты шэрагу плацяжоў за ажыццяўленне рэгістрацыйных і іншых працэдур на этапе іх стварэння.

У адпаведнасці з нормамі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 кастрычніка 2007 г. № 496 «Аб удасканальванні парадку стварэння індывідуальнымі прадпрымальнікамі прыватных унітарных прадпрыемстваў і іх дзейнасці» дадаткова вырашаны шэраг пытанняў, звязаных са стварэннем прыватных унітарных прадпрыемстваў. У іх ліку пытанні спрашчэння вядзення прыватным унітарным прадпрыемствам касавых аперацый, перадачы тавараў індывідуальнага прадпрымальніка ў статутны фонд і пагашэння запазычанасці па плацяжах у Фонд сацыяльнай абароны і інш.

Да 1 студзеня 2009 г. для прыватных унітарных прадпрыемстваў захаваны парадак выдачы сертыфікатаў адпаведнасці і гігіенічных пасведчанняў як для індывідуальных прадпрымальнікаў (загад Дзяржстандарта ад 17 жніўня 2007 г. № 161; распараджэнне Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь ад 12 верасня 2007 г. № 60).

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 кастрычніка 2007 г. № 1255 урэгулявана пытанне аб аплаце камунальных паслуг уласнікам жылога памяшкання, які выкарыстоўвае яго для месцазнаходжання прыватнага ўнітарнага прадпрыемства (на працягу года прымяняюцца тарыфы, устаноўленыя для насельніцтва).

Прадастаўлена права прыватным унітарным прадпрыемствам пацвярджаць мытны кошт тавараў, якія паходзяць з трэціх краін і ўвозяцца з Расійскай Федэрацыі, у спрошчаным парадку як для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль таварамі, увезенымі з Расійскай Федэрацыі (пастанова Дзяржаўнага мытнага камітэта ад 14 снежня 2007 г. № 133).

Вынікам праведзенай работы з'явіўся пераход да ажыццяўлення дзейнасці ў форме прыватнага ўнітарнага прадпрыемства 17 працэнтаў індывідуальных прадпрымальнікаў з ліку тых, хто выкарыстоўвае працу наёмных работнікаў. Гэтымі прадпрымальнікамі пададзены заявы на рэгістрацыю 11 тысяч прыватных унітарных прадпрыемстваў. Назіраецца таксама рост колькасці ствараемых індывідуальнымі прадпрымальнікамі арганізацый у іншых арганізацыйных прававых формах, якія адрозніваюцца ад унітарнага прадпрыемства. Па выніках 2007 года іх колькасць склала больш як 5 тысяч.

У мэтах удасканальвання і спрашчэння працэдуры атрымання спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на ажыццяўленне асобных відаў дзейнасці з улікам практыкі рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 17 «Аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці» падпісаны Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 лістапада 2007 г. № 7 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 17», згодна з якім спрошчаны асобныя ліцэнзійныя працэдуры, скарочаны пералік дакументаў, якія падаюцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі для іх ажыццяўлення.

Падпісаны Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня № 8 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 1999 г. № 11», які прадугледжвае спрашчэнне працэдуры дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спынення дзейнасці) юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў, у тым ліку пераход на заяўны прынцып дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання, скарачэнне тэрмінаў дзяржаўнай рэгістрацыі, пераліку дакументаў, якія прадастаўляюцца.

У мэтах стварэння ў сельскай мясцовасці прывабных умоў для развіцця прадпрымальніцтва Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Дэкрэт ад 20 снежня 2007 г. № 9 «Аб асобных пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў», які прадугледжвае ў ліку іншых стымулюючых мераў вызваленне дзеючых і зноў стварэльных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў у сельскіх населеных пунктах ад выплаты шэрагу падаткаў і збораў, у тым ліку зніжэнне платы за атрыманне спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на працягу 2008—2012 гг., а таксама магчымасць атрымання банкаўскага крэдыту для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў у памеры, эквівалентным суме не больш як 20 000 еўра, без забеспячэння выканання абавязацельстваў паводле крэдытнага дагавора.

Для стварэння дадатковых умоў ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Указ ад 29 снежня 2007 г. № 685, які прадугледжвае прадаўжэнне тэрміну пераходу індывідуальных прадпрымальнікаў да дзейнасці ў форме прыватнага ўнітарнага прадпрыемства ў спрошчаным парадку да 1 сакавіка 2008 г. (без прадаўжэння тэрміну ўступлення ў сілу абмежавання па найму індывідуальным прадпрымальнікам толькі блізкіх сваякоў) і зніжэнне да 31 снежня 2009 г. у два разы памеру штрафаў за адміністрацыйныя правапарушэнні, якія могуць быць учыненыя ўнітарнымі прадпрыемствамі.

Інфармацыя падрыхтавана Міністэрствам эканомікі Беларусі.

Погляд

Водпуск у студзені

Пасля пераднавагодняга ажыятажу многія гандлёвыя пункты на рынках зачыніліся. Здавалася б, усё лагічна: заканчваюцца навагодніе святы, рэзка скарачаецца пакупніцкі попыт і гандлярам самы час крыху адпачыць. Так бывае штогод. Аднак не толькі па гэтай прычыне многія гродзенскія прадпрымальнікі ўзялі водпуск. Гэта сітуацыя, верагодна, самым непасрэдным чынам звязана і з новымі ўмовамі дзейнасці ІП, якія выкарыстоўвалі наёмную працу.

Паводле інфармацыі **старшыні савета прадпрымальнікаў, кіраўніка прафсаюзнай арганізацыі рынку «Карона» Юрыя ГАПАНОВІЧА,** многія пайшлі ў водпуск, а тыя індывідуальныя прадпрымальнікі, у каго маецца некалькі гандлёвых пунктаў, самі працуюць толькі з адным. Гэта звязана з тым, што дзейнасць ІП з 1 студзеня можа ажыццяўляцца толькі з прыцягненнем членаў сям'і і блізкіх сваякоў прадпрымальніка. У адваротным выпадку (асабіста Ю. Гапановіч, напрыклад, не можа ўзяць на працу сваіх пляменнікаў ці васьмідзесяцігадовых бацькоў) трэба заставацца ІП у адной асобе альбо трансфармавацца ў прыватнае ўнітарнае прадпрыемства.

Перайсці ў прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы сёння адносна лёгка могуць хіба што прадпрымальнікі, якія заняты ў сферы паслуг (напрыклад, у некаторых павільёнах рынку «Карона» рамантуюць адзенне) альбо купляюць тавар на тэрыторыі Беларусі. А вось тыя, хто займаецца прамысловай групай тавараў, што ўвозяцца з-за межаў нашай краіны (а іх большасць), апынуліся ў няпростай сітуацыі. Справа ў тым, што, у адрозненне ад ІП, статус юрыдычнай асобы абавязвае мець дакументы на ўсю прадукцыю, якая рэалізуецца на гандлёвых месцах. А дакументаў на тых жа расійскіх рынках, дзе гэты тавар набываецца, не даюць. Дзе ж іх узяць? І як, калі гэта немагчыма, стварыць прыватнае ўнітарнае прадпрыемства?

— Даводзіцца чуць, што прадпрымальніцтву, маўляў, трэба вырастаць з «кароткіх штонікаў» і цывілізавана развівацца. Аднак у сённяшняй сітуацыі менавіта такія прадпрымальнікі, якія гэта збіраліся рабіць, найбольш, на мой погляд, і пацярпелі, — лічыць Юрый Гапановіч. — ІП, які не збіраўся развіваць свой бізнэс, як быў, так і застаўся ў адной асобе. Тыя ж, хто хацеў развівацца, адчынялі новыя павільёны, магазіны, прыцягвалі наёмных работнікаў. У перспектыве, верагодна, яны і самі прынялі б рашэнне аб змене свайго статусу, інвеставалі зароблены сродкі ў нейкае МП...

Да мяне цяпер многія звяртаюцца па параду: што рабіць? Цяжка нешта параіць. Калі тавар набываецца ў Беларусі, то, мажліва, усё ж варта стварыць прыватнае ўнітарнае прадпрыемства. Калі ж гэта па вышэйпамянёнай прычыне немагчыма, то, бадай, давядзецца застацца самому ў адным гандлёвым пункце, а другі зачыніць. Але ў чым яшчэ тут праблема? Існуе рэжым працоўнага дня, якога павінен прытрымлівацца кожны прадпрымальнік. І калі гэты рэжым парушаецца і пункт продажу аказваецца зачыненым, то прадпрымальніка могуць пакараць, нават пазбавіць ліцэнзіі. А яму ж трэба і выручку ў банк здаваць, і падаткі плаціць, і гігіенічныя сертыфікаты атрымліваць. Як жа прадпрымальніку, будучы аднаму, выканаць усе гэтыя працэдуры, не парушыўшы рэжым на сваім працоўным месцы?

Сёння многія, пайшоўшы ў водпуск, занялі пазіцыю чакання: а раптам нешта ўсё ж зменіцца?

А што чакае цяпер ужо былых наёмных работнікаў, якія працавалі ў індывідуальных прадпрымальнікаў? На рынку «Карона» гэта — 701 чалавек, 14 працэнтаў з якіх маюць сярэднюю, 64 — сярэднеспецыяльную (таваразнаўца, бухгалтар) і 22 працэнты — вышэйшую адукацыю (настаўнік, інжынер, эканаміст). Ці гатовыя мясцовыя органы ўлады і цэнтры занятасці аператыўна прадаставіць для гэтых людзей рабочыя месцы па іх спецыяльнасцях? Так, гарвыканкам давёў да шэрагу прадпрыемстваў горада заданне па працаўладкаванні грамадзян, вызваленых у сувязі са спыненнем працоўных дагавораў з індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Аднак праблема ў тым, што гэта датычыцца, як правіла, не мужчын (з іх працаўладкаваннем было б прасцей), а жанчын. Якому прадпрыемству, скажам, патрэбныя дзяўчаты без прафесіі, якія пасля заканчэння школы працавалі прадаўцамі?

Да **старшыні абласнога камітэта прафсаюза работнікаў розных формаў прадпрым

Краіна здароўя

Выпуск № 2 (58)

ПАЦАЛУНАК — БОЛЬШ ЗДАРОВАЕ ВІТАННЕ, ЧЫМ РУКАПАЦІСКАННЕ

Людзі, якія ў якасці вітання аддаюць перавагу пацалунку, а не рукапацісканню, схільныя да меншай рызыкі заразіцца грыпам або іншымі «зімовымі» інфекцыйнымі захворваннямі, сцвярджаюць вучоныя з Лонданскай школы гігіены і трапічнай медыцыны. Яны правялі даследаванне на гэту цікавую тэму, паведамляюць інфармацыйныя агенцтвы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

«Далоні чалавека, акрамя традыцыйнага — паветрана-кропельнага шляху, адыгрываюць важную ролю пры перадачы ўзбуджальнікаў такіх хваробаў, як грып, адэнавірусныя захворванні, якія лёгка перадаюцца ад чалавека чалавеку», — гаворыць аўтар праекта прафесар школы Салі Блумфілд. Вядучы брытанскі спецыяліст па грыпе прафесар Джон Оксфард прапагандуе яшчэ больш здаровы спосаб вітання. Ён прапаноўвае пры сустрэчы шырэй карыстацца так званым сацыяльным пацалункам, іншымі словамі, бескантактным, які распаўсюджаны, у прыватнасці, сярод палітыкаў і кіназорак. Верагоднасць заразіцца грыпам у дадзеным выпадку — мінімальная, тлумачыць вучоны.

Кар. БЕЛТА.

ЦІСК, НАВЕРХ!

Каб ціск узняўся да нормы, паспрабуйце любы з гэтых варыянтаў.

0,5 г аскарбінкі плюс 2 таблеткі экстракту зялёнага чаю; 25—30 кропель пантакрыну плюс 10—15 кропель араліі маньчжурскай; па 20—25 кропель настойкі леўзеі і радыёлы рожавай; шклянка вінаграднага соку плюс 30—35 кропель настойкі жэньшэню. Калі ў вас раніцай нізкі ціск, дапамогуць 25—30 кропель кардыяміну плюс 1 чайн. лыжка настойкі кітайскага лімонніку, а таксама таблетка гліцыну пад язык.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ЗАРАЗА...

У Светлагорскім судзе завяршылася слуханне крымінальнай справы па артыкуле 157 «Заражэнне вірусам імунадэфіцыту чалавека». Раённы суд прыгаварыў абвінавачваную да года пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Як паведамілі ў раённай судовай інстанцыі, 30-гадовая мясцовая жыхарка, раней тройчы судзімая, абвінавачвалася па частцы першай гэтага артыкула — «Заведамае пастаўленне іншай асобы ў небяспеку заражэння ВІЧ-інфекцыяй», які прадугледжвае адказнасць у выглядзе пакарання штрафам або пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў. З'яўляючыся інфіцыраванай з 2000 года, жанчына давала распіску аб крымінальнай адказнасці за распаўсюджванне захворвання. Тым не менш, аказвала інтымныя паслугі на светлагорскіх трасах. Паводле слоў абвінавачванай, яна не ведала, што ВІЧ-інфекцыя можа перадавацца і пры гетэрасэксуальных кантактах. У мужчыны, які ў крымінальным працэсе фігураваў у якасці пацярпелага, на дадзены момант адмоўныя вынікі аналізаў.

БЕЛТА.

ГАЛОЎНЫ КАПІТАЛ ЧАЛАВЕКА — ЯГО ЗДАРОЎЕ

Кожны беларус зможа раз у год прайсці прафілактычны агляд свайго арганізма

Паводле даных медыцынскай статыстыкі, на кожнага жыхара нашай краіны прыпадае штогод больш за 12,5 наведванняў паліклінік (без уліку арганізацый ведамаснай медыцыны). Гэта, трэба заўважыць, надзвычай высокі паказчык, які сведчыць, галоўным чынам, аб даступнасці для насельніцтва першаснай медыцынскай дапамогі (мы нават знаходзімся ў сусветных лідарах). Пры гэтым 83 працэнты ўсіх наведванняў урачоў першаснага звяна звязаны з аказаннем пацыентам лячэбнай дапамогі пры вострых захворваннях, пры абвастрэннях захворванняў, з выпісваннем даведак і рашэннем пытанняў непрацаздольнасці. І толькі 17 працэнтаў візітаў ажыццяўляюцца з прафілактычнымі мэтамі. Магчыма, менавіта па гэтай прычыне колькасць не пераходзіць у якасць, і беларусы сёння не могуць пахваліцца ні высокай працягласцю жыцця, ні моцным здароўем. Так, сярэдняя чаканая працягласць жыцця пры нараджэнні складае сёння для беларускіх мужчын 62,9 года і для жанчын — 75,1 года. Сярод прычын смяротнасці беларусаў лідзіруючыя пазіцыі займаюць захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, анкалагічныя, захворванні органаў дыхання і стрававання.

— Ні для кога не з'яўляецца вялікім сакрэтам, што ў пераважнай большасці беларусаў не сфарміравалася ўстойлівая патрэба беражліва ставіцца да свайго здароўя. Клопат большасці з нас праяўляецца пераважна ў выглядзе звароту па медыцынскую дапамогу пры з'яўленні сімптомаў нездароўя. У выніку чаго сістэма аховы здароўя мае справу з пацыентамі, у якіх ужо ёсць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Інакш кажучы, наша медыцына ідзе не напарадзе, а ззаду хваробы — такое месца ёй вызначыла грамадства, члены якога памылкова мяркуюць, што ўласнае здароўе не патрабуе сістэматычнага кантролю, — дзеліцца сваімі думкамі з журналістам «Звязды» **намеснік начальніка Упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла ЖЫЛЕВІЧ**. — Гэту негатыўную тэндэнцыю трэба ламаць. Менавіта таму напрыканцы 2007 года Міністэрствам аховы здароўя была зацверджана пастанова і падпісаны адпаведны загад аб арганізацыі дыспансэрнага назірання дарослага насельніцтва. Дзеці, як вядома, праходзяць дыспансэрныя агляды двойчы на год. З гэтай катэгорыяй пацыентаў медыкам працаваць значна прасцей. А вось як зацікавіць ва ўласным здароўі дарослых? Бо сёння ў нас далёка не ўсе мужчыны дажываюць да пенсійнага ўзросту. Гэта сапраўдная праблема. З дыспансэрызацыяй мы ўсе звязваем сур'ёзныя надзеі, паколькі гэты метад работы дазволіць нам працаваць на апераджэнне...

— У беларускім урадзе лічаць, што неабходна прыняць закон, які абавязаў бы беларусаў клапаціцца аб сваім здароўі...

— Мы прапануем ўвесці ў кантракты, якія наймальнікі заключаюць са сваімі работнікамі, пункт аб абавязковым штогадовым прафілактычным аглядзе і вельмі спадзяёмся на разуменне і падтрымку з боку Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Для краін заможа — гэта норма: чалавек, які абыкаваў да ўласнага здароўя, не цікавы для працадаўцы. Мы ж пакуль не маем эканамічных рычагоў, каб матываваць цікаўнасць людзей да свайго здароўя, таму будзем ўздзейнічаць на свядомасць беларусаў. Тым больш што 2008 год аб'яўлены Указам кіраўніка нашай дзяржавы Годам здароўя.

У аснову дыспансэрызацыі была пакладзена навуковая канцэпцыя папярэджання сардэчна-сасудзістых, анкалагічных і іншых захворванняў. У эканамічна развітых краінах Заходняй Еўропы, ЗША і Канадзе ўдалося дабіцца істотнага зніжэння смяротнасці пераважна за кошт змяншэння новых выпадкаў захворванняў, а не за кошт паляпшэння якасці лячэння хворых. У аснову прафілактычных мерапрыемстваў там было пакладзена зніжэнне распаўсюджанасці фактараў рызыкі неінфекцыйных захворванняў. Для прыкладу, у Фінляндыі 20-гадовае спажыванне насельніцтвам нізкакаларыйнай ежы прывяло да зніжэння захваральнасці на ішэмічную хваробу сэрца на 57 працэнтаў.

Сёння даказана, што курэнне, павышаны ўзровень халестэрыну, атлусценне, артэрыяльная гіпертэнзія, нізкая фізічная актыўнасць, парушэнні вугляводнага абмену з'яўляюцца агульнымі фактарамі рызыкі развіцця большасці хранічных захворванняў. Наша задача — выявіць людзей з рызыкоўным ладам жыцця. Пры правядзенні дыспансэрызацыі будуць выкарыстоўвацца не толькі традыцыйныя лабараторныя і дыягнастычныя метадыкі, але і сучасныя тэхналогіі скрынінгу і тэставага кантролю. Напрыклад, Еўрапейская сістэма Skore, прызначаная для вызначэння рызыкі развіцця ішэмічнай хваробы сэрца і сардэчна-сасудзістых ускладненняў. Расіяне, дарэчы, пайшлі шляхам аўтаматызаванага скрынінгу, калі пацыент запаўняе тэсты і на падставе яго адказаў машына робіць адпаведныя высновы. Мы таксама апрабавалі ў сябе гэту сістэму, але прыйшлі да высновы, што жывы кантакт доктара з пацыентам цяжка замяніць. Я не кажу, што мы ўвогуле не будзем уводзіць аўтаматызаваныя сістэмы, напрыклад, у нас ёсць цудоўная айчынная аўтаматызаваная сістэма вызначэння рызыкі развіцця вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту, і мы будзем іх таксама ўкараняць. Спадзяёмся распрацаваць і ўкараніць у бліжэйшы час пакет інфармацыйнай базы для правядзення дыспансэрных аглядаў і ажыццяўлення дыспансэрнага дынамічнага назірання. Але на сёння галоўнае — гэта кантакт медыцынскага работніка і пацыента.

Аб'ём даследаванняў будзе залежаць ад узроставай групы. Усе пацыенты будуць падзеленыя на тры групы: ад 18 да 29 гадоў, ад 30 да 39 гадоў і ад 40 гадоў і старэй. Мінімальны набор даследаванняў будзе ўключаць вымярэнне артэрыяльнага ціску, агульны аналіз крыві і мачы, флюараграфічнае даследаванне, для жанчын — агляд гінеколага і правядзенне анкетавання, падчас якога будуць вызначацца фактары рызыкі: індэкс масы цела, спадчыннасць і наяўнасць шкодных для здароўя звычак. Зразумела, што няма неабходнасці вызначаць узровень халестэрыну ва ўсіх 20-гадовых. Але калі пацыент паведамляе, што ўсе яго сваякі пакутуюць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, то доктар можа прызначыць яму больш глыбокае абследаванне. Калі, скажам, у сям'і многія церпяць ад цукровага дыябету, гэта таксама падстава для таго, каб прызначыць пацыенту дадатковыя даследаванні. Ва ўзроставай групе ад 30 да 39 гадоў узровень халестэрыну будзе вызначацца пры наяўнасці адпаведных паказанняў. У трэцюю групу ўваходзяць людзі ва ўзросце ад 40 гадоў: гэта менавіта той узрост, калі ў пераважнай большасці людзей ужо праяўляюцца ўзроставыя фізіялагічныя змяненні ў арганізме, хоць агульнавядома, што інфаркты і інсульты ўжо не рэдкасць і ў значна маладзейшых людзей. Таму ў трэцяй узроставай групе прадугледжана, напрыклад, вымярэнне ўнутрывочнага ціску, узроўню халестэрыну, утрымання глюкозы ў крыві, электракардыяграма, ацэнка рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў на бліжэйшыя 10 гадоў па табліцы Score, а для мужчын — уралагічнае абследаванне з мэтай прафілактыкі раку прастаты. Злосным курцам можа быць прызначана спіраграфія, каб даследаваць стан дыхальнай сістэмы. Адным словам, усё будзе вельмі індывідуальна, а я вам намалявала толькі агульны алгарытм прафілактычнага агляду.

На кожнага пацыента будзе заведзена спецыяльная карта дыспансэрызацыі, так званая карта здароўя. Пасля першаснай ацэнкі стану здароўя ўсе будуць размеркаваныя на тры групы. Першая група — гэта цалкам здаровыя людзі (іх назіранне можна будзе ажыццяўляць адзін раз у 2 гады). Другая — практычна здаровыя, але маюць пэўныя фактары рызыкі (яны будуць назірацца раз у год). Трэцяя група — гэта хранічныя хворыя, якія будуць пастаўленыя на ўлік ва ўчастковага ўрача ці ў больш «вузкага» спецыяліста. Сістэма дыспансэрнага назірання хранічных хворых у Беларусі ўжо добра наладжана.

Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне будзе.)

УПАКАВАЦЬ У ПЛАСТЫК ЦІ Ў ПАПЕРУ?

Кітай і Аўстралія маюць намер ужо ў гэтым годзе адмовіцца ад вытворчасці і выкарыстання ў супермаркетах тонкіх пластыкавых пакетаў. Паводле звестак інфармацыйных агенцтваў, такім чынам краіны збіраюцца спыніць далейшае забруджванне навакольнага асяроддзя і прадухіліць шкоднае ўздзеянне на прыроду.

Як адзначае начальнік спецыялізаванай інспекцыі дзяржаўнага кантролю за абарачэннем адходаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і абароны навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Сяргей КУЗЬМЯНКОЎ, з 2 лютага гэтага года ўступае ў сілу Закон Рэспублікі Беларусь «Аб абыходжанні з адходамі», паводле якога адным з асноўных прынцыпаў у галіне абыходжання з адходамі з'яўляецца прыярытэтнае выкарыстанне адходаў у дачыненні да іх абясшкоджвання ці захавання, забарона захаванняў другасных матэрыяльных рэсурсаў. Механізмамі рэалізацыі адпаведных нарматыўных дакументаў стануць раздзельны збор, дасартыроўка, будаўніцтва смещцеперапрацоўчых заводаў у буйных гарадах (у бліжэйшай будучыні плануецца ўзвесці шэсць такіх заводаў, чатыры ўжо будуецца, а дзейнічае пакуль толькі адзін). Мяркуецца, што такая перспектыва паспрыяе абароне навакольнага асяроддзя, вырашыць многія актуальныя праблемы, звязаныя з другасным выкарыстаннем адходаў.

Дарэчы, у некаторых развітых краінах, як вядома, дзейнічаюць яшчэ і законы аб упакоўцы. У нас перспектыва распрацоўкі такога дакумента пакуль не разглядаецца.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Суботняй раніцай на хакейнай каробцы ў гарадскім парку канькі рэжуць лёд, грукае шайба, маладыя шклоўцы падбадзёрваюць адзін аднаго крыкамі. Ідзе суровая мужчынская гульня — раённы хакейны турнір «Гарачы лёд», у якім бяруць удзел школьныя каманды.

Хакейная дружына школы № 1 Шклова: вучні 10 «А» і 10 «Б» класаў Мікалай РЫБАКОЎ, Дзяніс ПРАДАЛЯТЧАНКА, Сяргей ФІЛІМОНАЎ і Іван КЛІМОВІЧ.

ГАРАЧЫ ШКЛОЎСКІ ЛЁД

У Шклове адкрылі Год здароўя хакейнымі баталіямі і масавым катаннем на каньках

На лёд рыхтуецца выйсці 16-гадовы Сяргей Самсевіч. Не адрываючы вачэй ад гульні, ён паведамляе, што ў хакей гуляе даўно, мае сваю форму, канькі і клюшку — бацька фінансуе, таму што падтрымлівае захапленне сына.

— Мне падабаецца хакей за мужчынскасць, жорсткасць, азарт, барацьбу, — тлумачыць хлопец. — Я не куру: цыгарэты і хакей — рэчы несумяшчальныя. Значна большае задавальненне — забіць гол і перамагчы!

Гучней за ўсіх крычыць каля лядовай пляцоўкі настаўнік фізкультуры 1-ай школы Уладзімір Уладзіміравіч Клімовіч.

— Я іх вучу з першага класа, — паказвае ён на ігракоў. — Мае дзесяцікласнікі гуляюць ва ўсе спартыўныя гульні. Я і сам люблю гэтую справу. Хаджу са сваімі выхаванцамі ў паходы. А самі дзеці — малайцы, энтузіясты спорту.

Неўзабаве аб'яўлены перапынак, зайграла музыка. Каманда Клімовіча атрымала каштоўныя трэнерскія ўказанні, якія ўсе пачыналіся са слова «Сынкі...» Дзеці адпачываюць і фатаграфуюцца на памяць, а Уладзімір Уладзіміравіч расказвае пра сваё бачанне Года здароўя.

— Усё, што аб'яўлена для здароўя, абавязкова прынясе карысць, — упэўнены вопытны настаўнік фізкультуры. — Толькі ў мяне адно пажаданне: трэба больш забяспечваць школы спартыўным інвентаром. Ведаеце, людзі цягнуцца да фізкультуры і здаровага ладу жыцця. Апошнім часам пацягнуліся і тыя, хто ў школе не вучыцца. У нас адбою ад аматараў пазаймацца ў спартыўнай зале няма! Да 22.00 штодня працуе, ды яшчэ б і пазней займаліся спортам, калі б тэхнічкі не свярыліся. Што ж, і для людзей карысць, і для школы. Грошы мы зарабляем на гэтым сімвалічныя, але падлогу пафарбаваць хопіць... Зычу ўсім здароўя!

Ніка МІЛЬТА і Маша ДРАЗДОВА мараць пра фігурнае катанне.

У хакей у Шклове гуляюць не толькі школьнікі. Цяпер збіраюцца ў каманды мясцовыя мужыкі: яны бяруць удзел у таварыскіх гульнях з аматарамі хакея з раённых цэнтраў і аграгарадкоў вобласці, а таксама на грамадскіх пачатках займаюцца з малымі. Для дзіцячых камандаў у раёне набылі форму і канькі.

Увогуле ў гэтым сезоне, прызнаюцца ў аддзеле фізічнай культуры, спорту і турызму Шклоўскага райвыканкама, проста шалёны попыт на канькі. Верагодна, тут адбілася вялікая папулярнасць лядовых тэлевізійных шоў, але яшчэ болей — імкненне людзей бавіць вольны час з карысцю для здароўя.

Да нядаўняга часу паўсотні пар канькоў разыходзіліся на пракаце проста «са свістам». Таму цэнтру фізкультурна-аздараўленчай працы давялося набыць яшчэ 70 пар — ад 34-га да 45-га памераў.

Канькі — рэч нятанная, адна пара каштуе прыкладна 70—80 тысяч рублёў, што не кожны можа сабе дазволіць. А гадзіна пракату каштуе 2150 рублёў. Уваход на лёд — свабодны.

Увогуле ў Шклоўскім раёне сёння заліты 16 хакейных каробак і каткоў. У цэнтры Шклова ў каробцы «рубяцца» хакеісты, а непадалёк на лядовым полі вольна катаюцца дзеці і дарослыя.

— У мінулым сезоне на катку прыходзіла моладзь, а сёлета — людзі розных узростаў, — расказвае начальнік аддзела фізічнай культуры, спорту і турызму Сяргей Хмялькоў. — Цяпер на лёд выходзяць і людзі сярэдняга і старэйшага ўзросту, ад 35 да 50 гадоў. Прыходзяць сем'ямі. Усім хочацца паспрабаваць сябе ў хакеі, у фігурным катанні. У выхадныя дні і ўвечары на шклоўскіх катках не стае месца для ўсіх, хто хоча катацца.

Падлічана, што кожны шклоўскі каток штодня прымае ў сярэднім дзве сотні чалавек. Лёд пачалі заліваць слаямі яшчэ напярэдадні Новага года, таму зараз шклоўскім каткам не пагражае і адліга.

9-гадовыя сяброўкі Ніка Мільта і Маша Драздова адкрылі свой сезон — першым разам выйшлі на каток. Малыя часам падаюць, але з гэтага яшчэ больш весяляцца.

— Ой, катацца на каньках — гэта так цікава! — радуюцца дзяўчынкі. — Мы глядзелі па тэлевізары, як катаюцца «зоркі». Самім бы так хацелася. Вось бы вывучыцца і стаць сапраўднымі фігурысткамі!

— Што ж, у людзей вяртаецца любоў да спорту, — задаволена кажа Сяргей Хмялькоў. — І не толькі да спорту вялікага, але і да аматарскага, масавага. Людзі з задавальненнем катаюцца на каньках і лыжах, займаюцца фізкультурай. І ад гэтага маюць зусім іншы настрой. Бо кожнаму хочацца даўжэй жыць і менш хварэць. А за дарослымі цягнуцца дзеці. Год здароўя можа стаць знакавым для многіх людзей, якія перагледзяць сваё жыццё і зробяць выбар на карысць здаровага ладу.

Ілона ІВАНОВА.

Шклоўскі раён.

P.S. *У шклоўскім школьным турніры «Гарачы лёд» першае месца заняла хакейная каманда школы № 1. Віншуем і зычым новых спартыўных перамог!*

Траўмапункт

УСЁ ЗДАРЫЛАСЯ НЕЧАКАНА...

Зімовы сезон пачаў адлік сваіх першых ахвяраў. У навагоднія і калядныя дні на тэрыторыі рэспублікі было траўмавана каля 500 чалавек. І хоць гэта меней, чым у адпаведны перыяд мінулага года, усё ж траўмы ў структуры агульнай захваральнасці па-ранейшаму займаюць другое месца. І наступствы іх самыя сумныя. Чалавек пакутуе доўгі час. Напрыклад, пры пераломе галёнкі пацыент становіцца непрацаздольным мінімум на 4—5 месяцаў. Акрамя таго, калі несвоечасова аказаць дапамогу, няправільна лячыць, то вынікі могуць быць увогуле незваротнымі. 30 працэнтаў людзей пасля сур'ёзных траўмаў атрымліваюць групу інваліднасці. А гэта цягне за сабой вялікія эканамічныя страты.

— У першыя зімовыя месяцы, — адзначыў **намеснік дырэктара РПЦ траўматалогіі і артапедыі Сяргей ЗАРЭЦКІ**, — у асноўным людзі атрымлівалі ўдары, пераломы касцей (15 % выпадкаў), вывіхі (10 %). Пацярпелыя часцей за ўсё звяртаюцца па медыцынскую дапамогу з прычыны пераломаў прамянёвай косткі, шчыкалатак, ключыцы, траўмаў плечавой косткі, касцей галёнкі, пашкоджанняў звязачнага апарату, галёнкаступнёвага і каленнага суставаў.

У зімовы час траўмы касцей і суставаў атрымліваюць у дварах, на тратуарах, маставых. Гэта звязана з іх станам: калдобіны, ямы, непрыбраны зляжалы снег, галалёдзіца.

А вось няшчасных выпадкаў ад запуску петардаў, прылад, падобных на салюты, сёлета было зарэгістравана на дзіва мізэр: усяго 2 у адрозненне ад 18 леташніх.

На жаль, часцей за ўсё з прычыны траўмаў звяртаюцца людзі працаздольнага ўзросту. Іх было каля 80 працэнтаў, дзеці ва ўзросце да 15 гадоў склалі 2 працэнты, пацярпелыя, якім больш за 60, — каля 8 працэнтаў.

Умовы надвор'я сёлетняй зімы адрозніваюцца ад папярэдніх. Адсутнасць пастаяннага снежнага покрыва, частыя адлігі, галалёдзіца павялічылі колькасць пацярпелых у дарожна-транспартных здарэннях з прывычнага 1 працэнта да трох. Нягледзячы на тое, што пры нязначнай удзельнай вазе гэты тып траўматызму дае даволі высокі працэнт часовай непрацаздольнасці, інваліднасці, смяротнасці. Акрамя таго, расце смяротнасць асобаў нападпітку, якія трапілі ў ДТЗ. Сярод гэтага кантынгенту пешаходы і вадзіцелі прадстаўлены аднолькава.

Пры цяперашніх умовах надвор'я на аўтамабілі абавязкова павінна быць устаноўлена зімовая гума, кожнаму вадзіцелю варта выбіраць аптымальны хуткасны рэжым. Удзельнікам дарожнага руху рэкамендуецца абазнаваць сябе ў цёмны час сутак святлоадбівальнымі элементамі.

Дарэчы, апошняя рэкамендацыя набывае ўсё большую папулярнасць. На думку **намесніка начальніка ўпраўлення ДАІ МУС Яўгена КАРПОВІЧА**, менавіта актыўная прапаганда нашэння насельніцтвам флікераў прыносіць свой плён. У апошні час гэта відавочна, асабліва ў сельскай мясцовасці: больш за палову пешаходаў тут абазначаны святлоадбівальнымі элементамі.

Што рабіць, калі траўма ўсё ж здарылася?

Абавязкова звяртацца ў бліжэйшую медыцынскую ўстанову. Выклікаць хуткую дапамогу, калі не атрымаецца рухацца самастойна. Першую медыцынскую дапамогу могуць аказаць супрацоўнікі ДАІ або людзі, якія маюць первічныя навыкі такой дапамогі.

- **Пры вывіху.** Пашкоджанаму суставу або канечнасці трэба забяспечыць поўную нерухомасць. Для гэтага накладваюць фіксуючую павязку накшталт хусткі, руку можна прывязаць да тулава. Для змяншэння болю пацярпеламу ўнутр даюць таблетку анальгіну.
- **Пры пераломе.** Ні ў якім разе нельга самім правяраць рухомасць касцявых адросткаў, упраўляць іх, бо пры гэтым можна пашкодзіць мяккія тканкі, сасуды, нервы і прычыніць пацярпеламу дадатковы боль. Пры закрытым пераломе варта прыняць меры, каб спыніць далейшае змяшчэнне адломкаў, пры адкрытым пераломе найперш трэба спыніць кровацячэнне і накласці стэрыльную павязку.
- **Пры ўдарах**. Калі няма цяжкіх пашкоджанняў, трэба прыкласці да месца ўдару лёд, або ручнік, змочаны халоднай вадой.

Вольга ШАЎКО.

БАСЕЙН ЯК НОВЫ

Пасля капітальнага рамонту і рэканструкцыі ў Брэсце адкрыўся басейн «Нептун»

Адкрыццё зрабілі вясёлым і відовішчным. Дзед Мароз са Снягуркай віталі ўсіх прысутных. А Нептун з русалкамі каля вады сустракалі. Быў і сімвалічны ключ, які начальнік будаўнічага ўпраўлення будтрэста № 8 Мікалай Ярмак уручыў дырэктару новай установы. Будаўнікі справіліся з работай нават крыху раней, чым было намечана. Басейн зачынілі на рэканструкцыю яшчэ тры гады таму. Работа праведзена вялікая. На яе патрачана з гарадскога і абласнога бюджэтаў чатыры мільярды рублёў. І прама падчас адкрыцця ў новенькім 25-метровым басейне юныя спартсмены прадэманстравалі сваё ўменне. Глыбіня басейна можа быць ад 1,45 да 1,85 метра. Ён аснашчаны сучаснай сістэмай спуску і фільтрацыі вады. Скачковай ямы няма, таму водная арэна падыходзіць больш для аздараўляльных працэдур. За дзень такія працэдуры тут могуць прыняць да 500 чалавек. У новым басейне будуць трэніравацца выхаванцы дзвюх дзіцячых спартыўных школ. Абанементы на сямейныя і індывідуальныя заплывы прадавалі ўжо ў дзень адкрыцця. Тут ёсць таксама саўна і трэнажорная зала.

Гэта сёмы па ліку 25-метровы басейн у абласным цэнтры. «Штогод мы будуем новыя спартыўныя аб'екты і робім рэканструкцыю старых, — сказаў на адкрыцці басейна старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар. — За апошнія два гады адкрыта больш за 20 збудаванняў. Таму Брэстчына ўсё смялей прэтэндуе на тое, каб звацца спартыўнай вобласцю». Кіраўнік вобласці паведаміў прысутным, што вясной у Брэсце пачнецца ўзвядзенне Палаца водных відаў спорту па суседстве з Лядовым палацам і лёгкаатлетычным манежам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

УСЕ — СВАЕ



Сямейны псіхолаг Святлана Анішчанкава

Цудоўны час — святы, асабліва на Ражство і навагоднія. У паветры вітае лёгкая эйфарыя. Настрой прыўзняты без прычыны, неўсвядомлена людзі імкнуцца да цуду. І раптам цуд адбываецца: прыходзіш на працу, крыху затрымаўшыся, а табе насустрач начальнік з усмешкай на твары і прыемнымі словамі ў падтрымку. Арганізм злёгку азадачаны, але з задавальненнем прымае пазітыўнае, і дзень, так напружана пачаты, праходзіць у адчуванні гармоніі. На гэтым цуды не заканчваюцца. Калі больш уважліва прыгледзецца да звыклых твараў саслужыўцаў, можна выявіць цэлы шэраг, на першы погляд, нябачных, але абсалютна заканамерных асаблівасцяў: жанчыны павольна, але дакладна ажываюць і становяцца чараўніцамі, мужчыны — галантнымі кавалерамі. Вечарынкі не за гарамі...

Дарагая, каштоўная, ненавісная работа. Кожны дзень даводзіцца выконваць нейкія даручэнні, указанні, выслухоўваць нудныя нараканні, трывожыцца за прэмію. У святы ўсё мяняецца, людзі становяцца бліжэй адзін да аднаго, расслабляюцца, давяраюць, сімпатызуюць, тым самым ствараючы атмасферу камфорту.

Са з'яўленнем абавязковага атрыбуту зімовых святаў — ёлкі — на рабоце становіцца зусім як дома. У гэтыя прыемныя перадсвяточныя дні, поўныя мітусні і прыгатаванняў, пачынаеш па-новаму ўсведамляць магчымасць прыемных, паўнацэнных зносінаў на рабоце, эфектыўнага ўзаемадзеяння. Заўважаеш цёплыя адносіны да сябе людзей, успрымаеш іх як падарунак і з задавальненнем раздаеш падарункі сам.

Большую частку свайго ўсвядомленага, прадуктыўнага часу чалавек аддае рабоце, актыўна ўзаемадзейнічаючы ў соцыуме. Арганізм спрабуе рэалізаваць дадзеныя яму ад прыроды магчымасці. Важная задача, у спробах вырашыць якую знаходзіцца асноўная частка працаздольнага насельніцтва Зямлі. Слова «большая» азначае «асноўная», «важная», а значыць, якая складае сэнс жыцця чалавека, — прыярытэтная лінія, што вядзе да самаўсведамлення і самараскрыцця. Валодаючы такой важнасцю, работа патрабуе і забірае львіную долю фізічных сілаў і эмоцый. Па гэтай прычыне пазітыўны рух наперад, паўнацэннае развіццё і здароўе чалавека немагчымыя, калі гэта «большая частка» з'яўляецца, мала сказаць, непрыемнай — нежаданай абавязалаўкай. Баліць галава, сэрца, страўнік — гэта «званочкі» незадаволенага арганізма, які спрабуе зразумець, навошта чалавек сябе мучыць.

«Але якое выйсце?» — запытаецеся вы. Калі так цяжка знайсці добрую работу, ды і на сваёй неяк ужо прывык, усе — свае. Вось іменна: усе — свае. Гэта і ёсць выйсце. Начальнік, да якога ўжо прывык, адаптаваўся і ведаеш, на што і як ён будзе рэагаваць. Саслужыўцы, пра жыццё якіх ведаеш практычна ўсё. Родны кабінет, які стаў другім домам; стол, за якім засталіся гады працы. З кавалачкаў складваецца цэлы свет, у якім жывеш і стварае чалавек. З задавальненнем азірнуўшыся вакол, па-новаму, без асуджэння, без ацэнкі тых, хто цябе акружае, адкрываеш для сябе цудоўны ўласны свет, у якім знаходзішся, таму што глыбока ў душы разумееш: ты зрабіў правільны выбар, і час — гэтаму доказ. Начальнік аказваецца звычайным чалавекам са сваімі слабасцямі, праблемамі і трывогамі. Прыгледзеўшыся больш уважліва, разумееш, што яму таксама, як і любому іншаму, патрэбна падтрымка і адабрэнне. Выявіўшы гэты факт, усвядоміўшы ўсю звычайнасць і натуральнасць чалавека, пазбаўляеш яго ўлады над сабой. Сэрца ўжо не замірае ад трывогі і страху за дапушчаныя памылкі, недагляд, пачуццё вызвалення адпускае цябе на волю.

Саслужывец-канкурэнт, які заўжды спрабуе выскачыць са сваімі «геніяльнымі» ідэямі, аказваецца маленькім дзіцем, якога ў дзяцінстве не хвалілі, і ён імкнецца запоўніць прабелы, даказваючы, што ён лепшы. Ён таксама аказваецца звычайным чалавекам, які мае патрэбу ў падтрымцы, у тваёй падтрымцы. Бо гэта твой свет, твая работа — большая частка твайго жыцця, тваё задавальненне ад кожнага дня, які саслізгае ў месяцы і гады. Твой свет, у якім ты выбраў сабе начальнікаў, саслужыўцаў, сям'ю, прыдумаў сабе праблемы, паспяхова іх вырашыў, не захацеў убачыць штосьці важнае, дазволіў сёння быць у дрэнным настроі, спрабаваў падтрымаць «ворага».

Перастаючы супраціўляцца ўплыву тых, хто цябе акружае, чалавек сыходзіць з бегавой дарожкі і свабодна ідзе па сцяжынцы свайго жыцця. Кожны не толькі ў стане змяніць гэтае жыццё ў лепшы бок, але і ўнесці свой уклад у пераўтварэнне калектыву і грамадства.

Святы заканчваюцца як заўсёды хутка. Столькі мітусні, сілаў, часу пайшло на падрыхтоўку, і зноў — работа. Начальнік хмурыцца, саслужывец прарываецца... Усе крыху стомленыя, але ў душы задаволеныя цяплом, што засталося ад зносінаў, неабходным для таго, каб жыць і працаваць, сварыцца і мірыцца, крыўдзіцца і дараваць.

Чалавек, маючы ў сваім эмацыянальным арсенале ўвесь неабходны набор для добрага жыцця, часам не заўважае, якія багацці схаваліся ў яго ў душы, а карыстаецца распаўсюджанымі ў грамадстве ахоўнымі рэакцыямі.

Паспрабуйце аднойчы ўсміхацца цэлы дзень нягледзячы ні на што. Вы ўбачыце, як ваш стан паўплывае на тых, хто вас акружае.

Гэты маленькі эксперымент будзе не толькі падарункам да Новага года, для вашых калег, але і адчыніць дзверы ў душы такіх блізкіх і чужых саслужыўцаў — людзей, з якімі вы праводзіце большую частку жыцця.

Шчасця вашаму дому ў новым годзе!

КАПРЫЗЫ МОДЫ НА ІМЁНЫ

11 ліпеня 1924 года ў Магілёве ў сям'і Агрыпіны і Стэфана Бубновых нарадзілася дзяўчынка. Назвалі малую сімвалічным імем — Беларусь.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі было модна называць дзяцей Іскрай, Кімам, Аўрорай, Нарамінай, а таксама Маяй і зусім не пралетарскай Клеапатрай.

Называлі дзяцей і ў гонар правадыра рэвалюцыі У.І. Леніна. Мінула амаль стагоддзе, але і ў 2007 годзе ў Магілёва з'явіліся немаўляты Вілен і Уладлена.

У Магілёўскім аддзеле ЗАГС цяпер збіраюцца чэргі з бацькоў, якія атрымліваюць пасведчанні аб нараджэнні дзіцяці.

— Мы назвалі хлопчыка Раманам, таму што ў нашым радаводзе былі ўсе вядомыя імёны, а вось Рамана яшчэ не было, — паведаміў шчаслівы бацька.

— Мой сын будзе Маратам, таму што так захацеў яго бацька, — паведаміла дзяўчына.

— Мы з жонкай не спрачаліся: проста назвалі Андрэем, таму што падабаецца такое імя, — сказаў малады чалавек.

— А мая жонка захацела назваць сынам Багданам, — пахваліўся іншы бацька. — Хоць Багдан ужо не лічыцца рэдкім імем.

— А мая — Арсенем, — сказаў мужчына. — На мой погляд, вельмі добрае імя.

— А ў нас Марыя — у гонар бабулі, — усміхнулася маладая маці. — Хоць Машаў шмат, 3-е месца ў гарадскім рэйтынгу.

Сярод жаночых імёнаў найбольш распаўсюджаныя Дар'я, Настасся, Марыя і Ганна. Наступныя па папулярнасці Паліна, Лізавета, Ксенія, Вікторыя, Аляксандра і Валерыя.

Найбольш часта бацькі называюць хлопчыкаў Мікітам, Арцёмам, Іванам, Уладзіславам. Летась такія імёны атрымалі больш за сотню нованароджаных. Таксама вельмі папулярныя такія імёны, як Ягор, Данііл, Максім, Аляксандр, Дзмітрый, Ілля, Раман і Кірыл.

Хапае ў спісах дзяцей і экзатычных імёнаў: Заур, Ляон, Мікаэль, Марцініян, Ліяна, Алана, Ана, Мар'яна і Хадзіжа. Ёсць нават двайныя імёны: Сабрына-Скарлет альбо Рэгіна-Рагнеда.

Значная частка дзяцей, якія атрымалі неўласцівыя для Беларусі імёны, мае бацьку-замежніка: як, напрыклад, у Жазэфа, Арыяна ці Луны.

Альбо бацькі дзіцяці збіраюцца жыць у іншай краіне. У такіх выпадках даюць такое імя, з якім было б зручна жыць у замежжы. З гэтай прычыны, напрыклад, дзяўчынка атрымала імя Ніколь. Лукой назвалі хлопчыка бацькі, якія родам з Украіны — там такое імя распаўсюджанае.

Іншая частка незвычайных імёнаў — спадчына лацінаамерыканскіх серыялаў. Людзі захапляюцца героямі экранных рамантычных гісторый і вырашаюць даць іх імёны сваім дзецям. Так на свет у Магілёве з'явіліся Мэлані, Гуціера, Луіза і іншыя.

Вялікі ўплыў на папулярнасць імёнаў аказваюць і расійскія серыялы.

— Кіры цяпер пайшлі! — паведаміла пра наступствы серыяла «Не радзіся прыгожай» намеснік загадчыка Магілёўскага аддзела ЗАГС Таццяна Варанцова. — Летась мы зарэгістравалі аж 32 Кіры. А Кацярына — гэта імя, папулярнае ва ўсе часы — летась у Магілёве з'явілася 68 новых Кацюш, спадзяёмся — прыгожых і шчаслівых.

Многія бацькі хочуць назваць сваё дзіця арыгінальным імем, якое вылучаецца з шараговых: маўляў, няхай не як ва ўсіх. Напэўна, з гэтых прычын адну дзяўчынку назвалі імем Даная. Прычым магілёўская Даная мае абсалютна звычайнае для нашых шыротаў імя па бацьку і прозвішча. Сярод мужчынскіх імёнаў трапіліся Вільгем, Дамінік, Даніэль.

Несупадзенне экзатычных імёнаў са славянскімі прозвішчамі і імёнамі па бацьку, відаць, людзей не пужае. Напрыклад, Генрыетай назвалі дзяўчынку ў магілёўскай сям'і, дзе ўсе дзеці маюць незвычайныя рэдкія імёны.

А Рыанай будуць клікаць магіляўчанку, відаць, у гонар амерыканскай поп-зоркі, якая летась спявала пра парасон ледзь не з кожнага «праса».

А яшчэ ў мінулым годзе 13 дзяўчынак атрымалі імя Мілана і 2 хлопчыкі — Мілан. Можа таму, што іх бацькі — балельшчыкі вядомага італьянскага футбольнага клуба?

Найноўшая тэндэнцыя — адраджэнне старадаўніх, даўно забытых імёнаў. Напрыклад, Мелання ці Ярамір. Гэта, дарэчы, адны з самых рэдкіх імёнаў: у 2007 годзе толькі адзін хлопчык і адна дзяўчынка атрымалі іх.

Таксама летась у адным «асобніку» былі Усціння, Каліна, Любаміла, Ядзвіга, Яраслава, Севасцян, Святаслаў, Гардзей, Іларыён, Казімір, Нікан, Радамір. Крыху больш Елісеяў і Ігнатаў. Чакаецца, што хутка магілёўцы ўзгадаюць такое жаночае імя, як Пелагея — нездарма ж пісьменнік Б. Акунін пісаў пра кемлівую манашку.

Калі хочаце назваць хлопчыка рэдкім імем, то трэба, як гэта ні дзіўна, выбіраць такія вельмі звычайныя імёны як Васіль, Рыгор, Анатоль. Летась у Магілёве не з'явілася ніводнай новай Галі! Практычна зніклі звыклыя Светы, Лідзіі, Людмілы, Ніны, Таісіі і Аксаны. Папулярнымі за савецкім часам і нават знакавымі імёнамі — Вера, Надзея і Любоў — называюць толькі зрэдку.

За савецкім часам замежныя імёны былі рэдкасцю і нават выклікам грамадскаму меркаванню. А масавая звычка даваць сваім дзецям незвычайныя імёны, распавядаюць у ЗАГСе, у магілёўцаў выявілася толькі ў наш час. Гэта тлумачыцца пашырэннем інфармацыйных межаў: тэлебачанне і Інтэрнэт даюць большыя магчымасці для выбару імёнаў для немаўлят, чым сціплыя даведнікі мінулых часоў.

Добра ў ЗАГСе памятаюць, як яшчэ даўно ў Магілёве назвалі хлопчыка Жоржыкам. Цяпер, калі можна папросту сустрэць Элізабет Пятрову, гэта ўжо не сенсацыя. Але мужчына вымушаны быў змяніць імя, каб яго дзецям не выпала жыць з імем па бацьку Жоржыкавіч альбо Жоржыкаўна.

Таму супрацоўніцы ЗАГС, якія рэгіструюць дзяцей, пераконваюць бацькоў даваць такія імёны малым, якія потым не перашкаджалі б ім жыць. Напрыклад, адна маці не так даўно хацела назваць дачку Барбі. Ледзь угаварылі гэтага не рабіць: дзіця вырасце, а як даросламу чалавеку жыць з такім надта арыгінальным імем?

А іншыя бацькі настойвалі на тым, каб назваць дачку імем Таня. Менавіта Таня, а не Таццяна. Іх так і не пераканалі, хоць вопытныя супрацоўніцы ЗАГСа прадбачаць у будучым блытаніну ў дакументах.

— Карацей, выбар імя для дзіцяці — справа адказная, — зазначае Таццяна Варанцова. — Мы тут у ЗАГСе вывучылі шмат кніг наконт чалавечых імёнаў і пагадзіліся з высновай, што імя ўсё ж уплывае на лёс і характар чалавека. Так, доля праўды тут ёсць. Таму я раю бацькам не паддавацца модным павевам і ціску сваякоў, а выбраць для свайго дзіцяці такое імя, якое падказвае сэрца.

Ілона ІВАНОВА.

Літаратурная анкета «Звязды»



Алесь БАДАК, паэт:

1. Што, на ваш погляд, можна назваць падзеяй у літаратурным жыцці краіны 2007 года?

Несумненна, юбілеі Купалы і Коласа. Тыя шматлікія мерапрыемствы, прымеркаваныя да іх, не толькі лішні раз прадэманстравалі нашу павагу і любоў да народных песняроў, але і паказалі, што ў духоўным развіцці нацыі месца літаратуры незаменнае, а яе роля выключная. Аптымізму ў гэтым плане дадаў і той факт, што сёлета многія СМІ адгукнуліся на пяцідзесяцігадовы юбілей Леаніда Дранько-Майсюка. Я і не памятаю, калі апошні раз такая дата ў жыцці творчага чалавека прыцягвала да сябе павышаную цікавасць сродкаў масавай інфармацыі.

2. Што з напісанага за гэты год вы абазначылі б як асабістая творчая вяршыня?

Вызначаць, што творчая вяршыня, а што, наадварот, творчая няўдача — прэрагатыва крытыкі. І чытача. А вось калі гаварыць пра самае дарагое, то, напэўна, вы-дзеліў бы невялічкую аповесць «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца», надрукаваную ў часопісе «Маладосць», можа, таму, што крыху аўтабіяграфічная. Задумвалася яна як твор для падлеткаў, а сюжэт мусіў круціцца вакол канфлікту старшакласніка і маладой настаўніцы, чые дастаткова інтымнага характару **фатаздымкі**, знятыя ім на мабільнік, ён грозіўся выкласці ў Інтэрнэце. На той момант, калі я прыдумаў гэты сюжэтны ход, ён мне падаваўся дастаткова свежым, прынамсі, мабільнік меў далёка не кожны школьнік. Але час мяне апярэдзіў, і сёння падобны шантаж не здаецца нечым незвычайным. Давялося пачынаць усё спачатку, у выніку атрымалася аповесць не столькі для падлеткаў, колькі пра падлеткаў, пра што не шкадую.

3. Якой вам бачыцца будучыня беларускай літаратуры?

Светлай. Па-першае, таму, што ў кожным літаратурным пакаленні, з якіх чытач мае поўнае маральнае права спытаць за створанае, ёсць свае асобы, а ў кожнага з пакаленняў, якія сёння нясуць галоўную адказнасць за лёс літаратуры, — знакавыя асобы. Вось мы часам з трывогай гаворым пра тое, што адыходзяць карыфеі слова, народныя — паэты, празаікі. Маўляў, а што далей? А далей, дай Бог ім здароўя, тое, што і заўсёды. У новых пакаленняў чытачоў з'яўляюцца свае куміры. У новага часу — свае героі. Можа, яны не зусім такія, як папярэднікі. Але і час крыху іншы, і чытачы крыху іншыя. Таму і літаратура — таксама. Але, тым не менш, гэта цудоўная літаратура.

Па-другое, сёння беларускае прыгожае пісьменства паспяхова асвойвае тыя жанры, да якіх раней звярталася рэдка — фантастыку, дэтэктыў і г. д. Ужо не кажучы пра розныя (прынамсі, для сябе) літаратурныя накірункі. Што таксама дазваляе глядзець на яго будучыню з аптымізмам.

Кірмаш

штотыднёвы рэкламны выпуск №38 (569)

аддзел рэкламы 287-17-79

Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

■ Кватэра 2-пакаёвая ў Мінску па вул. Асіпенкі (пакоі асобныя, балкон, тэлефон), 83 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8 017 233 33 40, сотавы 325 67 07.

■ У цэнтры Мінска 2-пакаёвая кватэра, прыватызаваная, 1 паверх цаглянага дома, зроблены еўрарамонт, сігналізацыя, прыборы ўліку вады і газу, новыя газавая пліта, пральная машына.
Тэл. 8 017 248 71 36, 8 0212 62 85 24.

■ Дом 15 х 6, хлеў, летняя кухня, агарод 35 сотак, сад, склеп, калодзеж у в. Бабаевічы Клецкага раёна.
Тэл. 8 0292 57 57 50.

■ Дом жылы пад знос у в. Барацін Карэліцкага раёна.
Тэл. 8 029 783 82 61, 8 01596 35 424.

■ Кватэра 4-пакаёвая ў г. Узда (у двух узроўнях, 2 балконы).
Тэл. 8 01718 52 852.

■ Дом пад знос або летнік у Мядзельскім раёне.
Тэл. 8 01797 38 170.

■ Вялікі драўляны дом у в. Чабусы Любанскага раёна, маюцца г/п, сад, агарод 60 сотак, добрыя транспартныя зносіны.
Тэл. 8 01742 61 645.

■ Воз на гумавым хаду, збруя, плуг, сена, пральная машына «Волна» з цэнтрыфугай, мабільны тэлефон, буракі кармавыя.
Тэл. 8 01794 46 235.

■ Кватэра 1-пакаёвая ў 3-кватэрным доме ў г. Баранавічы. Маецца прыродны газ, асабісты кацёл, лічыльнік вады і газу, тэлефон; 3 соткі агарода, 20 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8 029 855 16 35.

■ «Шкода-Фаварыт», 1992 г.в., у добрым стане, у Слуцку.
Тэл. 8 029 625 33 61.

■ «Форд-Эскорт», 1997 г.в., 1,8 ТД, цёмна-сіні ўніверсал.
Тэл. 761 87 25, 656 78 06.

■ Касілка трактарная навясная, касілка конная сумяшчальная з трактарам.
Тэл. 8 029 881 50 16.

■ Газавая пліта «Брэст» б/к, выдатны стан, дапамагу з дастаўкай, г. Клецк.
Тэл. 8 029 936 28 09.

■ Колы, памер 220 — 2 шт., два тармазныя дыскі з цыліндрамі ў зборы новыя, танна.
Тэл. 8 01633 4 53 59.

■ «Фіят-Брава», 1999 г.в., 1,4 б, сярэбраны металік.
Тэл. 8 029 360 28 85, 8 029 769 68 75.

■ ВАЗ-21013, 1984 г.в., бэжавы, тэхагляд, страхоўка.
Тэл. 8 029 769 68 75, 8 029 638 93 41.

■ Ружжо ІЖ 43М у выдатным стане, электратэльфер груз. 0,5 тоны.
Тэл. 871 93 59.

■ Часопісы «Фізічная культура ў школе» на рускай мове за 1974—1990 гады, танна.
Тэл. 8 01597 93 352.

■ Мікрааўтобус «Івеко дэйлі», 1991 г.в., 2,5Д, 15 месцаў, белы, магчыма па безнаяўным разліку, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 01597 71 697, 617 16 97, 285 02 59.

■ Індыкі на забой ці на развод.
Тэл. 8 01717 46 026.

■ Металічны гараж памерам 5,3 х 3,2, пераазны, электрычны наждачны станок 380 В.
Тэл. 8 01716 42 160.

■ Задні мост б/к да трактара Т-16, 350 у.а.
Тэл. 8 01512 70 355.

■ Пральная машына-аўтамат «Вятка», выдатны стан, танна.
Тэл. 266 46 95.

■ Шафа дзвюхстворкавая, стол рассоўны, сервант для посуду.
Тэл. 8 029 601 56 74.

■ Свіння вагой 150 кг, 5 тыс. рублёў за 1 кг.
Тэл. 8 029 378 41 55, 8 01718 42 445.

■ Трактар МТЗ-82.
Тэл. 8 01717 47 412, 8 029 753 47 72.

■ «Волга» ГАЗ 3110, 1999 г.в., колер белы.
Тэл. 8 017 248 90 60.

■ Пачатае будаўніцтва 2-кватэрнага дома з майстэрняй (11 км ад Брэста, газ, вадаём, лес), патрэбен кампаньён.
Тэл. 8 029 801 69 81, 8 029 601 69 81.

КУПЛЮ

■ МТЗ-80 ці -82 у рабочым стане, магчыма без дакументаў.
Тэл. 565 05 32, 864 44 12.

■ Дом.
Тэл. 8 029 778 33 38.

■ Памяшканне пад магазін, офіс, вытворчасць, склад.
Тэл. 8 029 682 14 42.

■ Навясное пагрузачнае абсталяванне «КУН» на МТЗ.
Тэл. 8 01770 54 095.

■ Трактар, можна без уліку, і грузавы дызельны аўтамабіль з дакументамі.
Тэл. 8 029 936 28 09.

■ Дом на хутары (каб быў лес, возера), не далей як 70 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 357 64 51.

■ Матаблок у любым стане ці міні-трактар.
Тэл. 8 029 183 44 70.

■ «Аўдзі» ці «Фольксваген», з 1988 па 1999 г.в., можна з дэфектамі, для сябе.
Тэл. 8 029 771 51 78.

■ Трактар Т-25 з дакументамі.
Тэл. 8 01717 47 412, 8 029 753 47 72.

■ Куплю дом, частку дома, дачу ці пакой да 6 тыс. у.а., да 60 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 743 32 07.

РОЗНАЕ

■ Мяняю 4-пакаёвую кватэру ў Шчучыне на Гродна або прадам (2 паверх, лоджыя, падвал, гараж, грады).
Тэл. 8 01514 29 546.

У суд Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутным без вестак **ЧКАНАВА Андрэя Аляксеевіча**, 1972 года нараджэння, ураджэнца г. Казань Расійскай Федэрацыі, які пражываў па вул. Чыгуначнай, д. 3 г.п. Бобр Крупскага раёна Мінскай вобласці.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна Чканава А.А., паведаміць іх суду Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

ЁН ХАБАР НЕ БЯРЭ

За спробу дачы хабару ваеннаслужачаму Гомельскага пагранічнага атрада затрыманы грамадзянін Беларусі. Прапануючы грашовую ўзнагароду, злыміснік спрабаваў даведацца пра расстаноўку пагранічных нарадаў на зялёнай мяжы і тактыку іх дзеяння з мэтай бесперашкоднага незаконнага вывазу каляровых і чорных металаў у Расію.

Кар. БЕЛТА.

Валянціна́й

НЕ ПРА ШАПКУ, АБО ДАЎГІ НАШЫ ЦЯЖКІЯ

…Гэта ўжо рэфлекс — як у сабакі Паўлава — з пачаткам халадоў успамінаць адно і тое ж: ранічка, субота, дзверы ў наш інтэрнацкі пакой ціха адчыняюцца і на парозе… З'яўляецца не, не Лорык з суседняга, а… шапка — пілотачкай… З бліскучай блакітнай норкі… Мяккая, цёплая, бязважка лёгкая, нават… чароўная, бо варта было хоць крыху пацешыцца — патрымаць яе ў руках, а потым асцярожна ўздзець на макаўку, — і з люстэрка, на цябе ж, адразу, пачыналі глядзець зусім іншыя вочы… Твае і, як быццам, не твае, а нейкай іншай асобы — загадкава-мілай, пяшчотнай, а ўжо разумнай…

Варта было шапку зняць — чараўніцтва ў міг вока знікала.

Дужыя (чытай — мужчыны) змірыцца з гэтым, відаць, маглі б — ім, у большасці, «па барабану», як яны выглядаюць. А вось нам — не. Мы слабыя (на гэты конт). Таму даведаўшыся, дзе (канкрэтна) і за колькі цуд такі прадаецца, дружна «захварэлі»: хто з большай, хто з меншай упартасцю сталі збіраць-эканоміць грошы, сталі прапытваць блату, бо без яго тады (мусіць, помніце?) у магазінах туалетнай паперы не было. Што ўжо казаць пра шапку?!

Такім чынам яна — цёплая, з бліскучай блакітнай норкі — для ўсіх, хто памераў, стала проста блакітнай марай. І нязбытнай. Бо адкуль у дзяўчат з пэтэвэшнага інтэрната той блат, адкуль тыя баксы?

Не ведаю, як у іншых (лёс парасхадаў нас), у мяне патрэбная сума (упартасць — гэта, на шчасце ці на жаль, не маё) з'явілася гадоў праз дзесяць, якраз увосень і загадзя стала сграваць: пасля Казанскай (4 лістапада) мы нават планавалі паехаць на стадыён (ён жа рынак), паглядзець, што там прадаецца і нешта купіць (зразумела ж, не блакітнае, бо яно «запрасіла» б і новых ботаў, сумкі, паліто), — проста цёплае. А калі пашанцуе — яшчэ і чароўнае. Гэта значыць, каб апрануў і ў люстэрку ўбачыў сябе, калі ўжо не той разумнай, цікавай асобай, то хоць бы не дуркаватай...

Але… не пашанцавала (як тады, прынамсі, здавалася): перад самай Казанскай аб'явілася хоць шапачна, але ж знаёмая, ледзь не плачучы, пачала распавядаць, як яны з мужам, нарэшце, знайшлі больш-менш прыстойную кватэру, пераехалі і як добра жылі. Пакуль гаспадыні не надурыла ўльтыматум паставіць. Маўляў, альбо плаціце за паўгода наперад, альбо... Плаціць у іх не было чым. «Мо пазычыш? Ну, колькі зможаш, — слёзна прасіла знаёмая. — Сілаў няма зноў пераязджаць! Зразумей нас…».

Што заставалася рабіць?..

Хіба (аддаючы тыя грошы) абмовіцца, што я іх на шапку збірала. «Дык яшчэ ж не зіма! — упэўнена заявіла пазычальніца. — Праз месяц мы аддадзім. Далібожачкі!»

Што вы думаеце? Аддалі — праз месяц і… шэсць гадоў, за якія я неяк прывыкла хадзіць без шапкі.

Пахваразўшы, праўда.

І думаеце, зрабіўшы, хоць нейкія высновы? Не: перахапіць грошай да авансу і да зарплаты рэгулярна забягала былая суседка, лічы, пастаянна з чацвёртага паверха падымаўся аўдавелы дзед, які ніяк не мог навучыцца да атрымання новай, «расцягваць» пенсію, часцяком зазіраў знаёмы (мякка скажам) п'яніца, які амаль ніколі не прасіў больш, чым на бутэльку, былі выпадкі — звярталіся родныя і сябры...

Зрэшты, як і я да іх! Бо справа ж звыклая жыццёвая, як казаў Карлсан. І размова тут зусім не пра тое, хто колькі ў каго пазычыў, а як аддаваў. Прынамсі, дзед з чацвёртага паверха — гэта, як закон, — сустракаў ля пад'езда ў дзень атрымання пенсіі; суседка — стары доўг амаль заўсёды плюсавала да новага, а калі не магла яго аддаць, «сыходзіла ў глыбокае падполле» і сядзела там ціха-ціха; п'яніца — наадварот — віняўся, заходзіў-званіў, пытаўся ці пачакаю? І грошы-такі вяртаў. Праўда: па частках... Разы ў тры меней… А потым і наогул хвастом накрыўся. І каб толькі ён… У дачыненні да мяне…

Блізкаму сваяку (стрыечнаму брату) сяброўка досыць вялікую суму пазычыла. Той сабе машыну купіў, частку грошай уклаў у бізнэс, падняўся, як зараз кажуць...

Доўг, сястры, вярнуў толькі праз суд (добра, што распіска была).

Вясковец знаёмы на платным сына ўзяўся вучыць і не разлічыў. На апошнія тры семестры (паўтара года) грошай не хапіла. «Бацька, ну не кідаць жа? — прасіўся студэнт. — Пазыч у каго. Хай пад працэнты… Я ж зарабляць добра буду, удваіх раз-два аддадзім…).

Перш чым пайсці зарабляць, ён ажаніўся. І сказаў: «Бацька, прабач...»

У банку ўжо незнаёмы (і ці адзін?) пазыку ўзяў — пяць тысяч. У так званых, умоўных адзінках. За два гады — не вярнуў ні капейкі. Казаў, што грошай няма. Адбыўся суд, які...

Як і трэба было чакаць, вынес рашэнне па дзве з паловаю тысячы (доларау!) спаганяць з... паручыцеляў.

Знайшліся крайнія. У гэтым выпадку. У многіх (падобных) даўгі, як кажуць, павіслі, бо без работы, без крыніцы даходаў засталіся і самі паручыцелі...

Казка з нагоды. Ад прадзедаў. Двое сялян на паляванне пайшлі. Дзядок ім насустрач. «Бронь божа, — просіць, — хлопчыкі, не йдзіце па гэтай сцежцы: там такая змяюка ляжыць… Загінеце!». «Добра, дзякуй вам», — кажуць хлопцы і нават спачатку збочваюць (трэба ж слухаць старэйшых!). А празмерная пыха назад піхае: мы, маўляў, дужыя, маладыя ды са зброяй яшчэ... І нейкай там змяюкі баяцца будзем? Мы што ёй рады не дамо?!

Вярнуліся назад на тую сцежку, з кіламетр прайшлі, бачаць... грошы рассыпаны. Ды столькі, што і ім, і дзецям, і ўнукам, і нават праўнукам да смерці хопіць. Узрадаваліся мужыкі, рукі паціраюць. Кажуць: во, маўляў, дзед які? Хацеў абдурыць, хацеў ад скарбу адвесці... Добра, што яны не промахі: не паслухалі яго».

Вось толькі, што з грашыма рабіць? За раз дамоў не занясеш іх, — вазамі трэба вазіць. «Я тут са стрэльбай пасяджу, багацце наша папільную, — кажа адзін, — а ты ў вёску зганяй, каня запражы. А заадно — перакусіць мне вазьмі. І глядзі ж — нікому ні слова…

Як сказана, так і зроблена. Прыбег шчасліўчык дамоў, перш-наперш пра ўсё жонцы расказаў, загадаў, каб ахоўніку праснак нейкі спякла, а сам на падворак — каня запрагаць, скрыню на воз усцягваць.

Адно — пакуль вазіўся — думаў, як добра было б, каб грошы тыя вы ўсе сабе, каб не дзяліць ні з кім...

Акурат пра гэта ж (бог сем пар лапцяў стаптаў пакуль разам сабраў) і жонка яго падумала. Больш за тое — у праснак... атруты насыпала.

Пахваліў яе муж — яшчэ шчаслівейшы па багацце паехаў.

Вось толькі даехаць не паспеў, бо ахоўніка ж таксама жаба душыла, ён таксама думаў, што б гэта зрабіць, каб скарбам не дзяліцца? А здроя ў руках... Пачакаў, карацей, пакуль сяброк на кані прыблізіцца, і стрэліў. Потым — сляды замёў, скарб сабраў, сеў на воз, песню зацягнуў і, зразумела, праснак і з'еў на радасцях. З усімі адсюль наступствамі…

Гэта ўжо рэфлекс, як у сабакі Паўлава — кожны год з наступленнем халадоў успамінаць адно і тое ж. Не, зусім не для таго, каб пашкадаваць блакітнай, няспраўджанай мары... Каб аднойчы пайсці далей, падумаць: а як жа склалася жыццё тых, хто хоцькі-няхоцькі хітрыў, выгадваў, хто так ці іначай хацеў «падняцца», «пад'ехаць», разбагацець, на горы чужым сваё шчасце паставіць?

Не ведаю, як вы (калі хочаце, «перабярыце» сваіх...). Я — амаль нічога добрага не ўбачыла: п'яніца, як і трэба было чакаць, стаў алкаголікам; суседка па-ранейшаму жыве ў даўгах; той стрыечны брат, які судзіўся з сяброўкай, на той самай машыне разбіўся (самога яшчэ, так бы мовіць, дактары злажылі, але такі ён жонцы не патрэбен быў — на развод падала); у «студэнта» — хворае дзіця нарадзілася...

Што мо цікава, не на кані і тая шапачная знаёмая, што прывычыла хадзіць з голай галавой. Сутыкнуліся мы летась, у лютым. «Ой, колькі летаў і зім?! — зацягнула яна спачатку, потым, адразу, — а чаму ты без шапкі?». Давялося нагадаць (знянацку ж іншага не прыдумаеш)… «Пазычальніца» спачатку сумелася, пачырванела, а потым чамусці прызналася, што падманула тады — ніхто ніякага ўльтыматуму ім не ставіў. Ёй проста боты дасталі — з пераплатай, мадэльныя, імпартныя. А вось панасіць іх яна так і не змагла — нагу ў костачцы зламала, усю зімачку ў гіпсе прабыла, а калі «вылезла» з яго на абцасы болей не стала. У выніку боты (прадаць шкада было) так і зваляліся.

...Доўг — паводле тлумачальнага слоўніка — тое ж, што і абавязак; тое, што пазычана (пераважна грошы)...

Бярэш іх (людзі трапна кажуць!) чужыя і зусім ненадоўга. Аддаваць павінен (раз вінен) свае і назаўжды. Але ж іншага выйсця няма.

Калі ёсць сумленне.

Валянціна ДОЎНАР.

У МІНСКІХ «ДАІШНІКАЎ» НОВЫ КІРАЎНІК

Начальнікам упраўлення сталічнай Дзяржаўтаінспекцыі прызначаны Дзмітрый Карзюк. Да гэтага падпалкоўнік Карзюк узначальваў аддзел ДАІ Партызанскага раёна Мінска. Яго папярэднік Васіль Бульбянкоў, які кіраваў сталічнымі «даішнікамі» з 2004 года, сышоў на пенсію ў сувязі з дасягненнем адпаведнага ўзросту.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

«ПАГОДА Ў ДОМЕ»-4

Працягваем чацвёрты класіфікацыйны конкурс на прызы калектыву Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (кіраўнік Канстанцін Міхайлавіч БАРЭЛЬ) — з нормай першага спартыўнага разраду па шашках.

Будуць адзначаны пераможцы конкурсу, яго суддзя і каардынатар, а таксама лепшая рашальніца. А каб стаць першакласным рашальнікам альбо пацвердзіць гэтае высокае званне, трэба быць вельмі пільным і не прапусціць, калі будуць у пазіцыях пабочныя развязкі або задумкі аўтара, якія пры моцнай гульні чорных не развязваюцца. Таму за ўказанне гэтых істотных недахопаў налічваюцца прэміяльныя балы. Некампазіцыйныя варыянты ў аўтарскім рашэнні і падманлівыя сляды не прыводзяцца. Норма ж другога разраду — выканаць усе 12 заданняў, кожнае з якіх ацэньваецца ў адно очко.

А цяпер падаём **пятае заданне** (аўтар Віктар Шульга, Мінск):



a b c d e f g h

БЕЛЫЯ: a5, e7, f4, g5, дамкі a7, c5, e1, h2 (8). ЧОРНЫЯ: b8, дамка a1 (2). Заперці простую чорных.

Удзельнікі нашых папярэдніх конкурсаў могуць пачаць з гэтага задання. Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а. Рубрыка «Шашкі».

ЦІ АДБЫЎСЯ ПЕРАНОС?

У якасці бліцконкурсу-16 мы прапанавалі эцюд гросмайстра Леаніда Вітошкіна (Гомель):



БЕЛЫЯ: 10, дамка 50 (2). ЧОРНЫЯ: 26, 32, 36 (3). Выйгрыш.

Як звярнуў увагу Іван Астроўскі (Мінск), яго эквівалентам на 64 палях будзе наступная эндшпільная канструкцыя:

«БЕЛЫЯ: g7, дамка h2 (2). ЧОРНЫЯ: a3, a5, d4 (3). «Рашэнне аналагічнае», — піша І. Астроўскі. Але ці адбыўся кампазіцыйны перанос ідэі Л. Вітошкіна з вялікай дошкі на маленькую? Чакаем вашых меркаванняў.

Простыя рэчы

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Добра павандраваўшы ляскімі сцяжынамі, гушчарамі, пералескамі, выходзіш раптам да старога чыгуначнага палатна. Здаецца, нічога асаблівага, простая рэч: утравелы ўжо дзе-нідзе насып, драўляныя, хоць і прасмаленыя, але ўсё ж кранутыя гніеннем шпалы, дзве ніткі рэек. І ўсё-такі гэта вялікая прыкмета цывілізацыі. У лесе ты сустракаў адзнакі чалавечай прысутнасці, але не такія выяўныя — там пляма нейкая, там... А тут яна, гэта прысутнасць, важкая, тут чалавек прыклаў рукі. Калі ж яшчэ загудзе здаля і няспешна, але няўхільна прагрыміць па пуцях цеплавоз з паўтузінам вагонаў...

Міжволі падумаеш: як успрымаўся прыход чыгункі ў глухія мясціны нашымі дзядамі і прадзедамі? Чыгунку пабачылі яны ўпершыню. Гэта потым былі і аўтамабілі, і самалёты. Яны ж яе і будавалі, перавозячы на сваіх коніках патрэбнае. З лёгкай рукі (не, не зусім для нас лёгкай) рускага паэта Някрасава надоўга ўсталяваўся ў свядомасці многіх вобраз беларуса — будаўніка чыгунак:

Видишь, стоит, изможден
лихорадкою,
Высокорослый больной белорус:
.....

Далей і цытаваць не хочацца. Паэт, вядома ж, шкадуючы, не паскупіўся на змрочныя вобразы і эпітэты, апісваючы нашага земляка з XIX стагоддзя. Перастараўся. Не такімі ўжо і забітымі, спрэс хворымі былі беларускія мужчыны таго часу. Так працавалі яны на ўзвядзенні чыгунак, цяжка. Але ж зарабляці капейку. Каб падправіць сваю гаспадарку, а то і зямліцы прыкупіць. І дарогі будавалі, і ў гарады на заробкі падаваліся, а ў XX стагоддзі нават за акіянам шукалі любую працу, каб толькі жыць было лепш. Але сваёй годнасці, свайго чалавечага адчування незалежнасці не гублялі.

Дарэчы, як падае наш вядомы навуковец Аркадзь Смоліч, на пачатку XX стагоддзя (праз сорак гадоў пасля пачатку іх будаўніцтва ў нашым краі) Беларусь мела 7 тысяч вёрстаў чыгунак, і па шчыльнасці іх пераўзыходзіла іншыя раёны Расійскай імперыі. Праўда, прызнаем, што многія з іх насілі мілітарны характар.

Але аспрэчваць тое, што чыгункі мелі ў развіцці эканомікі Беларусі прагрэсіўную ролю, проста немагчыма. На скрыжаваннях гэтых транспартных сістэм узнікалі і бурна развіваліся новыя беларускія гарады. Прынамсі, дзядзька з Колаcавай «Новай зямлі» дабіраўся ў Вільню:

А праз кароткую хвіліну
Антось садзіўся на машыну.
На паравозе без білета
Чхаў да Баранавіч дасвета.

Так, «зайцом», але ж дабіраўся хутка, за суткі — не пехам ці на коніку. А самі Баранавічы з невядомага паселішча ператварыліся ў буйны горад дзякуючы найперш чыгункам.

Крыху пазней Максім Танк у Заходняй Беларусі (1938 год) пісаў:

На захад ідуць цягнікі —
Лён,
Жыта,
Сасна і бяроза...
Гляджу і гляджу з-пад рукі,
Як наша юнацтва вывозяць.

Вобразна? Так. Але ці зусім дакладна? Гэта быў экспарт сыравіны, на жаль, толькі сыравіны, бо свая перапрацоўчая прамысловасць у тагачаснай Заходняй Беларусі толькі нараджалася. Але ж калі было што і па якіх шляхах вывозіць — гэта па тым часе не так і дрэнна. Наш лён (у перапрацаваным выглядзе), наша драўніна (дзякаваць Богу, ужо часцей таксама ў перапрацаваным выглядзе) і сёння вывозяцца. З зернем сітуацыя крыху інакшая, цвёрдыя гатункі пшаніцы мы завозім.

Маё роднае мястэчка Паставы ў свой час атрымала штуршок для развіцця менавіта дзякуючы таму, што праз яго пралягла чыгунка Полацк — Вільня. Шмат дзесяцігоддзяў гэта быў даволі ажыўлены шлях. Не магістральны, зразумела, але для людзей вельмі патрэбны. З Браслаўшчыны, Нарачанскага краю людзі менавіта адсюль, па чыгункі маглі патрапіць «у свет», у любы пункт былога СССР і за яго межы. Дарэчы, у 70-я — 80-я гады мінулага стагоддзя ў Паставах і наваколлі хадзіў анекдот: што такое — доўгі, зялёны і каўбасой патыхае? Адказ: цягнік з Вільні на Віцебск. Так, у суседняй Літве і каўбаса, і іншыя мясныя вырабы былі танныя і іх хапала нават прыезджым з Беларусі пакупнікам. Сёння па гэтай чы

Добрыя людзі

Брат і бензазапраўка

На бензазапраўцы мне заўсёды хочацца закурыць. Толькі заеду на запраўку, адразу рука цягнецца да цыгарэтнага пачка. А выеду з бензакалонкі, і курыць зусім не хочацца. А на запраўцы хочацца дастаць запальнічку «Зіпа» і прыпаліць цыгарэту, і набраць поўныя грудзі тытунёвага дыму. Што за жаданне такое? Сягоння заехаў з братам на запраўку і пытаюся: «Слухай, а табе закурыць хочацца?» — «Хочацца, — кажа брат, — на бензазапраўцы мне заўсёды хочацца закурыць...» Ён так сказаў, і стала мне лягчэй.

Гамэр і жаночыя шчыкалаткі

У Гамэра шмат загадак і таямніцаў. Чаму паэт называў прывабных жанчын прыгожашчыкалаткавыя? Сам я на такое пытанне адказ не знайшоў. Але, калі пачуў сварку паміж жанчынаю і дзяўчынаю, мне згадаўся старажытны грэк... Раніцай жанчына паставіла на стол перад дачкою талерку з грэцкай кашай, добра запраўленай маслам. Такая ж талерка ўжо стаяла і каля мяне. Каша была смачная, і я еў з апетытам. Дзяўчына не ела і злосна глядзела на сняданак. «Ты чаго не ясі?» — маці падсунула талерку бліжэй да дачкі. Тая ўскочыла з крэсла і закрычала: «Не буду я есці тваю кашу! Я не хачу, каб у мяне былі такія ж тоўстыя шчыкалаткі, як і ў цябе. Божа, няўжо ў мяне будуць такія тоўстыя ногі і такія сальныя шчыкалаткі, як у маці? Божа, я ніколі не буду есці кашу з маслам...» Дзяўчына выбегла з варэльні. Я даеў кашу і падзякаваў гаспадыні за сняданак. Дзяўчыне за разгадку адной з таямніцаў Гамэра я дзякаваць не стаў.

Валя і сала



На вуліцы сустрэў знаёмую паэтку Валю. Як не сустрэну Валянціну, дык яна абавязкова ідзе з прадуктовай крамы і нясе вялікі цяжкі пакет. Калі ў мяне ёсць пяць хвілін, я бяру пакет і падношу да яе двара. У паэткі дома поўна хлопцаў, яны любяць паесці, а Валя любіць іх карміць. Гэтым разам у пакеце быў вялікі кавалак сала, такі руковы з залацістай скуркаю. І мне захацелася таго сала, а гаварыць пра паэзію я не змог, бо ў галаве круцілася толькі адна думка: «Прыйду дадому і з'ем сала з часнаком!» Прыйшоў, а ніякага сала ў лядоўні няма. «Чаму ты падумаў, што ў нашай лядоўні ёсць свіное сала?» — спыталa жонка. «Таму, што яно проста мусіць тамака быць!»

Эсміральда і роля

Роля звычайнага чалавека такая ж цяжкая, як і роля абранніка лёсу. Асабліва цяжка яна даецца тым, хто ўжо выконваў ролю абранніка. Мая знаёмая (назаву яе Эсміральда Верас) некалі спявала ў вядомым вакальна-інструментальным ансамблю. Згадкі пра той ансамблік даўно сцёрліся ў памяці слухачоў і гледачоў, але Эсміральда ніяк не хоча тое відавочнае прызнаваць. Яна апранаецца ў страката-сцэнічныя строі. Яна зазірае ў вочы невядомых людзей, спадзеючыся пабачыць пазнаванне. І дзіва! Яна чужое здзіўленне прымае за пазнаванне сябе. Яна падманвае і падманваецца. Яна выглядае вар'яткаю вартай спачування... Здавалася б, я мушу прапанаваць Эсміральдзе Верас ролю простага чалавека, але не прапаную, бо не веру, што Эсміральда зможа яе выканаць.

Кірыл і спявачка

Інжынер Кірыл вырашыў параіцца: «Мяне запрасілі на свята песні ў Нясвіжскі замак. Запрасіла каханка, бо яна там будзе прэзентаваць новую песню. А мне хочацца паехаць туды з жонкаю. Уяўляеш, я буду сядзець з жонкаю ў замку, а мая каханка спявацьме. Як табе расклад?» — «Не падабаецца. Па-першае, ты не ведаеш, колькі каханкаў тваёй каханкі будзе сядзець побач з тваёй жонкаю. Па-другое, наколькі я ведаю тваю спявачку, ёй ніколі асабліва не падабаліся мужчыны. Падарункі і грошы падабаліся, а любіла яна жанчын». — «Што ты кажаш? Можа мне яе кінуць?» — «Каго? Жонку?» — «Ды не! Спявачку!» — «Кінь. І з'ездзі з жонкаю ў Мірскі замак на рыцарскі турнір...»

Сакрат і спакой

З дзяцінства я люблю скульптурную галаву Сакрата. Мяне заўсёды радаваў спакойны выраз на твары гэтага барадатага і бульбаносага мужчыны. Цяпер, прачытаўшы выказванне Ксанціпы, што яе муж ніколі не губляў душэўны спакой і не аддаваў сябе ва ўладу маркоты і страхаў, я зразумеў: менавіта душэўны спакой я любіў і люблю ў Сакраце.

Гандлярка і загадка

У стракатым вакзальным натоўпе цяжка вылучыцца. Ёй гэтую задачу ўдаецца вырашыць бліскуча. Як? Яна мае цэлы букет запамінальных рысаў. Каляровыя спалучэнні ў вопратцы настолькі вырвівочныя, што міжволі спынішся і рот раскрыеш. Атрутна-блакітныя пантофлі, хімічна-малінавыя нагавіцы і залаціста-гнойная кашуля відаць здалёк, а зблізу ты пабачыш вядзьмакаватыя вочы. Ад такіх вачэй, дзе зрэнкі памерам з масліну, мужчыны пачынаюць абмацваць прарэх, а жанчыны ашчэрваюцца, як цяжарныя коткі. Гэта вакзальнае дзіва гандлюе кветкамі. Хто толькі не гандлюе на вакзале кветкамі, і якімі толькі кветкамі на вакзале не гандлююць, але ў яе заўсёды самы вялікі і самы найлепшы букет. Я табе кажу. У яе ў руцэ букет букетаў. Адкуль? Загадка. І вось сягоння вакзальная гандлярка ехала са мною ў метро. Вагон быў поўны, але ніхто побач з малінавымі нагавіцамі не апусціў сваю дупу. Ад гандляркі яшчэ і смярдзела салодкім вінцом. Бррпр! Выйшла яна на маім прыпынку — Пляц Перамогі. Выйшла і, пахіставучыся, паплялася ў бок крамы з сабачым харчаваннем. Няўжо ў крамцы з каціным прысмакамі прадаюць наркату? Так я падумаў. Памыліўся. Гандлярка пасунулася да Вечнага агню, да помніка невядомаму салдату. Яна пайшла забіраць букет букетаў. Так! Мяркую, невядомы салдат, каб мог, дык сам бы прывёз букет букетаў на вакзал і падарыў гандлярцы, але ён не можа. Карацей, я разгадаў загадку букета букетаў, і стала мне ад гэтай разгадкі млосна.

Тамара і тэфтэлі

Сны бываюць вельмі розныя, прынамсі, у мяне. Жахі са слязкімі змяюкамі, містыка з пакурочанымі рэлігійнымі сімваламі, нябожчыкі з непрыстойнымі прапановамі... Неагатыкі з неарамантыкаю ў маіх снах процьма. Але ж бываюць і зусім іншыя сны. Днямі я так стаміўся, што не змог павячэраць. Прыйшоў дамоў, наклаў у талерку тэфтэлі, прыгатаваныя домработніцай Тамарай, а есці расхацелася. Паставіў я талерку ў лядоўню ды завалiўся спаць. Усю ноч мне сніліся бліскучыя тэфтэлі з маркоўнай поліўкаю і грэцкай кашай, запраўленай маслам. Раніцай я звычайна аўсянку ем, але гэтым разам снедаў тэфтэлямі з грэчкаю, і так мне было смачна, што я нават Тамару пахваліў.

Адам ГЛОБУС.

Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» аб'яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад:
— кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: загадчык кафедры;
— кафедра псіхалогіі і педагогікі: загадчык кафедры;
— кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: загадчык кафедры, дацэнт;
— кафедра харэаграфіі: загадчык кафедры, выкладчык.
(Пры падачы заяў на замяшчэнне пасад загадчыкаў кафедраў наяўнасць вучонай ступені і вучонага звання абавязковая.)
— кафедра філасофіі: прафесар;
— кафедра замежных моў: старшы выкладчык;
— кафедра народна-інструментальнай творчасці: дацэнт;
— кафедра духавой музыкі: старшы выкладчык (2);
— кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: дацэнт (2).
УНН 100286677

Таленты і прыхільнікі

ДАЦЯГНУЦЦА ДА ЗОРКІ АБО «ДАСТАЦЬ» ЯЕ?

Аляксандру Аверкаву прызнаюцца ў каханні, а Люсі Лушчык пагражаюць «валасы павырываць»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Фанаты Алены Грышанавай на тэлепраекце «Зорны цырк».

Неўзабаве пасля Новага года стала вядома, што адзін з папулярных артыстаў — заўжды адкрыты для кантактаў чалавек — раптам змяніў нумар мабільнага і зараз «шыфруецца». Як патлумачыла яго прэс-сакратар, адбылося гэта з-за таго, што фанаты жыцця не давалі.

Падумаеш, скажаце, радавая падзея — змяніўся нумар тэлефона. Я таксама так лічыла, пакуль не наткнулася на адным з рэсурсаў у Інтэрнэце на гарачыя спрэчкі на гэту тэму. Адны сцвярджалі: калі чалавек запатрабаваны, рана ці позна праявіцца другі бок медаля народнай любові, і меры перасцярогі не лішнія. Другія пярэчылі: вы што, у нашай краіне — якая народная любоў, якая слава, хто гэты чалавек, каб яго рвалі на шматкі; вось убачыце, гэта толькі піяр-ход.

Стала надзвычай цікава: ці беларускім медыя-персонам проста няма чаго рабіць, і яны раздзімаюць вакол сябе штучныя скандалы, ці сапраўды ім ёсць чаго асцерагацца? Гэта і паспрабавала высветліць «Звязда». Будзеце здзіўляцца, але гісторый пра ўмяшанне прыхільнікаў у асабістую прастору назбіралася вельмі многа, прычым самых розных — ад камічных да дэтэктыўных...

І не звані мне больш!

Калі сотавая сувязь толькі прыйшла ў Беларусь, быў такі перыяд: людзі выбіралі сабе простыя, лёгка запамінальныя нумары, якія, скажам, супадалі з датай нараджэння альбо адрозніваліся ад нумара хатняга тэлефона ўсяго на адну лічбу. Так у свой час зрабіла і спявачка **Улада** — але хутка пашкадавала, бо на нумар пачалі тэлефанаваць невядомыя аматары памаўчаць у трубку... «Цяпер я мяняю нумар мабільнага тэлефона з перыядычнасцю раз у паўгода-год, — расказала спявачка. — Бо на яго ўсё адно рана ці позна пачынаюць тэлефанаваць дзіўныя людзі. У асноўным гэта званкі прымітыўныя: рагочуць, прычым чутна, што там цэлая кампанія, або заяўляюць «хочам з вамі пазнаёміцца» і г.д. Натуральна, калі такія званкі гучаць дзесяць разоў за гадзіну, непрыемна». Зрэшты, з-за такіх «грамадскіх актывістаў» здаралася ва Улады і большая непрыемнасць: аднойчы нехта ўзламаў яе афіцыйны сайт, дакладней, сістэму адміністравання, і напісаў усякіх гадасцяў, прычым у адрас... іншай спявачкі, Вольгі Плотнікавай. З-за гэтага кіраўніцтва двух парталаў ледзьве не пасварылася. Аматараў сваёй творчасці я трымаю на пэўнай дыстанцыі — кантактую праз форум, электронную пошту або фан-клуб, — тлумачыць Улада. — Ёсць афіцыйны фан-клуб, яго курыруе дастаткова дарослая і адказная дзяўчына, якая здолела накіраваць энергію прыхільнікаў, у асноўным падлеткаў, у пазітыўнае рэчышча».

А вось у замежных краінах, дзе Улада любіць адпачываць, а часам і выступаць, сітуацыя зусім іншая. «Безумоўна, усходнія мужчыны па максімуму аказваюць кожнай дзяўчыне знакі ўвагі, гаворыць столькі кампліментаў, што адчуваеш сябе самай-самай, — смяецца спявачка. — Але асабіста я ніколі не сустракалася там з грубасцю ці зняважлівасцю. На тэрыторыі гатэляў у Егіпце, напрыклад, увогуле баяцца на цябе нават коса паглядзець, бо трымаюцца за сваё працоўнае месца, там з гэтым строга».

Зрэшты, нават міграцыя ў цёплыя краіны не заўсёды дазваляе пабыць інкогніта. Неяк давялося назіраць, як палову гурта **«Тяни-Толкай»** на пляжах Судака не тое каб праследавалі, але актыўна пазнавалі прыхільнікі-землякі: «Ой, гэта праўда вы? А можна з вамі сфатаграфавацца? А чаму вы тут канцэртаў не дасце?».

У **Вольгі Плотнікавай** таксама з тэлефонам стасункі асаблівыя. Пару гадоў таму на здымках у тэлепраграме «Кропка» (нешта кшталту «музычнага рынгу», калі па выніках галасавання вызначаецца, рана ці позна праявіцца другі бок медаля народнай любові, і меры перасцярогі не лішнія. Другія пярэчылі: вы што, у нашай краіне — якая народная любоў, якая слава, хто гэты чалавек, каб яго рвалі на шматкі; вось убачыце, гэта толькі піяр-ход.

Стала надзвычай цікава: ці беларускім медыя-персонам проста няма чаго рабіць, і яны раздзімаюць вакол сябе штучныя скандалы, ці сапраўды ім ёсць чаго асцерагацца? Гэта і паспрабавала высветліць «Звязда». Будзеце здзіўляцца, але гісторый пра ўмяшанне прыхільнікаў у асабістую прастору назбіралася вельмі многа, прычым самых розных — ад камічных да дэтэктыўных...

І не звані мне больш!

Калі сотавая сувязь толькі прыйшла ў Беларусь, быў такі перыяд: людзі выбіралі сабе простыя, лёгка запамінальныя нумары, якія, скажам, супадалі з датай нараджэння альбо адрозніваліся ад нумара хатняга тэлефона ўсяго на адну лічбу. Так у свой час зрабіла і спявачка **Улада** — але хутка пашкадавала, бо на нумар пачалі тэлефанаваць невядомыя аматары памаўчаць у трубку... «Цяпер я мяняю нумар мабільнага тэлефона з перыядычнасцю раз у паўгода-год, — расказала спявачка. — Бо на яго ўсё адно рана ці позна пачынаюць тэлефанаваць дзіўныя людзі. У асноўным гэта званкі прымітыўныя: рагочуць, прычым чутна, што там цэлая кампанія, або заяўляюць «хочам з вамі пазнаёміцца» і г.д. Натуральна, калі такія званкі гучаць дзесяць разоў за гадзіну, непрыемна». Зрэшты, з-за такіх «грамадскіх актывістаў» здаралася ва Улады і большая непрыемнасць: аднойчы нехта ўзламаў яе афіцыйны сайт, дакладней, сістэму адміністравання, і напісаў усякіх гадасцяў, прычым у адрас... іншай спявачкі, Вольгі Плотнікавай. З-за гэтага кіраўніцтва двух парталаў ледзьве не пасварылася. Аматараў сваёй творчасці я трымаю на пэўнай дыстанцыі — кантактую праз форум, электронную пошту або фан-клуб, — тлумачыць Улада. — Ёсць афіцыйны фан-клуб, яго курыруе дастаткова дарослая і адказная дзяўчына, якая здолела накіраваць энергію прыхільнікаў, у асноўным падлеткаў, у пазітыўнае рэчышча».

А вось у замежных краінах, дзе Улада любіць адпачываць, а часам і выступаць, сітуацыя зусім іншая. «Безумоўна, усходнія мужчыны па максімуму аказваюць кожнай дзяўчыне знакі ўвагі, гаворыць столькі кампліментаў, што адчуваеш сябе самай-самай, — смяецца спявачка. — Але асабіста я ніколі не сустракалася там з грубасцю ці зняважлівасцю. На тэрыторыі гатэляў у Егіпце, напрыклад, увогуле баяцца на цябе нават коса паглядзець, бо трымаюцца за сваё працоўнае месца, там з гэтым строга».

Рэўнасць і зайздрасць

Здавалася б, **ВІА «Харлі»** выклікае ў слухачоў толькі станоўчыя эмоцыі — і на канцэртах у іх заўжды цёплая, амаль хатняя атмасфера, і фан-клуб не толькі масавы, але яшчэ гатовы дапамагаць любімым артыстам. Але ж вось і «Харлі» неяк дасталася невядома ад каго і за што. Летась калектыў даваў вялікі канцэрт «Каханне — імя тваё», да якога загадзя па горадзе былі расклеены афішы. Менавіта яны загадкавым чынам пачалі знікаць з афішных тумбаў, прычым нават супрацоўнікі канцэртных залаў былі ў недаўменні, што гэта: падлеткі забаўляюцца або нейкія нядобразычліўцы стараюцца нашкодзіць... «Мы былі ў разгубленасці, — прызнаецца лідар калектыву Яўген Чалышаў. — Наўрад ці людзі зрывалі афішы, каб павесіць іх у сябе дома. З іншага боку, мы не рабілі ўчынкаў, якія маглі б выклікаць нейкую непрыязнасць або агрэсію ў дачыненні да гурта... Так мы і не даведаліся, навошта і хто гэта рабіў. Вандалізм, дый толькі».

А вось ад спявачкі Міланы нядобразычліўцы не хаваліся, наадварот, зрабілі ўсё, каб сустрэцца нос да носу. Дзяўчына ўдзельнічае зараз у тэлепраекце-конкурсе «Хэло, Юрмала!» — своеасаблівым прыбалтыйскім аналагу «Фабрыкі зорак». Не тое каб яна разлічвала ўсіх сапернікаў «парваць» і застацца адзіным героем, аднак некаторым гледачам нават проста паспяховыя выступленні Міланы і рост яе рэйтынгу не спадабаліся. Падчас чарговага канцэрта, незадоўга да выхаду на сцэну, да дзяўчыны падышоў адзін з гледачоў і выдаў літаральна наступнае: «Я не дам табе перамагчы — гэта я абяцаю!» Выступіла спявачка ўсё адно ўдала, але потым трапіла ў цяжкую дэпрэсію, і з гэтым настроем ледзьве справілася.

Зрэшты, гэта яшчэ кветачкі ў параўнанні з гісторыяй спявачкі Уляюм. У пазамінулым годзе яна рэгулярна атрымлівала лісты з пагрозамі: «Калі хочаш жыць, пакінь сцэну і беларускую эстраду, інакш на тваім шляху будзе сур'ёзная небяспека». Пасля першага ж ліста Уляюм звярнулася ў міліцыю. Потым, калі яшчэ адзін ліст прыйшоў ужо на хатні адрас, візіт паўтарыла, і нават назвала мяркуемых аўтараў — свайго былога маладога чалавека і яго новую дзяўчыну, якая ўзяла моду пагражаць спявачцы па тэлефоне. Як быццам сітуацыя выправілася — і Улялюм працягвае выступаць, і невядомыя супакоіліся.

Гэтаксама з рэўнасці адна дзяўчына пракляла час пасвала жыццё тэнісістцы, тэлевядучай і спявачцы Вользе Барабаншчыкавай. «Яна гаварыла пра мяне розныя брыдоты, зневажала, тэлефанавала дадому з пагрозамі, — не вельмі ахвотна ўзгадвае Вольга. — Толькі пасля таго, як мы з маладым чалавекам рассталіся, гэта дзяўчына пакінула мяне ў спакоі».

Тэлевядучую **Люсю Лушчык** рэгулярна «дастаюць» не ў меру раўнівыя жонкі (усё ім здаецца, што Люся пачкамі зводзіць мужчын «налева»). Як правіла, пагражаюць чыста па-жаночы — сустрэць у цёмным кутку дзе-небудзь і «валасы павырываць», або на працы скандал забяспечыць — але ўсё гэта нічым не завяршаецца, акрамя зага-рэлых нерваў. Толькі аднойчы Люся сапраўды спалохалася за сваё жыццё — калі на яе машыне невядомыя акуратна, не пакінуўшы слядоў, крыху прыадкруцілі шрубы на колах. На вялікай хуткасці спроба выканаць любы манеўр, нават просты паварот, магла б прывесці да сумных вынікаў... Але якраз у той дзень за руль сеў іншы чалавек, аўтааматар са стажам, які западозрыў няладнае і хутка знайшоў прычыну.

Але найбольш сумная гісторыя талентаў і прыхільнікаў тычыцца, відаць, **Зміцера Вайцюшкевіча** — з яго жаніцьбы на фанатцы пачаўся фактычны развал легенды беларускай музыкі, гурта «Крыві».

Я вас кахаю... дайце грошай

Прыхільнік **Ларысы Грыбалёвай**, які пісаў ёй лісты яшчэ з часоў працы ў Маскве ў тэлепраграме «Ранішняя пошта», аказаўся настойлівым і верным куміру на працягу некалькіх гадоў. Нават калі Ларыса вярнулася ў Мінск і працавала на БТ, з дапамогай Інтэрнэта дасылаў лісты, вершы і фота, але гэтага падалося мала, і мужчына прыехаў у Мінск, знайшоў тэлефон Грыбалёвай. А калі на просьбы аб сустрэчы яна адказала адмоўна, не знайшоў нічога лепшага, як... пераканаць суседзяў тэлевядучай, што яна — яго жонка, якая збегла разам з дзіцем. Калі сітуацыя канчаткова перайшла ў «асаду» пад'езду, Ларыса спалохалася і на некалькі тыдняў з'ехала да сяброў на дачу, дзе і перачакала, пакуль прыхільніку не надакучыла трэніраваць яе і ён вярнуўся ў Маскву.

Калі жанчынам-тэлевядучым да прызнанняў у каханні не прывыкаць, то мужчыны часта губляюцца — як рэагаваць, калі любоўныя пасланні, вы яшчэ надзвычай адкрытыя і настойлівыя, цябе літаральна праследуюць?.. Лісты з прызнаннямі ў каханні пастаянна атрымлівалі тэлевядучыя АНТ **Ягор Хрусталёў** і **Аляксандр Аверкаў.** Лісты не звычайныя — заказныя, распісаныя кветачкамі, і прыбываюць яны кожны тыдзень, прычым напісаныя... адной і той жа дзяўчынай. Што ўнутры? Уласныя вершы — даволі нясціплага зместу, і правакацыйная прапанова: «Калі вы сапраўдны мачо, вы мне абавязкова патэлефануеце».

А вось абаяльнай **Іне Афанасьевай** падчас вядзення рэаліці-шоў «Тры халасцякі» чамусьці адрасаваліся лісты... з просьбай выслаць грошы. Практычна як у вёску дзядулі. Маўляў, дарагая Іна, мы вельмі любім вашу творчасць, вы такая пасяховая і добрая, што не адмовіце нам у дапамозе — набыць камп'ютар, веласіпед і г.д. І адрас не забываліся прыкладваць, куды трэба тыя грошы выслаць.

Часта просяць «падтрымаць матэрыяльна» і ў вядучых тэлевізійных латарэй, але гэта, відаць, больш у жарт, чым сапраўды ў разліку на «халяву».

Ёсць людзі як людзі...

Натуральна, негатыўных момантаў, звязаных з умяшаннем фанатаў у асабістую прастору, хапае ў жыцці кожнага больш-менш папулярнага артыста. Але значна больш усё-ткі прыемных эмоцый. Напрыклад, таму ж Георгію Калдуну, празмерна занятаму адразу ў некалькіх праектах, фан-клуб гэтай зімой арганізаваў дзень нараджэння, што ўжо само па себе стала цудоўным падарункам. «Нават дзіўна называць прыхільнікаў, тых, хто цікавіцца маёй творчасцю, фан-клубам — з большасцю дзяўчат я проста вельмі добра кантактую, у Інтэрнэце, па тэлефоне ці на сустрэчах, — дзеліцца спявак. — А яны ў сваю чаргу не перастаюць прыемна здзіўляць. Аднойчы, напрыклад, быў зусім без настрою — вяртаюся дадому, а пад дзвярыма ляжыць набор маленькіх шакаладак з пажаданнямі ўсяго лепшага.

Надзвычай адданая суполка прыхільнікаў склалася ў Мінску ў спявачкі Анжэлікі Агурбаш. Старшыня фан-клуба «Анжэліка» Сяргей Андрыянаў не толькі наладжвае ў кожны прыезд Анжэлікі сустрэчу з прыхільнікамі, але і сябруе з іншымі фан-клубамі, ініцыюе онлайн-канферэнцыі, на якіх спявачка дзеліцца навінамі і планамі. Фан-клуб таксама адзначыўся «маршам пратэсту» на цырымоніі раздачы музычных узнагарод RMA MTV у Мінску, куды Анжэліку арганізатары не запрасілі. І хоць сама спявачка сцвярджала, што для яе гэтая цырымонія не была такой ужо важнай падзеяй, але падтрымку ацаніла.

Самыя адданыя і заўжды гатовыя дапамагчы прыхільнікі — у гурта «beZ bileta». Менавіта дзякуючы ім на свет з'явіўся цікавы відэакліп «Месца для цябе», цалкам складзены з фатаздымкаў саміх музыкантаў і ўсіх, хто лічыць сябе сябрам калектыву. Зараз гэту стратэгію ўзялі на ўзбраенне і іншыя артысты, у якіх паняцце «прыхільнік» значыць усё ж «сябар», а не «фанат». І расказваць пра гэтыя стасункі можна бясконца доўга, прыгадаўшы і вышываную кашулю, падараную ўдзячнымі слухачамі Ірыне Дарафеевай, і фатаакцыю «Добрыя людзі», прыдуманую фан-клубам гурта «Харлі», і прыемны сюрпрыз ад прыхільніка на дзень нараджэння Паліне Смолавай... Але гэта ўжо — як кажуць, зусім іншая гісторыя. А дадзеная — пра тое, што папулярная асоба, артыст гэта, спартсмен або тэлевядучы — гэткі ж звычайны чалавек, як мы з вамі, які можа стаміцца, хацець спаць, быць занятым, захварэць або проста не мець настрою ні з кім размаўляць. І гэта права варта паважаць, каб не трапіць у «чорны спіс» фанатаў, з якімі ніхто не хоча мець справу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

P.S. *Аўтар выказвае шчырую ўдзячнасць за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу прэс-службам артыстаў і тэлеканалаў.*

А як «у іх»?

Зрэшты, паглядзіш за межы нашай сінявокай і думаеш: напэўна, добра, што наш шоў-бізнэс такі «местачковы» — затое няма ў ім бясконцых судовых спраў, калі фанаты прад'яўляюць артыстам «іхніх» дзяцей (і паспрабуй яшчэ даказаць, што «не быў, не ўдзельнічаў, не прыцягваўся»), целаахоўнікі «зорак» не збіваюць на горкі яблык фатографаў-папарацы, а самі «папарацы» не пераходзяць мяжу элементарнай прыстойнасці.

Вось толькі некалькі яскравых прыкладаў стасункаў «фанат—публічная персона», да якіх мы пакуль што не дараслі:

- у Філіпа Кіркорава падчас гастроляў фанатка выкрала мабільны тэлефон і дарагі гадзіннік. Жанчыну знайшлі, далі тры гады турмы;
- спявачка Святлана Свецікава, папрасіўшы звычайнага як быццам чалавека не падвезці, нарвалася на сапраўднага маньяка, ад якога ледзьве здолела ў паўапранутым выглядзе збегчы на парку;
- акцёру і рэжысёру Мелу Гібсану, які і без таго пахісnуў сваю рэпутацыю злоўжываннем алкаголем, прыпісваюць пазашлюбную дачку. Пацвердзіць, мае рацыю 30-гадовая аўстралійка ці кінамільянер, можа толькі аналіз ДНК, а скандал — ужо ёсць. Крыху раней, дарэчы, Гібсана «даставаў» прыхільнік, які хацеў, каб акцёр памаліўся разам з ім, і дзеля гэтага пісаў, тэлефанаваў і прыходзіў у дом;
- гэтаксама ў свой час праследавалі Валерыя Лявонцьева — маладая жанчына сцвярджала, што з'яўляецца маці яго дзіцяці, і нават калі спявак даказаў, што не можа быць татам яе малога, не супакоілася, пакуль на дапамогу не прыйшла міліцыя;
- актрысе Уме Турман раз'юшаны фанат, прабіраючыся на здымачную пляцоўку і начуючы пад вокнамі дома, пагражаў скончыць жыццё самагубствам у яе перад вачыма, калі толькі ўбачыць яе з іншым мужчынам;
- канадскай спявачцы Аўрыл Лавін прыхільнік не толькі адпраўляў лісты з пагрозамі — ён нават ухітрыўся пранікнуць у дом і скрасці некаторыя рэчы, якія былі знойдзены потым паліцэйскімі. Самае дзіўнае, што на злачынства мужчыну падштурхнула... уласная жонка, каб пазбавіцца ад навязлівага захаплення спявачкай;
- актрыса Кэтрын Зета-Джонс атрымала ліст з пагрозамі: «Мы парэжам цябе, як кавалак мяса, і скормім сабаку». Потым такіх лістоў прыйшлі яшчэ дзесяткі. Як высветлілася, іх аўтар — жанчына, якая была шалёна закаханая ў мужа актрысы. За такія «жартачкі» зламысніца атрымала тры гады турмы.

Рубрыку вядзе Мікола ДЗЯБЁЛА.

Аўтаінфарм
ПРАВЫ НА СКУТЭРЫ
Міністэрства ўнутраных спраў унесла шэраг прапаноў аб змяненні правілаў эксплуатацыі скутэраў.
Паводле слоў кіраўніка МУС Уладзіміра Навумава, для кіравання памянёным транспартным сродкам неўзабаве абавязкова трэба будзе мець пасведчанне катэгорыі «А». Да таго ж, кіроўцы і пасажыры павінны будуць ездзіць у адмысловых шлемах.

Аўтадарогі
ВУЛІЦЫ САЛІЦЬ НЕ БУДУЦЬ
Неўзабаве камунальныя службы нашай краіны плануюць адмовіцца ад выкарыстання салявых сумесяў для барацьбы з галалёдам.
Як паведаміў падчас прэс-канферэнцыі начальнік аддзела Мінжылкамунгаса Міхаіл Коласаў, замест шкодных для здароўя людзей і машын пясчана-салявых сумесяў будуць прымяняцца процігалалёдныя сродкі, створаныя на аснове тэхнічнага калію.

Аўтапаліва
САЛОМА ДЛЯ «ЖАЛЕЗНЫХ КОНЕЙ»
Галандскія вучоныя вынайшлі тэхналогію вытворчасці аўтамабільнага паліва з саломы. Праўда, для таго, каб з саломы атрымаўся этанол, неабходны яшчэ бактэрыі цукру. Тым не менш спецыялісты падлічылі, што такая вытворчасць даволі эканамічная. З пяці тон саломы можна атрымаць столькі паліва, што яго хопіць для аднаго аўтамабіля на цэлы год.

Аўтапрам
«ХАРЧАВАЦЦА» АД БЫТАВОЙ РАЗЕТКІ
Японская карпарацыя «Toyota» плануе ўжо ў 2010 годзе запусціць у продаж новы аўтамабіль з бензінава-электрычным рухавіком.
Адметнасць гэтага гібрыда ў тым, што падзарадзіць акумулятарныя батарэі можна будзе ад звычайнай бытавой разеткі. Дарэчы, на электрычнай сіле такога аўто можна будзе праехаць амаль 30 км. Потым давядзецца альбо пераключацца на бензін, альбо шукаць разетку.

Аўтаадказчык
ЗНАК БЯСПЕКІ
Ці абавязкова наклейваць на заднім шкле машыны знак «Шыпы»?
Вольга ГАРАНІНА, *г. Маладзечна*
Калі ваш аўтамабіль «абуты» ў шыны з шыпамі, то адмысловы знак абавязкова трэба прыладзіць на заднім шкле. Як паведамілі ва ўпраўленні Дзяржаўтаінспекцыі МУС краіны, за адсутнасць памянёнага знака прадугледжаны нават штраф да 2 базавых велічынь. Аднак інспектары ДАІ ў выпадку выяўлення падобных парушэнняў звычайна абмяжоўваюцца вуснымі заўвагамі. Тым не менш, гэта не азначае, што можна і не вывешваць знак «Шыпы». Бо ён выконвае вельмі важную інфармацыйную функцыю. Кіроўцы, якія едуць следам за машынай з шыпаванымі шынамі, загадзя ведаюць, што тармазны шлях у іх «папяровіка» значна карацейшы і выбіраюць адпаведную дыстанцыю. Варта нагадаць, што на пакрытай галалёдам дарозе, тармазны шлях «шыпаванага аўто», якое рухаецца з хуткасцю 60 км/г складае прыкладна 50 м, а машына без шыпоў спыніцца толькі праз 100 м. А вось на сухім асфальце, наадварот, тармазны шлях аўтамабіля з шыпамі павялічваецца на 10 працэнтаў.

Аўтакур'ёз
І ВІНОЎНІК, І АХВЯРА
У Мінску кіроўца транспартнага сродку затрымаў п'янага пешахода, які стаў адначасова і вінаўнікам, і ахвярай дарожна-транспартнага здарэння.
Паводле звестак прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама, ДТЗ адбылося на праспекце газеты «Звязда». Нецвярозы мужчына спрабаваў перайсці праспект у забароненым месцы і трапіў пад колы аўтамабіля «Opel». Парушальнік сур'ёзна не пацярпеў. Адразу ж пасля сутыкнення з машынай кінуўся на ўцёк. Але яго затрымаў вадзіцель «Opel» і выклікаў міліцыю. Пешаходу пагражае штраф у памеры да 3 базавых велічынь.

Усміхнёмся!

Добры праграміст характарызуецца ўменнем даказаць, што задачу выканаць немагчыма, калі ён проста лянуецца яе выконваць. ☺

Муж схаваўся за газетай ад жонкі і робіць выгляд, што чытае. Жонка:
— Я ведаю, што ты мяне чуеш — у цябе каленкі дрыжаць. ☺

Да банкамата падыходзіць жанчына з пяцігадовым хлопчыкам. Мама:
— Зараз грошыкі возьмем і пойдзем у магазін.
Устаўляе картку ў банкамат, забірае грошы. Хлопчык ціха пытаецца:
— А там што, тата сядзіць? ☺

Святы закончыліся адчуваннем шчасця, што яны закончыліся... ☺

Дзяўчына тэлефануе сяброўцы:
— Вой, Светка, такая галалёдзіца страшэнная! Я сем разоў падала, мяне шэсць разоў падымалі маладыя людзі!
— А чаму толькі шэсць?!
— Апошні раз пакуль не паспелі. Ляжу, чакаю. ☺

Калі выходзіш замуж за выдатнага чалавека, зусім не важна, якога колеру ў яго "Бентлі".

caricatura.ru

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.19	16.19	8.00
Віцебск —	8.15	16.02	7.47
Магілёў —	8.10	16.09	7.59
Гомель —	7.59	16.11	8.12
Гродна —	8.33	16.35	8.02
Брэст —	8.26	16.43	8.17

Месяц
Маладзік.

Імяніны
Пр. *Малахіі, Гардзея;*
К. *Валерыі, Ганараты, Бярнада, Уладзіміра, Вальдэмара.*

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА	